WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 124
(26732)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДКРЭСЛІВАЕ НЕАБХОДНАСЦЬ ПОШУКУ АЛЬТЭРНАТЫЎНЫХ МАРШРУТАЎ ПАСТАВАК ЭНЕРГАНОСЬБІТАЎ У БЕЛАРУСЬ

Беларусь не збіраецца весці эканамічную вайну з Расіяй. Аб гэтым учора на нарадзе па найбольш актуальных пытаннях дыверсіфікацыі знешнеэканамічнай дзейнасці Беларусі, а таксама супрацоўніцтву з Венесуэлай, Расіяй і Украінай заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Ніхто не павінен зыходзіць з таго, што мы павінны пачаць якую-небудзь эканамічную вайну з Расіяй. Гэта наш даўні партнёр. Мы размаўляем на адной мове, у нас адзін менталітэт, мы адзін народ», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Калі сёння расійскае кіраўніцтва заняло такую пазіцыю, напэўна, у іх ёсць падставы для гэтага, і мы крытыкуем іх за гэта, але павінны ўвайсці і ў іх становішча, — так, як яны павінны ўвайсці ў наша становішча, калі мы будзем шукаць альтэрнатыву прыроднаму газу, нафце, — пытанням, па якіх нас спрабуюць вельмі моцна нахіліць». «Таму ніякай вайны. Гэта нашы традыцыйныя рынкі, мы купляем і будзем купляць адтуль энерганосьбіты. Ніхто нам Расію ў гэтым плане на 100 працэнтаў не заменіць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што паступова краіна павінна нарошчваць аб'ём паставак энерганосьбітаў і па іншых маршрутах. «Мы павінны ісці гэтым шляхам, таксама прапрацоўваючы пытанні паставак сюды (у Беларусь) таннага прыроднага газу і іншых энерганосьбітаў. Таму ставіць пытанне так, што гэта на злосць Расіі, супраць Расіі, — будзе неразумна, бесталкова і ўвогуле не будзе зразумела і прымальна для нашага грамадства».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці пошуку альтэрнатыўных маршрутаў паставак энерганосьбітаў у краіну. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу прысутных на тое, як у апошнія месяцы і гады развіваецца сітуацыя вакол Беларусі, перш за ўсё ў эканамічнай і гандлёва-эканамічнай сферах. «Ды і ў палітычнай нямала пытанняў». «Вы бачыце, якую пазіцыю займае пры гэтым наш усходні сусед, ды і заходні сусед у асобе ЕС», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, натуральна і аб'ектыўна, што народу Беларусі, якая з'яўляецца параўнальна маладой дзяржавай на карце свету, «давядзецца даказваць сваім інтэлектам, розумам, не дай бог, сілай неабходнасць і магчымасць жыць на гэтай зямлі як нацыі, як народу».

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што Расія для Беларусі застанецца добрым суседам і сябрам. «Усё гэта пройдзе (канфлікты ў адносінах. — *Заўвага БЕЛТА)*. Але мы павінны зыходзіць з класічных нормаў існавання любой дзяржавы — альтэрнатыўнасці і дыверсіфікацыі адносінаў. Мы не можам залежаць ад адной дзяржавы, аднаго цэнтра паставак, энергарэсурсы гэта, сыравіна ці камплектуючыя. Мы павінны ляцець, як кажуць у Беларусі, «на двух крылах», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, што нельга лунаць у воблаках, а неабходна жорстка адстойваць інтарэсы рэспублікі.

«Ведаючы гэта, некалькі гадоў таму мы паспрабавалі знайсці альтэрнатыву вуглевадароднай сыравіне Расійскай Федэрацыі і выйшлі на лацінскія рынкі (Лацінскай Амерыкі. — *Заўвага БЕЛТА*), у Афрыку, Іран — туды, дзе вуглевадароднай сыравіны дастаткова. Мы пачалі здабываць нафту ў Венесуэле і ў Іране. Больш таго, мы прыйшлі да таго, што сёння пастаўляем ужо нафту з Венесуэлы і даволі паспяхова перапрацоўваем яе на нашых прадпрыемствах, — сказаў Прэзідэнт. — Сёння стаіць пытанне аб надзейных пастаўках нафты ў Беларусь з сусветных рынкаў і па розных маршрутах. Мы ні ў якім выпадку не павінны паўтарыць гэту памылку, якая была з Расіяй. І пастаўка з іншых рынкаў нафты па адным маршруце таксама небяспечная, як цяпер залежнасць ад адной дзяржавы па пастаўках вуглевадароднай сыравіны. Таму прапрацоўваецца некалькі напрамкаў як па нафце, так і па газу».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў час сустрэчы з прэм'ер-міністрам Літвы, якая адбылася ўчора, ён (літоўскі прэм'ер-міністр. — *Заўвага БЕЛТА*) яшчэ раз пацвердзіў, што «Газпрам» прадае газ значна даражэй за тую цану, якая цяпер складваецца ў Еўропе. «Зразумела, такі газ ніхто купляць у Еўропе не будзе, і цану «Газпраму» ўтрымаць будзе вельмі цяжка, але гэта іх праблемы, іх тавар. Мы, па вялікім рахунку, можам спрачацца, дамаўляцца або не дамаўляцца, але мы заўсёды павінны мець альтэрнатыву», — падкрэсліў беларускі лідар.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хацеў бы пачуць даклад аб тым, як рэалізуюцца дасягнутыя дамоўленасці, без традыцыйных адгаворак і спасылак на «аб'ектыўныя» абставіны. «Ці ўсё магчымае і немагчымае зроблена для адыходу ад энергетычнай моманазалежнасці?» — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПРАПАНУЕ ЛІТВЕ РЭАЛІЗАЦЫЮ СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ ПА ЎМАЦАВАННІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ДЗЯРЖАЎ

Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў учора на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Літвы Андрусам Кубілюсам, перадае БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што Беларусь і Літва могуць шмат зрабіць сёння, але калі будзе ўпушчаны час, то многага ўжо не навярстаць. «Каб умацаваць суверэнітэт і незалежнасць, моц нашых дзяржаў, неабходна неадкладна зрабіць шэраг захадаў па ўмацаванні гэтай незалежнасці». Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што разумее абавязацельствы Літвы перад 27 дзяржавамі Еўрапейскага Саюза, перад кожнай паасобку і ў цэлым перад ЕС. Тыя напрамкі супрацоўніцтва Беларусі і Літвы, якія ўжо існуюць і могуць быць вызначаны ў будучым, не ідуць уразрэз з патрабаваннямі і той палітыкай, якой прытрымліваецца Еўрасаюз і на што арыентавана Літоўская Рэспубліка. Паводле слоў Прэзідэнта, у дзвюх краін падобныя праблемы і напрамкі іх вырашэння. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок гатовы да вырашэння гэтых праблем. «У мяне ні на хвіліну не было сумненняў за час майго прэзідэнцтва, што ў нас могуць быць нейкія разыходжанні ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, ва ўздыме эканомікі», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што «не хацеў бы шукаць новых партнёраў, Літва — гэта блізкая суседняя дзяржава, і мы заўсёды зможам дамовіцца».

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю былога прэзідэнта Літвы Альгірдаса Бразаўскаса. «Мы добра ведалі яго ў Беларусі, супрацоўнічалі з ім. Гэта вялікі чалавек, які пакінуў значны след у гісторыі Літвы», — адзначыў беларускі лідар.

Прэм'ер-міністр Літвы лічыць, што ў дзвюх краін ёсць добрыя магчымасці супрацоўніцтва ў энергетыцы з мэтай умацавання незалежнасці дзяржаў. «Залежнасць ад аднаго пастаўшчыка якіх-небудзь рэсурсаў часам стварае праблемы. У гэтым плане ў нас ёсць добрыя магчымасці. Мы можам ісці такім шляхам умацавання незалежнасці, рэалізоўваць агульныя стратэгічныя праекты, у якіх быў бы зацікаўлены і Еўрапейскі Саюз», — сказаў ён. На яго думку, добрыя магчымасці ў гэтым плане дае «Усходняе партнёрства». Андрус Кубілюс лічыць, што Беларусь і Літва могуць значна рушыць наперад у двухбаковых адносінах.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю былога прэзідэнта Літвы Альгірдаса Бразаўскаса

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, ён высока ацаніў Альгірдаса Бразаўскаса як чалавека і выдатнага палітычнага дзеяча, які заўсёды выступаў за развіццё канструктыўнага добрасуседскага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Літвой.

Навагрудак на два дні ператварыўся ў сярэднявяковы горад. У райцэнтры прайшлі мерапрыемствы V фестывалю сярэднявяковай культуры «Навагрудскі замак-2010». Сёлета фестываль прымеркаваны да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы — адной з найбольш маштабных, грандыёзных і эпахальных бітваў сярэднявякоўя.

Фота БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АДКРЫЦЦЁ САМІТУ G20 СУСТРЭЛІ ПАГРОМАМІ

Групы антыглабалістаў учынілі беспарадкі ў цэнтры канадскага Таронта, дзе пачынаецца саміт «вялікай дваццаткі».

Распачатая мірна каля будынка заканадаўчага сходу правінцыі Антарыа дэманстрацыя перарасла ў беспарадкі, падчас якіх пратэстоўцы разбілі вітрыны некалькіх крамаў, уключаючы буйны гандлёвы цэнтр, а таксама падпалілі некалькі паліцэйскіх машын. Спецпадраздзяленні канадскай паліцыі былі вымушаныя прымяніць слёзатачывы газ. У раёне сутыкненняў сабралася каля дзесяці тысяч дэманстрантаў.

ЗАБОЙЦЫ ІНКАСАТАРАЎ ВЫКРАЛІ БОЛЬШ ЗА 130 МЛН

Невядомыя, якія расстралялі ў нядзелю ў Маскве трох чалавек у інкасатарскай машыне на Трэцім транспартным кольцы, выкралі ў іх больш за 130 мільёнаў расійскіх рублёў.

Рабунак у сталіцы стаў адным з найбуйнейшых за апошнія гады. Ужо вядома, што забойцы работнікаў небанкаўскай крэдытнай арганізацыі «Інкахран» выкралі ў іх службовы пісталет «Іж» з 16 патронамі. Як падкрэсліў кіраўнік следчага ўпраўлення СКП Расіі, забойцаў ахоўнікаў было не менш за два. Ужо дакладна зразумела, што забойцы знаходзіліся ўнутры інкасатарскай машыны. Застаецца невядомым, якім чынам у машыну патрапілі староннія людзі.

ІТАЛІЯ БУДЗЕ ПРАДАВАЦЬ СВАЕ ГАРАДЫ

У Італіі вырашылі прадаваць астравы, горы і буйныя ўчасткі ў гарадах прыватным асобам.

Тыя, хто захоча зрабіць такую ўнікальную пакупку, могуць азнаёміцца са спісам. Такі каталог тавараў быў складзены адмысловым агенцтвам па ацэнцы дзяржуласнасці. Цяпер мясцовыя адміністрацыі могуць падаць заяўку на той або іншы геаграфічны аб'ект, а затым выставіць яго на продаж або здаць у арэнду, напрыклад, кампаніям і прыватным асобам. Так, адна з сярэднявечных цэркваў невялікага італьянскага мястэчка Асці была прададзеная «Чырвонаму д'яблу». Пад гэтай назвай у горадзе функцыянуе культурнае аб'яднанне, якое ўжо зрабіла ў алтарнай частцы храма два бары. Акрамя таго, у былой царкве зараз праходзяць канцэрты, аўкцыёны і паказы мод. Сярод іншых незвычайных прапаноў — чыгуначныя станцыі, маякі, вінаграднікі і нават бойня ў горадзе Спалета. Ахвотнікі могуць таксама набыць ва ўласнасць сапраўды феадальны замак з вежамі, царквой, турмой і ляснымі ўгоддзямі. Абыдзецца ён у 13 мільёнаў еўра.



Фота БЕЛТА.

Рэспубліканскае спартыўнае свята да Дня Незалежнасці прайшло ў Мінску 26 чэрвеня на пляцоўцы каля Палаца спорту. Тут адбыліся міжнародныя спаборніцтвы па сілавым мнагаборстве на Кубак горада Мінска. У іх узялі ўдзел найдужэйшыя атлеты з Украіны, Расіі і Беларусі. На здымку: Пераможца спаборніцтва **Сяргей ВАЧЫНСКІ** (Мінск) падымае вагу 165 кг.

ЗАВАЛІМ ГРЭЧКАЙ УСЮ ЕЎРОПУ?

НАША краіна імпартуе больш за 50 працэнтаў грэцкіх крупаў. А на аднаго жыхара Беларусі ў год прыпадае па 2-2,5 кілаграма грэчкі. У Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання задумалі змяніць сітуацыю і вырашылі сёлета адпусціць пад грэчку 35 тысяч гектараў. З гэтай плошчы плануецца атрымаць 38 тысяч тон грэчкі. А гэтага будзе дастаткова, каб задаволіць патрэбнасць унутранага рынку.

Сёння грэчку можна набыць у любой краме, а за савецкім часам яе прадавалі найперш тым, у каго былі праблемы са здароўем. Тады грэцкія крупы былі дэфіцытам. А грэчку ў нас вырошчвалі яшчэ задоўга да бульбы — самай папулярнай у Беларусі сельгаскультуры, але вытворчасць грэчкі патрабуе свайго падыходу.

Гадоў 25 таму 10 сотак на сваім участку я адпусціў пад грэчку. На агародзе ўжо стаялі два пні пчолаў і я думаў, што грэчка, як выдатны меданос, будзе цвісці за некалькі метраў ад тых пчолаў. Планавалася мець двайную выгаду — сабраць грэчкі і дастаць мёду.

Спадзяваўся на небывалы ўраджай, бо грэчка вырасла на паўтара метра. Бывала, зойдзеш у пасеянае, то амаль да плячэй даставала. А затым наступіла расчараванне. Грэчка цвіце, а пчолы над ёй ляцяць кудысьці ўдалечыню — хоць бы адна апусцілася. Пазней мне спрактыкаваны пчаляр растлумачыў, што надвор'е не спрыяла — стаяла дужа сухое. Бывае, ліпа цвіце, а пчолы над ёй не шумяць. А што датычыцца грэчкі, то і кілаграма не намалаціў — адна пацяруха. І зноў жа пачуў ад старога чалавека, што грэчка не любіць тлустай глебы і не трэба, каб расліну гнала ў вышыню.

Так што ў Беларусі грэчку вырошчваць можна і адпаведнай зямлі для гэтага хапае.

Кіраўнік лабараторыі крупяных культур НПЦ НАН Беларусі па земляробстве Раман КАДЫРАЎ лічыць, што наша краіна не толькі здольная сябе забяспечыць грэчкай, але і можа пастаўляць яе на экспарт, бо ў нас створаныя ўмовы для вытворчасці грэчкі, ёсць гатункі і тэхналогія па вытворчай перапрацоўцы. Важна і тое, што на грэчку ў спажыўца ёсць пастаянны попыт.

Наконт грэчкі я пацікавіўся ў **Мікалая НАВІЦКАГА** з Ганцавічаў. Чалавек ужо на пенсіі, але ён усё жыццё аддаў сельскай гаспадарцы, а апошнія трыццаць гадоў адпрацаваў ва ўпраўленні райсельгасхарча.

— Калі падысці да справы з галавой, то грэчкай мы можам завалiць Еўропу. У свой час у нашым раёне па грэчцы спецыялізаваўся калгас «Светлы шлях». Помню, пасеялі там грэчку, а ўраджай мізэрны. А калі прыехаў прафесар Мухін, ужо забыў яго імя, і разабраўся ва ўсіх недахопах, то ў наступным годзе ўзялі ў гэтай жа гаспадарцы аж па 30 цэнтнераў з гектара, для гэтай культуры — надзвычай высокі ўраджай. А як правіла з гектара бяруць 10-12 цэнтнераў, і гэты факт не спрыяе вырошчванню грэчкі — яна не з'яўляецца валаўтваральнай культурай і многія гаспадаркі пад грэчку адпускаюць мінімальную колькасць гектараў. Калі шмат засеяць, то грэчка рэзка знізіць паказчыкі па збожжы. І неабходна падыходзіць выбарачна. Не на ўсіх землях грэчка расце, а калі ў нейкай гаспадарцы яна родзіць, то трэба засяваць не 5—10, а 100—150 гектараў. Грэчку сеюць позна, у канцы мая — пачатку чэрвеня, неабходна вытрымліваць аптымальныя для гэтага тэрміны ды і пажадана падбіраць найлепшыя гатункі. У мяне ёсць знаёмы фермер, дык ён свае 30 гектараў засеяў грэчкай і сабраў 30 тон. Сярэдні ўраджай, але не будзем забываць, што гэтая культура добра акупіцца зямлю. Так што я не сумняваюся, што з грэчкай у нас усё атрымаецца, але патрэбен гаспадарскі падыход, — выказаў сваю думку Мікалай Навіцкі.

Дадам: магчыма, не трэба грэчку ўключаць у справаздачу па збожжавых? Няхай яна ідзе асобным радком. Не будзем забываць, што грэчка — адна з самых эканамічна выгадных культур. Затраты нават пры ўраджайнасці 10 ц/га не перавышаюць 200 долараў на гектар.

Сёлета грэчку пасеялі ва ўсіх абласцях Беларусі. Пад гэтую культуру ў кожнай вобласці адпушчана прыкладна па 6-7 тысяч гектараў. Больш толькі ў Мінскай, а вось у Віцебскай найменш — у межах адной тысячы.

Калі паспрыяе надвор'е і не падкачаюць работнікі сельскай гаспадаркі, то краіна забяспечыць сябе грэчкай, а ў перспектыве, хто ведае... Але лепш пачакаем восені.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Прамая лінія»

САМААДЧУВАННЕ НЕ ВЫДАТНАЕ?

Не адкладвайце на заўтра вырашэнне праблем, звязаных са здароўем. Удакладняйце незразумелае, не займайцеся самалячэннем, калі да справы можна падысці прафесійна. А на дапамогу вам гатова прыйсці **дацэнт кафедры гераналогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў Пятроўна ВАРОНІНА.** Яна адкажа на любыя вашы пытанні **1 ліпеня, у чацвер, з 14.00 да 15.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.**

«Прамая лінія»

ШТО ЎВАХОДЗІЦЬ У ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ДОМА? ХТО ПАВІНЕН РАМАНТАВАЦЬ ДАХ? КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА, КАЛІ ЖЭУ НЕ РЭАГУЕ НА СКАРГІ?

На ўсе вашы пытанні па працы жыллёва-эксплуатацыйных упраўленняў нашай краіны адкажуць спецыялісты Міністэрства ЖКГ: **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд Іосіфавіч ГРЫШКЕВІЧ і начальнік упраўлення эканомікі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ.**

12 ліпеня з 16.00 да 17.30 задавайце пытанні па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 8 (017) 287 18 29. Пытанні можна пакінуць і загадзя па тэлефоне 8 (017) 287 18 64.

ВЫПУСКНЫ БАЛЬ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЗНАЧЭННЯ

Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў адбудзецца сёння ўвечары ў Палацы Рэспублікі. Запрашэнне на сустрэчу з кіраўніком дзяржавы атрымалі 270 лепшых выпускнікоў з усіх беларускіх ВНУ. 10 маладых людзей за выдатныя поспехі ў вучобе, прыкладныя паводзіны і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці сваёй навучальнай установы атрымаюць Падзяку з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

А раніцай рэгіянальныя дэлегацыі выпускнікоў і дэлегацыя выпускнікоў сталічных ВНУ наведаюць Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе сфатаграфуюцца побач з помнікам славутаму беларускаму асветніку Францыску Скарыне. Затым яны ўскладуць кветкі да манумента на плошчы Перамогі. У другой палове дня лепшых прадстаўнікоў вышэйшай школы ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства чакае сустрэча з міністрам адукацыі нашай краіны Аляксандрам Радзьковым. 28 выпускнікоў ВНУ будуць узнагароджаныя Граматамі Міністэрства адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕЦВЯРОЗЫ БАЦЬКА ПРЫСПАЎ СВАЁ НЕМАЎЛЯ

Пракуратура Дзяржынскага раёна праводзіць праверку трагічнага здарэння, якое напрыканцы мінулага тыдня адбылося ў вёсцы Воўка.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у гэтай вёсцы па месцы жыхарства 25-гадовага мужчыны адбылася бяда — загінула немаўля, яго сын, якому было крыху больш за месяц. Супрацоўнікі следча-аператыўнай групы ўстанавілі, што ў мінулую пятніцу нецвярозы бацька лёг спаць на канапу разам з сынам і па неасцярожнасці задушыў яго ўласнай вагой...

Ігар ГРЫШЫН.

ХАВАЎСЯ АД СЛЕДСТВА 11 ГАДОЎ

удзельнік злачыннай групоўкі, якая ў 1998 годзе ўчыніла крадзеж цыгарэт на суму больш за 1,5 мільярда рублёў з вагона грузавога цягніка.

Паводле звестак упраўлення ўнутраных спраў на транспарце, 35-гадовы ўраджэнец Брэста, «калегі» якога раней былі асуджаныя па гэтай справе, увесь гэты час хаваўся на тэрыторыі Украіны. Гэтаму падзвонаму разам з саўдзельнікамі, якім арганізатар групоўкі прапанаваў абакрасці таварняк, удалося ўчыніць задуманае злачынства. Двое са зламыснікаў апоўначы прабраліся на платформу поезда, і, калі састаў пачаў рухацца, ім удалося пранікнуць у адзін з вагонаў, які быў забіты каробкамі з імпартнымі цыгарэтамі. Апошнія яны і скідвалі ўздоўж чыгункі на шляху ад Брэста да Жабінкі, паспеўшы такім чынам разгрузіць вагон на 150 скрынь з тытунём. Пасля ўдзельнікі групоўкі сабралі цыгарэты і за два рэйсы вывезлі на мікрааўтобусах у адну з вёсак. Складзіравалі тавар у сваяка аднаго з падазроных, а рэалізоўвалі цыгарэты дробным гандлярам і індывідуальным прадпрымальнікам Брэста. Між іншым, праз апошніх і былі ўстаноўленыя асобы ўдзельнікаў групоўкі.

Ігар ГРЫШЫН.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» сообщает, что с 29 июня 2010 года устанавливаются следующие условия привлечения денежных средств по депозитам физических лиц в иностранной валюте:

По вновь заключаемым договорам срочного банковского депозита **«Баланс интересов»**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых), доллары США, евро		
	за 1-ый месяц	за 2-й – 10-й месяцы	за 11-й – 12-й месяцы
1 год	6,5	7,5	8

По вновь заключаемым договорам срочного банковского депозита **«Оптимальный»**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
6 месяцев	7	13

По вновь заключаемым и переоформляемым договорам срочного банковского депозита **«Динамичный»**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
1 год	7,5	12
3 года	7,75	13

По вновь заключаемым и автоматически продлеваемым договорам карт-счета **«Универсальный»**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых), доллары США, евро
1 год	7,5

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

В соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь № 22 от 04.11.2008, государство гарантирует полную сохранность денежных средств физических лиц в белорусских рублях и иностранной валюте, размещенных на счетах и (или) во вкладах (депозиты), и возмещение 100 процентов суммы этих средств в валюте счета либо вклада (депозита).

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- **148** (в стационарной сети);
- МТС (029) **5 148 148, 2 148 148**;
- Velcom (044) **77 00 148, 77 55 148**.

Проценты, выплаченные по депозитам в иностранной валюте в течение 2009 г. (млрд руб.): январь – 6,2; февраль – 6,2; март – 7,5; апрель – 7,0; май – 6,7; июнь – 7,6; июль – 7,5; август – 7,6; сентябрь – 7,5; октябрь – 7,5; ноябрь – 7,6; декабрь – 7,6.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Мінскі баксёр Аляксандр УСЦІНАЎ:

«Я СКАЗАЎ КЛІЧКО, ШТО ІМКНУСЯ СТАЦЬ АБСАЛЮТНЫМ ЧЭМПІЁНАМ СВЕТУ»

АТРЫМАЎШЫ 21-ю перамогу запар, наш супербаец агучыў перад журналістамі свае амбіцыйныя планы — замахнуўся на тытул Майка Тайсана і Мухамеда Алі. Адразу ж па прыездзе ў Мінск Аляксандр Усцінаў пацвердзіў свой намер у гутарцы з журналістам «Звязды».

У мінулую суботу 26 лютага Усцінаў абараніў свой тытул чэмпіёна Еўропы сярод прафесіяналаў у версіі ЕВА, упэўнена перамог спрактыкаванага італьянца Паола Відаца. Турнір з помпай правялі ў адэскім палацы спорту, у прамым эфіры двубой паказвалі па ўкраінскім тэлебачанні.

Відац — рэдкі баксёр, які набліжаўся да Усцінава па габарытах. Італьянец заважыў 120 кг, наш баксёр — 135 кг. І хоць у першых раўндах Аляксандр літаральна збіваў суперніка, той здолеў з гонарам пратрымацца да канца. Усё ж Паола Відац — прызёр

Тытул чэмпіёна Еўропы мінскі баксёр абараніў без праблем. Наступная мэта — пояс сусветнага чэмпіёна.

Алімпійскіх гульняў, неаднаразовы медаліст чэмпіянатаў свету і Еўропы. Сустракаўся з такімі знакамітасцямі, як, напрыклад, Мікалай Валуеў.

З усіх 12 раўндаў Відац змог вырваць толькі адзін — восьмы. Тым не менш, лёгкім двубой супраць італьянца не выглядаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.06.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	3 015,00	1 чэшская крона	144,90	USD	30,9833
▲1 еўра	3 725,33	1 польскі злоты	904,85	10 UAH	38,9335
1 латвійскі лат	5 260,86	▲1 расійскі рубель	97,31	1000 BYR	10,2662
1 літоўскі літ	1 079,70	1 украінская грыўня	378,86	EUR	38,3139

Агенцтва Уладзіміра Грай'цова

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ

КУПП «Виттекс» в г. Витебске по ул. Володарского, 100.

ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.

Информация на сайте: www.vitinvest.biz
Тел.: 431 498;
+375336480387 (МТС).

УНП 300149663

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

30 чэрвеня 2010 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.



НАРАЧАНШЧЫНА ВЫЙДЗЕ НА ЎЗРОВЕНЬ СУСВЕТНЫХ КУРОРТАЎ

Пры гэтым зонай адпачынку стане амаль увесь Мядзельскі раён

ЗНАЧНАЕ паляпшэнне інфраструктуры адпачынку і, як вынік, прыцягненне дадатковай колькасці турыстаў — такія мэты вызначае новая дзяржаўная праграма развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна. Чакаецца, што да 2015 года агульны аб'ём турпаслуг у найбольш папулярным месцы адпачынку ўзрасце ў 6,8-7 разоў, а іх экспарт павялічыцца ці не ўдвая. Пры гэтым адметна: змены павінны адбыцца перш-наперш дзякуючы сродкам айчынных і замежных інвестараў.

Попыт абганяе прапанову

Летась найбольш вядомы ў нашай краіне лагер «Зубраня» адзначыў сваё 40-годдзе. Між тым, узгадваць пра «ўзрост» тут можна даволі ўмоўна. За апошнія гады цяперашні нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр перажыў буйную рэканструкцыю — былі пракладзеныя новыя камунікацыі, адрамантаваныя сталовая і спальныя карпусы. А плюс да ўсяго дзякуючы аказанню платных паслуг «Зубраня» атрымала крыху нечаканую «візітоўку» — культурна-экскурсійны цэнтр старажытнай сялянскай побытавай культуры «Хутар Неслуч», дзе можна пакаштаваць спечаны па старажытных рэцэптах хлеб, пасядзець за гарбатай у кавярні, пажыць у пакоях, у якіх захаваны ўвесь каларыт пазамінулага стагоддзя.

Прычым рэканструкцыя працягнецца. Ужо цяпер тут вядзецца будаўніцтва дома дзіцячай творчасці са стадыёнам, а ў бліжэйшай перспектыве ёсць намер правесці рэканструкцыю медкорпуса і гульнявога павільёна, а таксама пашырыць агульную «ўмяшчальнасць». У дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры павінен з'явіцца яшчэ адзін спальны корпус. Такім чынам, «Зубраня» зможа прымаць дадаткова прыкладна 2 тысячы дзяцей у год.

— За апошні час колькасць дзяцей, якія адпачываюць у цэнтры, павялічылася, штогод да нас прыязджае 13 тысяч чалавек, і ў тым ліку едзе шмат іншаземцаў, — распавядае дырэктар «Зубраня» Надзея Ануфрыева. — І ўсё ж прапанова відавочна не адпавядае попыту, таму мы вымушаныя абмяжоўваць свабодны продаж пуцёвак. Па-іншаму нельга. Калі б не абмежаванні, усе месцы на лета маглі б выкупіць тыя ж расіяне: кошт у 1 млн 250 тыс. рублёў для іх невысокі.

Вельмі падобны малюнак і з адпачынкам дарослым. Праблема дэфіцыту пуцёвак у здраўніцы ўжо даўно вядомая, як не сакрэт і іншае — пытанні наконт узроўню сэрвісу. Праўда, наконт апошняга ўсё ж трэба заўважыць: пакрысе сітуацыя змяняецца. І змяняецца ў лепшы бок.

Адзін з прыкладаў — санаторый «Спадарожнік». Яшчэ ў пачатку дзесяцігоддзя здраўніца, што належала Маладзечанскаму радыёзаводу, пакрысе прыходзіла ў заняпад, і спыніць паступовае разбурэнне ўдалося толькі са зменай уласніка — ім стаў «Беларусбанк». І справа не абмежавалася заменай шыльды. «Беларусбанк» правёў рэканструкцыю будынка, уклаў грошы ў набыццё сучаснага медыцынскага абсталявання, пабудаваў басейн і водагразелячэбніцу, а ў планах — яшчэ адзін спальны корпус са SPA-цэнтрам. Прычым з улікам попыту. Пасля мадэрнізацыі запаўняльнасць «Спадрожніка» перавышае 90 працэнтаў, і, дарэчы, без прывязкі да «высокіх» і «нізкіх» сезонаў. Часцяком сюды едуць расіяне, літоўцы, палякі, украінцы, ізраільцяне, італьянцы, і само па сабе гэта пацвердзіла: нават пры адсутнасці мора зарабляць на экспарце турпаслуг Беларусь можа. Галоўнае — добры камфорт і свабодныя месцы.

«Крымскі» варыянт для Беларусі

Лічыцца, што Беларусь з'яўляецца добрым месцам для спакойнага, пасіўнага адпачынку. Міністр спорту і турызму Алег Качан з гэтым нязгодны і дадае: сярод турыстаў існуе значны попыт на басейны, веласіпедныя і пешаходныя маршруты. А даволі перспектыўнымі напрамкамі, якія трэба актыўна развіваць, з'яўляюцца парусны спорт, дайвінг, віндсёрфінг, кайтынг. Прычым усё гэта будзе цікава як для беларусаў, так і для іншаземцаў.

— Зразумела, што стварэнне прывабнай інфраструктуры — пытанне галоўнае, — адзначае Алег Качан. — І ў прыватнасці, неабходна вырашаць праблему з размяшчэннем. Адзін са шляхоў тут — выкарыстанне распаўсюджанай некалі ў Крыме практыкі рэалізацыі курсовак — скажам, чалавек можа набыць курс лячэння ў санаторыі, але пры гэтым спыніцца на адной з бліжэйшых аграсядзібаў. А варыянт другі — пашырэнне магутнасці нашых здраўніц. Прычым у гэтым выпадку нельга скідваць з рахункаў магчымасці таго ж Нарачанскага краю.

Інвестар атрымае льготы па падатках

Дзяржаўная праграма экалагічнага аздараўлення возера Нарач ужо прынесла свой вынік — значнае зніжэнне ўзроўню забруджвання навакольнага асяроддзя. Гэта стварыла ўмовы для развіцця турызму. Нібыта малюнак на Мядзельшчыне тут някепскі. Аднак таксама вядома: цяперашнія рэсурсы рэгіёна выкарыстоўваюцца далёка не цалкам, адчуваецца востры дэфіцыт забаўляльных аб'ектаў. Такім чынам, даводзіцца канстатаваць: канкурыраваць з папулярнымі замежнымі курортамі на роўных Нарачаншчына не можа. І выправіць сітуацыю мяркуецца менавіта ў рамках новай дзяржаўнай праграмы.

Праграма развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011—2015 гады прадугледжвае пашырэнне ўмяшчальнасці здраўніц і стварэнне новай сацыяльнай інфраструктуры — пунктаў грамадскага харчавання, крамаў, аб'ектаў бытавога абслугоўвання. Але не толькі. Ужо сёння выпадае казаць пра некалькі сапраўды цікавых праектаў, прычым не толькі ў наваколлі Нарачы. Па сутнасці вырашана: межы курортнай зоны «адыдуць» ад знакамітага возера на дзясяткі кіламетраў.

У прыватнасці, плануецца, што каля вёскі Іванкі і на возеры Кузьмічы з'явяцца базы адпачынку, у гарпасёлку Крывічы — элітны комплекс аграгурызму, на возеры Вялікія Швакшты — зноў жа база адпачынку і гасцявыя домікі, на возеры Воўчына — аздараўленчы комплекс, а на возеры Рудакова — цэнтр дайвінгу. Адначасова ёсць намер стварыць азёрна-рачны музей, культурна-забаўляльны комплекс, крыты лядовы каток, цэнтр водных забаў. І, дарэчы, усё гэта — ужо канкрэтныя праекты. Прычым іх пералік можа пашырыцца, бо ўвазе патэнцыяльных інвестараў прапануецца яшчэ некалькі перспектыўных пляцовак — як правіла, на берагах шматлікіх азёр.

Як паведаміў падчас выязнога пасяджэння Савета Міністраў намеснік прэм'ера Віктар Бура, агульны кошт праграмы ацэньваецца ў 420 млрд рублёў. Аднак з гэтай сумы на долю бюджэтных выдаткаў прыйдзецца толькі каля 180 мільярдаў.

— Галоўная стаўка робіцца на прыцягненне ўнутраных і замежных інвестараў, і для гэтага плануецца стварыць прывабныя ўмовы, — адзначыў Віктар Бура. — Так, для суб'ектаў гаспадарання, якія будуць тут працаваць, прапануецца ўвесці 5-гадовы мараторый на выплату падатку на прыбытак, падатку на нерухомасць і зямельнага падатку. Словам, з'явіцца добры стымул, і ў рэшце рэшт гэта павінна прынесці вынік.

Сяргей ГРЫБ. *Мядзельскі раён.*

Абзац

◢ У выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны прайшлі навальнічныя дажджы, часам моцныя ліўні. У Слуцку выпала 37 мм ападкаў (амаль палова месячнай нормы), удзень у пятніцу ў Лынтупах — 48 мм (55%), адзначаўся град дыяметрам 5 мм. Па звестках Белгідрамета, у самы цёплы дзень, 25 чэрвеня, паветра награвалася да +31°С у Віцебску і Клічаве.

◢ **У Беларусі сёння налічваецца больш за 3 млн механічных транспартных сродкаў. У асабістым карыстанні беларускіх грамадзян — 2,3 млн аўтамабіляў, на 4 жыхароў краіны прыпадае 1 аўтамабіль, а ў Мінску — адно аўто на 3 чалавекі.**

◢ У Быхаўскім раёне трохгадовая дзяўчынка атруцілася вадкасцю для апрацоўкі жывёлы ад насякомых. З дыягназам «востры атручэнне» яна шпіталізаваная ў Быхаўскую райбальніцу. Як патлумачыла маці, малая па неасцярожнасці знайшла дома прэпарат і пакаштавала яго. Вядзецца праверка.

Поўны абзац

◢ **У Луцку (Украіна) на аўтатрасе па праспекце Саборнасці мужчына ў цывільным добраахвотна працаваў рэгуліроўшчыкам — ён разварочваў аўтамабілі, якія масава спрабавалі праехаць «пад знак» проста ў рукі даішнікаў. Тут перад пешаходным пераходам нечакана ўстанавілі новы дарожны знак, які прадпісвае ехаць прама, забараняючы паварот налева. Аднак па звычцы вадзіцелі дружна паварочвалі, а праз пару хвілін іх спынялі інспектары ДАІ і штрафавалі. Менавіта для іх выратавання і працаваў добраахвотнік — адганяў вадзіцеляў, якія з ужо ўключаным паваротам гатовыя былі трапіць проста ў цёплыя рукі ДАІ. «Яны ўжо сотню машын спынілі, відаць, мільён зарабілі. Лічу гэта дзяржаўным рэкетам», — расказаў добраахвотны выратавальнік кішэняў вадзіцеляў.**



Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПАКРЫЎДЗІЎ РАСІЯН...

Пракуратура Лепельскага раёна завяла крымінальную справу ў дачыненні да дырэктара адкрытага акцыянернага прадпрыемства, які падазраецца ў тым, што скарыстаўся службовымі паўнамоцтвамі і скраў 1 мільён 396 тысяч расійскіх рублёў (каля 45 тысяч долараў) — плату расійскіх заказчыкаў за прадукцыю. Такім чынам ён незаконна абагаціўся ў перыяд з восені мінулага года па чэрвень бягучага.

Беларускае прадпрыемства з глыбінкі павінна было за гэтыя грошы паставіць адзенне, шыццём якога займалася. Крымінальную схему раскрылі супрацоўнікі міліцыі, якія займаюцца барацьбой з эканамічнымі злачынствамі, а таксама супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Віцебскай вобласці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПЕРАКАНАНЫ, ШТО ЗА ГАЗАВЫМ КАНФЛІКТАМ СТАЯЦЬ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРЫЧЫНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што за расійска-беларускім газавым канфліктам стаяць палітычныя прычыны. Аб гэтым ён заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу «Еўраньюс», паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

«$200 млн — гэта не тыя грошы, калі спрэчка павінна даходзіць вось да такога. Але, Вы ведаеце, апошнім часам выбудоўваўся пэўны ланцужок: Беларусь не прызнала незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, затым вы не ўступілі ў Мытны саюз, далі прытулак у сябе былому Прэзідэнту Кыргызстана. Гэта значыць рабілі ўсё не так, як хацела б Расія. Ці стаяць вось за гэтым газавым канфліктам палітычныя прычыны?» — задаў пытанне Аляксандру Лукашэнку карэспандэнт тэлеканала.

«На 100 працэнтаў упэўнены ў гэтым. Але хачу задаць Вам рытарычнае пытанне: а што, Асецію і Абхазію толькі мы не прызналі? Казахстан таксама не прызнаў. Але яны Казахстану, які здабывае 90 млн тон нафты, спажывае з іх толькі 11, яны (расіяне) ім за паўцаны пастаўляюць нафту, — сказаў беларускі лідар. — Я задаю пытанне «тандэму» ў Расійскай Федэрацыі: чаму вы паводзіце сябе такім чынам у адносінах да нас, калі адначасова да другога члена Мытнага саюза вы ставіцеся інакш, прадаючы нафту за паўцаны фактычна, без пошліны? Адказу няма. Значыць, тут ёсць нейкія іншыя пытанні... — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мабыць, яны чарговы раз хочуць нас адстроіць, а праз нас — Еўропу. Гэта ў іх практыка такая...».

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што «газ — гэта прычына». «Яны гавораць, што гэта — «спрэчка суб'ектаў гаспадарання». Якая ж спрэчка, калі ў час сустрэчы з Мядзведзевым мы дамовіліся, што ён разбярэцца ва ўсіх пытаннях, у тым ліку і ў газавых, і ў нафтавых (па пошлінах і гэтак далей), пазвоніць мне і скажа вынік. Праз два дні бачу проста-такі сюжэт з фільма, некалькі кадраў: сядзіць Мядзведзеў, сядзіць Мілер, і ён яму дае ўказанне (усё ж гэта зрэжысіравана было): ультыматум — за 5 дзён заплаціць. Як жа заплаціць за 5 дзён, калі вы нам больш вінаватыя?! Чаму ж вы не плаціце?», — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. «Гэта значыць не было прычыны для канфлікту, абсалютна не было прычыны. Яны павінны былі заплаціць $260 млн — мы ім пералічылі б адразу $187 млн».

На яго думку, магчыма, Расія такім чынам хоча ўтрымаць Беларусь у сферы свайго ўплыву. «Нас не трэба трымаць у сферы свайго ўплыву, мы абсалютна па-прарасійску былі настроены, мы рабілі ўсё для таго, каб было добра Расіі. Не такім метадам трэба краіны падцягваць да сябе і трымаць іх у сферы свайго ўплыву. Трэба рабіць так, як амерыканцы з ізраільцянамі ўсталёўваюць адносіны. І я Пуціну з Мядзведзевым часта аб гэтым казаў. Калі ласка, давайце ўсталюем такія адносіны, як амерыканцы з Ізраілем, і вы заўсёды будзеце мець свае інтарэсы ў Беларусі, і яны свята будуць выконвацца», — адзначыў беларускі лідар.

«Імперскае мысленне ў тым і складаецца, што трэба ўзяць, загарнуць, нахіліць, прыціснуць, пятлю накінуць. А інакш яны не ўмеюць. Ну, і, напэўна, патрэбны нейкія пераможныя сёння поспехі. Гэта таксама для вялікіх дзяржаў вельмі важна, перамога нейкая патрэбна. Але Беларусь не тое месца, дзе можна сёння, закасаўшы рукавы, перамагчы, таму што рускі чалавек не прымае бойкі з беларусамі, гэта я ведаю дакладна», — падвёў вынік Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка настойвае на раўнапраўных адносінах у Мытным саюзе.

«А што гэта за Мытны саюз, калі мацнейшая краіна гэтага саюза паводзіць сябе як слон у пасуднай лаўцы: хачу пошліны ўводжу, хачу — адмяняю... Мытны саюз (гэта яго класічнае патрабаванне) не прадугледжвае мытных пошлін унутры. Усе пошліны па перыметры граніц устанаўліваюцца», — падкрэсліў беларускі лідар. «Ну а Расіі гэта, бачыце, нявыгадна. Ды і невялікую выгаду яны ад гэтых пошлін атрымаюць ад Беларусі», — дадаў ён.

«...Ужо не першы раз адбываюцца гэтыя канфлікты ў Расіі з транспартнымі транзітнымі дзяржавамі — з Украінай і Беларуссю. Але гэта спрэчка абсалютна не мае падстаў з пазіцыі Расіі». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што спрэчка ўзнікла тады, калі «Газпрам» завінаваціўся за паслугі Беларусі па транзіце газу $260 млн, а «мы ім вінаватыя былі за перыяд, калі мы вялі перагаворы (мы па старой цане ім плацілі за газ) — $187 млн».

«Мы прасілі іх: «Дайце нам адтэрміноўку два тыдні, каб пагасіць наш доўг»[1]. Але нашы саюзнікі, самыя блізкія нам людзі, сказалі: «Не, ні дня чакаць не будзем». Я звярнуўся да Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, ён мне на працягу сутак, нават менш за суткі, пазычыў $200 млн. Мы аплацілі «Газпраму» доўг — на 100 працэнтаў разлічыліся», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь прадоўжыць пошук альтэрнатыўных пастаўшчыкоў энерганосьбітаў. «Мы шукаем. Мы знайшлі нафту ў Венесуэле, што вельмі Расію напружвае. Мы, я яшчэ раз падкрэсліваю, сёння працуем, як працуе Еўропа ў напрамку таго, каб атрымаць звадкаваны газ (недзе на беразе мора пабудаваць тэрміналы, кінуць трубу і атрымліваць гэты газ, каб была альтэрнатыва)».

Большасць краін сёння на спотавых рынках купляюць звадкаваны газ. «Вы ўяўляеце: у Еўропе — $174 — $176 газ з Катара і Нарвегіі... А нам спрабуюць давесці ў будучым годзе цану на газ да $230 за тысячу кубаметраў». «Там жа трэба яго звадкоўваць, у Катары (завод вялізны, я на ім быў), потым танкерам даставіць, тут яго трэба зноў на заводзе разрэдзваць, заганяць у трубу і пампаваць. А тут жа ідзе: са свідравіны — у трубу — і прама да нас. Таму, калі ўлічыць вось гэтыя затраты, то, вядома ж, трэба прадаваць тут газ танней. Тым больш, калі ўлічыць, колькі беларусы ўклалі ў гэтыя газа- і нафтапромыслы ў свой час?! Мы ж іх там разам з расіянамі, украінцамі і іншымі будавалі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Абвастрэнне адносінаў паміж Беларуссю і Расіяй не азначае разрыву стратэгічнага партнёрства паміж дзвюма дзяржавамі.

«Склалася на сённяшні дзень парадаксальная сітуацыя. Міністэрствы замежных спраў працуюць у адным ключы як адзінае цэлае, міністэрствы абароны (найважнейшая сфера для Расійскай Федэрацыі і для нас сфера бяспекі) працуюць у адным ключы як адзінае цэлае. Гэта тое, што падпадрадкавана Прэзідэнту Расіі. Эканамічны блок — аб чым бы мы з Прэзідэнтам Расіі ні дамовіліся, — урад Расіі зусім не ўспрымае і робіць наадварот. Вось такая парадаксальная сітуацыя. Калі ёсць пагаршэнні ў сферы эканомікі, гандлю, то ёсць і выдатныя адносіны па іншых напрамках. Пры гэтым я не хачу сутыкнуць іх абодвух, як яны часта ў сваіх СМІ заяўляюць. Ды і ў іх, напэўна, склалася такое меркаванне. Не, я проста канстатую факт, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму гаварыць аб тым, што ў нас сёння разрыў стратэгічных адносінаў, нельга».

Адказваючы на пытанне, не ці варта Беларусі развярнуцца на 180 градусаў і стаць на шлях еўрапейскай інтэграцыі, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Па-першае, вялікая палітыка не церпіць ніякіх разваротаў, а рэзкіх разваротаў тым больш. Па-другое, давайце будзем аб'ектыўныя, нас што, у Еўропе чакаюць? Па-трэцяе, у Еўропы сёння столькі праблем з гэтымі 27-ю дзяржавамі, што ім сёння не да Беларусі, не да Украіны і не да іншых. Па-чацвёртае, я Вам скажу абсалютна адкрыта: тое, што ад нас еўрапейцы сёння патрабуюць, для нас непрымальна. Я не магу праводзіць палітыку ў інтарэсах груп, кланаў або яшчэ некага. Я магу праводзіць палітыку толькі ў інтарэсах уласнага беларускага народа. Як сёння мысліць і патрабуе беларускі народ, так я і буду рабіць!»

Гэта не значыць, што людзі ў Беларусі не любяць Еўропу, не разумеюць і не хочуць жыць як там. «Але нашы людзі хочуць жыць у сваёй краіне. Мы нікуды не будзем паварочваць і разварочваць, мы застанемся на сваім кавалку зямлі, мы будзем жыць тут, не стваруючы нікому ніякіх праблем, нашым суседзям, перш за ўсё. І мы ніколі праблем гэтых не стваралі, калі нас не спрабавалі нахіліць, калі нас не спрабавалі сілай прымусіць да вырашэння якіх-небудзь праблем і якіх-небудзь пытанняў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«І потым, калі Вы намякаеце на тое, што «не Расія, дык Еўропа», мы ж з Еўропай не спрачаемся, не сварымся. Мы палавіну — гандлюем у Еўропе, палавіну — у Расіі. Вы што думаеце, што Еўропа лепшым чынам паводзіць сябе ў адносінах да Беларусі? Ды не. Ёсць негатыўныя факты...».

«Так, пажадана, каб былі іншыя вынікі (у адносінах з Расіяй). Але іх, на жаль, няма. Але гэта не прычына для таго, каб, ведаеце, вось узяць і развярнуцца. Ад каго разварочвацца? Мы гаворым на адной мове з імі і не хочам губляць гэту мову. Гэта руская мова, але не расійская. Гэта і наша мова, мы туды ўклалі столькі працы і здароўя за некалькі стагоддзяў жыцця ў адной імперыі, чаму мы ад гэтага павінны адмовіцца? Яна прызнана сусветнай супольнасцю, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Але і сваю мову мы не павінны забываць. Мы яе павінны спакойна, ціха ўзнімаць на нармальны ўзровень. Не так, як нацыяналісты крычалі: «Давай усіх павыганяем, хто не ўмее размаўляць на беларускай мове».

«Я ўжо ў СМІ заўважаю, на асноўных тэлеканалах (расійскіх), што яны пачалі выгаворваць тэзісы прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. Усё абсалютна зразумела: ідзе нацыск напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі. І наша апазіцыя, і яны лічаць, што Лукашэнка для захавання ўлады перад выбарамі (каб Лукашэнку Крэмль падтрымаў і прызнаў) здасць усё. Мне не трэба, яшчэ раз падкрэсліваю, ніякая падтрымка. І мне не патрэбны сёння ніякія прызнанні акрамя прызнання беларускага народа: выбера беларускі народ Пятрова, Сідарава, Іванова ў Беларусі — быць яму прэзідэнтам тут», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне аб магчымасці ўдзелу ў маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я ўжо адказваў неяк на гэта пытанне. Калі я ўбачу, што, увогуле, людзі мяне не прымаюць, то я ніколі не палезу наперакар меркаванню людзей».

Прэзідэнт падкрэсліў, што заўсёды прыслухоўваўся да меркавання народа і менавіта таму атрымліваў падтрымку. «Калі я ўбачу, што гэтай падтрымкі няма, і людзям Лукашэнка ўжо надакучыў, і яны не хочуць, у большасці сваёй, каб Лукашэнка працаваў на гэтай пасадзе, — я вам клянуся, што я за гэта крэсла трымацца не буду», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама запэўніў, што абсалютна для ўсіх кандыдатаў на выбарах будуць створаны роўныя ўмовы. «У мяне няма неабходнасці ствараць няроўныя ўмовы. Таму што Вы ведаеце, што вакол гэтых выбараў адбываецца, тым больш у Расіі, не гаворачы ўжо пра Еўропу (Еўропа і так будзе прасаваць мяне па поўнай праграме). Навошта мне яшчэ ствараць дадатковыя прэцэдэнты і дадатковыя спараджаць факты, каб мяне папракалі ў тым, што я нелегітымны, што я там няправільна выбары правёў. Мне гэта абсалютна не трэба, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я ведаю сітуацыю ў рэспубліцы, ведаю рэйтынг кожнага з маіх магчымых сапернікаў, якія хочуць быць прэзідэнтам. Хаця я памыліўся... Ці хочуць яны быць прэзідэнтам? Гэта яшчэ пытанне».

131 ДЗЯРЖАВА КУПЛЯЛА БЕЛАРУСКАЕ

Паводле апошніх звестак Мінэканомікі, у студзені—красавіку гэтага года Беларусь гандлявала са 163 краінамі свету: тавары пастаўляліся на рынкі 131 дзяржавы, імпартавалася прадукцыя, якая выраблена ў 141 краіне.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі рэспублікі ў згаданы перыяд сталі Расія, на якую прыпадае 48,6 працэнта ад усяго аб'ёму тавараабароту, Украіна – 6,7 працэнта, Нідэрланды, -- 6,1 працэнта, Германія – 4,5 працэнта, Кітай – 3,7 працэнта, Польшча – 3,5 працэнта, Італія, Злучанае Каралеўства – па 1,7 працэнта, Бразілія – 1,6 працэнта, Латвія, – 1,4 працэнта. З агульнага аб'ёму экспарту рэспублікі на долю Расіі прыходзілася 39,1 працэнта, астатніх краін Садружнасці – 13 працэнтаў, краін ЕС – 31,3 працэнта, астатніх краін – 16,6 працэнта. Імпарт з Расіі склаў 56 працэнтаў агульнага аб'ёму імпарту, астатніх краін СНД – 6 працэнтаў, краін ЕС – 20,5 працэнта, астатніх краін – 17,5 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

БЕЛАРУСЬ РЭАЛІЗУЕ З КІТАЕМ 100 ІНВЕСТПРАЕКТАЎ

Адзінаццатае пасяджэнне Беларуска-Кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве прайшло ўчора ў Мінску. На ім старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянон Ломаць і намеснік міністра камерцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі Гао Хутчэн абмеркавалі стан, праблемы і перспектывы беларуска-кітайскага крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

У прыватнасці, гаворка ішла пра выдаткоўванне Кітаем 15 мільярдаў долараў на рэалізацыю 100 інвестыцыйных беларуска-кітайскіх праектаў. Як адзначыў Зянон Ломаць, першачарговымі праектамі стануць будаўніцтва ўзлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», мадэрнізацыя Лукомльскай і Бярэзінскай ГЭС. Астатнія праекты, па словах Зянона Ломаця, пакуль прапрацоўваюцца, але беларускі бок іх будзе накіроўваць у такое рэчышча, каб перш за ўсё забяспечыць энергетычную бяспеку дзяржавы. Зянон Кузьміч прапанаваў кітайскаму боку і кітайскім бізнэсменам, якія таксама прысутнічалі на пасяджэнні камісіі, звярнуць увагу на стварэнне сумесных прадпрыемстваў, на нашу беларускую прадукцыю, на магчымасць укладання кітайскіх інвестыцый у беларускія прадпрыемствы для мадэрнізацыі — напрыклад, у ільнозаводы. Таксама Зянон Ломаць запрасіў кітайскіх прадпрымальнікаў арганізаваць зборку кітайскіх легкавых аўтамабіляў у Беларусі і выказаў спадзяванні, што кітайскія карпарацыі змогуць паўдзельнічаць у будаўніцтве беларускай АЭС. Гао Хутчэн, намеснік міністра камерцыі Кітайскай Народнай Рэспублікі, выступіў з прапановай аб стварэнні ў Беларусі кітайскіх прамысловых зонаў. Зянон Ломаць у сваю чаргу прапанаваў для гэтых мэтаў свабодныя эканамічныя зоны, якія ўжо існуюць у нашай краіне, а таксама расказаў кітайскім гасцям пра льготы для стварэння і развіцця вытворчасці ў малых і сярэдніх гарадах, аднак ён не выключае і магчымасці стварэння чыста кітайскіх прамысловых зонаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 4 (четырех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

лот 1 — земельный участок в деревне Кучкуны, участок № 3, площадь участка 0,1537 га, кадастровый номер участка 622085708601000147, начальная цена 7 685 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков – 4 километра, район индивидуальной застройки, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод);

лот 2 — земельный участок в деревне Кучкуны, участок № 4, площадь участка 0,1537 гектара, кадастровый номер участка 622085708601000148, начальная цена 7 685 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков – 4 километра, район индивидуальной застройки, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод);

лот 3 — земельный участок в д. Выгоничи площадью 0,2500 гектара, кадастровый номер участка 622085703101111187, начальная цена 12 500 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков – 2 километра, асфальтированный подъезд к участку. Участок расположен у лесного массива;

лот 4 — земельный участок в д. Дубоши площадью 0,1561 га, кадастровый номер 622085705601000043, начальная цена 3 902 500 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков – 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк». МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **06 августа 2010 года в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 03 августа 2010 года** (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 1405437.

Парламенцкі дзённік

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ІНАВАЦЫІ

Дэпутаты абмеркавалі з навукоўцамі ўдасканаленне заканадаўчай базы для іх галіны.

Ці не самы галоўны скарб Беларусі — гэта яе жыхары. Такія камплімены нам ахвотна гавораць іншаземцы, а мы з не меншай ахвотай ім верым — самім прыемна так думаць, пагадзіцеся. Ну і ліха з ім, што няма ў нас тых нафты (хлушу, ёсць жа трошачкі на Гомельшчыне) ды газу! Затое людзі ў нас сапраўды адораныя — здольныя, таленавітыя, працалюбівыя. Ёсць сярод беларусаў навукоўцы з сусветным імем, ёсць маленькія дзяўчаты і хлопцы, якія падаюць вялікія надзеі. Так, нашым даследчыкам часцяком нестае фінансавання на праверку ўсіх іх гіпотэз, аднак цяжкасці, як вядома, загартоўваюць... «На нас, беларускіх стажораў, у Германіі адусюль збягаліся глядзець: мы былі выдатнымі дыягностамі. А як інакш? Рукі, вочы ды веды — вось і ўсё наша абсталяванне. Тамтэйшыя ж урачы былі цудоўнымі «тэхнарамі»: яны карысталіся складанымі прыладамі, праўда, без іх былі як без рук», — прыгадваў мой выкладчык-хірург. Вось вам адразу ж і яшчэ адно пацвярджэнне грунтоўнасці тутэйшай адукацыі — у нас нават журналіст у стане аказаць першую дапамогу, дыягнаставаць апендыцыт і прыняць роды, ва ўсякім выпадку, гэтаму вучаць ва ўніверсітэце.

Сапраўды, быў бы розум, а астатняе далучыцца! Патэнцыял на тое, каб спачатку падумаць (як лепш, эфектыўней і зручней), і толькі пасля зрабіць, здаецца, ёсць. Аднак па нашай эканоміцы, узроўні жыцця і прынцыпах арганізацыі (згадайце хоць бы нашы адвечныя чэргі ды перагружанасць транспарту) пакуль гэта не заўжды прыкметна. Як арганіць нашу дыямент, замацаваць інавацыйны падыход, навукаёмістасць у вытворчасці? На высокім узроўні пра гэта задумваюцца, вось і заканадаўцы нядаўна абмеркавалі падчас семінара. Дапамагала ім у гэтым Нацыянальная акадэмія навук. А расказвае і паказвае цяпер «Звязда».

АБАРЫГЕННАЕ ХАРЧАВАННЕ

Тэарэтычная экспрэс-падрыхтоўка народных абраннікаў па ключавых кірунках навуковых даследаванняў суправаджаецца наглядным ўзорамі. Пра дасягненні селекцыйных і насенняводчых вышукаў дэпутатам расказваюць, не адыходзячы ад... палёў. Доследных. 3,5 тысячы дзялянак на тысячы гектараў — што і як тут толькі не высаджваюць, каб даведацца, ад чаго расліны гінуць, а што, наадварот, змушае іх буяць. Вось кукурузу, напрыклад, навукоўцы раяць сеяць у шахматным парадку — так нібыта большая плошча харчавання, адсюль і лепшы ўраджай. І мы схільныя верыць: у правільнасці навуковых вышукаў пераконваюць самі доследныя палі. На іх маё спрактыкаванае вока руплівага дачніка (які штотыдзень змагаецца з пустазеллем выключна ўласнымі рукамі і непамерным цярпеннем) не заўважае літаральна ніводнай парушынкі!

Дэпутаты калісьці звярталі ўвагу ўрада на тое, што, напрыклад, польскія замарожаныя сумесі гародніны запаланілі нашы прылаўкі, а ўласныя прадукты не перапрацоўваюцца... Упушчэнне канстатуюць і навукоўцы. «Трэба гандляваць не мёрзлымі паўтушамі мяса, а перапрацаванай прадукцыяй, задача стаіць — стварацьякасныя канечныя прадукты», — даводзіць **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** «Каб нашы гаспадыні не пераразалі сетку бульбы ў сметніцу, а маглі прыйсці ў краму, узяць паўфабрыкат і хутка прыгатаваць вячэру — усе ж ходзяць з манікюрам, ніхто не хоча бульбу абірацьо».

Аб прынцыпе абарыгеннага харчавання нагадвае **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:** 70 працэнтаў прадуктаў павінны быць уласнымі, чаму ж у нас няма ягадных сокаў, навошта закупляем імпартныя канцэнтраты і разводзім?.. Абмяркоўвалі на семінары і іншыя сельскагаспадарчыя недарэчнасці — такія як нізкая крухмалістасць айчынай бульбы. Дыскусія, трэба меркаваць, зробіць свой унёсак у вырашэнне набалелых праблем...

— Час не стаіць на месцы, мы многае зрабілі, — падкрэслівае спікер Пал

РАДАР
ВЫПУСК № 6 (10)
Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь

„БЯСПЕЧНАСЦЬ ЗАЛЕЖЫЦЬ НЕ ТОЛЬКІ АД МЕРАЎ АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ. У КРАІНАХ ЕЎРОПЫ ВЕЛЬМІ ДОБРА АПРАЎДАЛІ СЯБЕ ТАК ЗВАНЫЯ ПЕРАНОСНЫЯ ЛЯЖАЧЫЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ."

„ЖАНЧЫНЫ ЦЯПЕР НАВАТ БОЛЬШ ВЫНОСЛІВЫЯ, ЧЫМ АСОБНЫЯ МУЖЧЫНЫ. ГЭТА ІХ СТЭРЭАТЫПНА ПРАЦЯГВАЮЦЬ НАЗЫВАЦЬ СЛАБАЙ ПАЛОВАЙ ЧАЛАВЕЦТВА."

А ў нас...

...у Мінску стартавала аперацыя «Хуткасць», — паведамілі ў аддзеле агітацыі і прапаганды Мінгарвыканкама. — Кантроль за выкананнем кіроўцамі хуткасных рэжымаў ажыццяўляецца як у стацыянарным рэжыме, так і ў транспартным патоку з патрульных машын. Больш за тое, на дарогах горада і на МКАД дадаткова ўстаноўлены стацыянарныя хуткасцямеры з відэафіксацыяй «Арэна». «Шумахераў» чакаюць самыя строгія меры адміністрацыйнага ўздзеяння, ажно да пазбаўлення права кіравання транспартнымі сродкамі.

❑

...прайшоў конкурс на лепшага інструктара па навучанні кіраванню сярод усіх аўташкол Магілёва. Канкурсанты дэманстравалі, як веданне ПДР, так і навыкі практычнага ваджэння, — расказала начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вікторыя ЖЭЎНЕР. — У найбліжэйшы час разам з урачом-нарколагам, метадыстам упраўлення адукацыі і інспектарам па справах няпоўнагадовых плануем наведаць загарадныя летнікі. З сабой павязём фільм, у якім даступна расказваецца пра тое, чым пагражае п'янства за рулём.

ШКОЛА. ВЕЛАСІПЕД. ЮНЫ ІНСПЕКТАР РУХУ

Сярод юных інспектараў дарожнага руху рэспублікі выбіраюць лепшых

Лепшыя каманды юных інспектараў дарожнага руху, пераможцы раённых і абласных спаборніцтваў, узялі ўдзел у 38-м рэспубліканскім злёце атрадаў юных інспектараў дарожнага руху, які прайшоў на базе дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра «Надзея».

У спаборніцтвах, якія праходзілі ў некалькі этапаў, разам з беларускімі камандамі ўдзельнічалі школьнікі з Расіі, Украіны і Літвы.

— На выніковы этап рэспубліканскіх спаборніцтваў мы спецыяльна запрасілі каманды з-за мяжы, — кажа **начальнік УДАІ МУС палкоўнік Юрый ЛІТВІН**. — Замежныя госці ў гэтых конкурсах будуць удзельнічаць на агульных асновах, але ацэньвацца — па-за конкурсам. Нашы каманды атрымаюць магчымасць ацаніць свой узровень падрыхтоўкі і зрабіць адпаведныя высновы. Удзел дзяцей з іншых краін арганізаваны з улікам правілаў дарожнага руху у гэтых краінах, бо часам гэтыя правілы адрозніваюцца ад ПДР Беларусі. Напрыклад, у расійскіх ПДР адсутнічае пункт пра

Фота Ілы ЛАПАТО.

тое, што пешаход павінен абазначаць сябе ў цёмны час сутак. Нябавязкова гэта і ва Украіне, а вось у літоўскіх ПДР, гэтаксама як і ў беларускіх, такі пункт ёсць.

Каманда Літвы на спаборніцтвы прыехала складам у восем чалавек.

— У нас гэты рух называецца «юныя веласіпедысты», — расказаў «Звяздзе» **кіраўнік каманды, настаўнік школы «Лігумаі» ў Марыенпалі Бенас ЯНКЯВІЧУС**. — Асаблівую ўвагу падчас падрыхтоўкі нашых веласіпедыстаў мы звяртаем на спалучэнне тэорыі і практыкі. Штогод у нас таксама праходзяць спаборніцтвы. Вясной праходзіць першы этап — у школах, пасля — у гарадах, затым — абласны тур. І чацвёрты этап — спаборніцтвы паміж лепшымі камандамі Літвы. Наша каманда летась на агульналітоўскіх спаборніцтвах заняла пятае месца. Увогуле, наша каманда дастаткова часта бярэ ўдзел у спаборніцтвах ЮІД у Еўропе. Летась, напрыклад, сярод 24 камандаў мы былі чацвёртымі, а на аналагічных спаборніцтвах у Славеніі заваявалі залаты кубак. У Беларусь прыехалі ўжо трэці раз.

У выніку чэмпіёнамі 38-га злёту ЮІД стала каманда горада Мінска. Другое месца падзялілі каманды Брэсцкай і Мінскай абласцей. На трэцяй прыступцы спынілася каманда Гомельскай вобласці. Кубкі і каштоўныя прызы атрымала кожная каманда. Дадаткова кожны ўдзельнік атрымаў адмысловыя сувеніры, фотаплакаты і фотаальбомы з фотаздымкамі сёлетніх спаборніцтваў.

Пераможца злёту — каманда г. Мінска, будзе прадстаўляць Беларусь на 34-м злёце юных інспектараў Украіны, які пройдзе ў верасні ў Артэку.

А ў нас...

...вучні, якія навучаліся ў профільных класах ДАІ, створаных пры 33-й школе Гродна, напрыканцы чэрвеня штодзень ажыццяўлялі пасіўнае дзяжурства разам з інспектарамі на аварыйна-небяспечных участках дарог і вуліц абласнога цэнтра, — расказаў начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Алег ДУК. — Мы лічым, што прысутнасць на дарозе дзяцей у форме (а іх форма вельмі падобная на форму інспектараў ДАІ) яшчэ больш дысцыплінуе ўдзельнікаў дарожнага руху.

❑

...у аздараўленчых і прышкольных летніках дэманструецца тэматычны відэаролік пад назвай «Добрыя дарогі дзяцінства», — паведаміла старшы інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Іна ГОЛІК. — У міні-фільме апісваюцца тыповыя памылкі дзяцей на дарогах. Да канца лета плануем паказаць яго ў кожным летніку, каб нагадаць яшчэ раз, што ў ПДР канікулаў не існуе.

❑

...14 чэрвеня стартавала акцыя «Бяспечная будучыня», — расказала начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Наталля САХАРЧУК. — Яна працягнецца да 20 жніўня. У межах акцыі абвешчаны конкурс малюнкаў «Бяспечнае лета вачыма дзяцей» сярод падлеткаў. Малюнкі прымаюцца да 15 жніўня ўключна. Акрамя таго, на днях батальён ДПС ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама правёў акцыю «Дзень адчыненых дзвярэй». Усе ахвотнікі змаглі праехаць разам з супрацоўнікамі ДАІ з уключанай светлавой і гукавой сігналізацыяй на патрульных аўтамабілях, прымераць спецыяльныя сродкі — шлем і бронекамізэлька, дакрануцца да пісталета Макарава, аўтаматаў, сігнальнага пісталета, убачыць у дзеянні фотавідэафіксатар «Кадр-1» і відэафіксатары «Арэна», «Візір».

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці падвяла вынікі 4-га абласнога агляду-конкурсу прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы ДАІ Мінскай вобласці. У выніку самай прафесійнай была прызнана каманда аддзялення ДАІ Слуцкага РАУС, якая апярэдзіла супернікаў з Мінскага і Смалявіцкага РАУС (другое і трэцяе месцы адпаведна).

А ў нас...

...у прышкольных летніках ладзяцца конкурсы на веданне ПДР. Акрамя таго, дзеці дэманструюць навыкі аказання першай даўрачэбнай дапамогі, праз малюнак паказваюць, што можа здарыцца, калі ігнараваць ПДР, — распавяла інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды Віцебскага аблвыканкама Наталля САМАВАРАВА. — Таксама прапаноўваем дзецям напісаць ліст кіроўцу. Кранальныя сачыненні інспектары ДПС уручаюць кіроўцам-парушальнікам падчас рэйдаў.

❑

...у дзіцячым аздараўленчым летніку «Івалга» Маладзечанскага раёна прайшла прафілактычная акцыя «Бяспечнае лета», — распавёў начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Мінаблвыканкама Алег ЦЮРЫН. — У забаўляльных конкурсах і віктарынах, якія правялі супрацоўнікі УДАІ і адукацыі Мінаблвыканкама, узялі ўдзел каля 200 дзяцей. Кожны атрымаў памятныя сувеніры, а пераможцы — каштоўныя падарункі.

РАДАРНЫ КАНТРОЛЬ — САМЫ СПРАВЯДЛІВЫ

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

З гэтым, бадай, наўрад ці хто з вадзіцеляў будзе спрачацца. Супрацоўнікі ДАІ Ляхавіцкага РАУС капітан міліцыі Віталь Шклянік (на фота справа) і малодшы лейтэнант Яўген Адамчык таксама ў гэтым упэўненыя. Прыбор па замеры хуткасці аўтамабіля ці матацыкла, лічаць міліцыянеры, не толькі паказвае дакладную хуткасць, але і ўскосна можа паведаміць пра гаспадара транспартнага сродку. Праўда, усё ж галоўную ролю выхавальнікаў выконваюць людзі. У нашым выпадку — супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі.

Сёння яны нясуць службу на трасе Р4 Ляхавічы — Баранавічы, якая традыцыйна з'яўляецца загружанай пад завязку. Што зусім не дзіўна: зносіны паміж двума гарадамі ляжаць у асноўным па гэтым маршруце. І тут, як кажуць, трымай руку на пульсе. Няправільны абгон, выезд на паласу сустрэчнага руху, перасячэнне скразной, у тым ліку і двайной дарожнай разметкі, значнае перавышэнне хуткасці, язда без правоў і «пад градусам» — гэта далёка не поўны пералік правапарушэнняў з боку ўладальнікаў аўто, з якімі штодня інспектарам ДПС прыходзіцца мець справу.

Аператыўна спраўляцца са сваімі абавязкамі афіцэрам дазваляе высокая прафесійная кваліфікацыя, адпаведная жыццёвая практыка і веданне рэальнага становішча на дарогах.

З 28 па 30 чэрвеня Дзяржаўтаінспекцыя МУС Рэспублікі Беларусь праводзіць акцыю «ДАІ папярэджвае па-добраму». Кіроўцы і пешаходы, якія парушаюць правілы, будуць прыцягвацца да адказнасці, а законапаслухмяных удзельнікаў дарожнага руху чакаюць прыемныя падарункі ад інспектараў ДПС.

Аляксандр САМУЛЬ, намеснік начальніка УДАІ Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, маёр міліцыі:

«ГАЛОЎНАЕ — УЗАЕМНАЯ ВЕТЛІВАСЦЬ!»

Некаторыя сакрэты таго, як дасягнуць мінімуму аварый на дарогах, дарожныя нюансы сёлетняга «базару», што ўжо зроблена на радзіме Шагала для навядзення парадку на дарогах, што плануецца — пра гэта і не толькі расказаў падчас размовы з нашым уласным карэспандэнтам намеснік начальніка УДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, маёр міліцыі Аляксандр Самуль.

— Аляксандр Часлававіч, напачатку, калі ласка, раскажыце пра тое, што сёння турбуе Дзяржаўтаінспекцыю Віцебскай вобласці? Якія праблемныя пытанні трэба вырашаць?

— Турбуе аварыйнасць, якая звязана з пешаходнымі нерэгуляванымі пераходамі. Фактычна кожны тыдзень праводзім адпаведныя рэйды, падчас якіх адпрацоўваем усе такія пераходы. Вось, выявілі ўсяго за тры гадзіны работы болей за дваццаць парушэнняў. Гэта шмат. Яны звязаныя з няўвагай вадзіцеляў. Бясспрэчна, узраслі транспартныя патокі: толькі ў Віцебску штодня рэгіструецца больш за сто аўтамабіляў. Але ў любым выпадку на дарозе заўсёды трэба быць уважлівымі і ўзаемна ветлівымі.

А як часта атрымліваецца? Адна машына, якая ідзе ў крайнім правым радзе, спыняецца, а другая, якая ідзе ў сярэднім радзе, не прапускае пешахода... І ў выніку адбываюцца наезды.

Менавіта падчас гэтых дарожна-транспартных здарэнняў часта траўмуюцца і гінуць людзі. Таму да парушальнікаў прымаем самыя жорсткія меры адміністрацыйнага ўздзеяння.

— Ці паменшылася колькасць здарэнняў, параненых, ахвяраў дарожных здарэнняў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года?

— Колькасць аварый паменшылася. Амаль што ў два разы меней колькасць загінулых на дарогах. Колькасць параненых прыкладна на адным узроўні.

— З пацярпленнем матацыклісты выязджаюць на дарогі. Ведаю, цяпер дзяржаўтаінспекцыя актыўна «кантралюе» гэтую групу вадзіцеляў.

— Так, кантралюем, як вы скажалі, як і ўсіх астатніх удзельнікаў дарожнага руху. Вось нядаўна правялі спецыяльны рэйд з удзелам прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Пяць экіпажаў ДАІ адпрацавалі Віцебск і Віцебскі раён. Калі выяўляем нейкія парушэнні, усе без выключэння матацыклы адпраўляем на штрафную стаянку.

Фота Аляксандра ПУКШАНСКАГА.

— Зараз інспектарам ДАІ стала трапляцца болей ці меней нецвярозых вадзіцеляў?

— На жаль, пакуль што меней такіх не стала. Але ёсць надзея, што больш вадзіцеляў у наступны раз задумаюцца: сесці ці не за руль «пад мухай».

— У пачатку гэтага года кіраўніцтва аўтаінспекцыі вобласці дзялілася з журналістамі планамі прымянення на дарогах сучасных сродкаў арганізацыі дарожнага руху. Планы ажыццяўляюцца?

— Бяспечнасць залежыць не толькі ад мераў адміністрацыйнага ўздзеяння. У краінах Еўропы вельмі добра апраўдалі сябе так званыя пераносныя ляжачыя паліцэйскія. Пакуль што мы актыўна выкарыстоўваем пастаянныя штучныя няроўнасці для пешаходных пераходаў. Вельмі зручна па такіх «паліцэйскіх» пераходзіць дарогу. Колькасць такіх паліцэйскіх з нанясеннем «зебры» павялічыцца. Яны ў асноўным устанаўліваюцца непадалёк ад школ, прадпрыемстваў і гэтак далей, дзе трэба знізіць хуткасны рэжым. Не сакрэт, што знакі абмежавання хуткасці многія вадзіцелі проста ігнаруюць.

— А ці ёсць узорныя прыклады, калі хуткасць руху проста «касмічная».

— І пад 200 кіламетраў у гадзіну, бывае, едуць.

— У ДАІ пра такія парушэнні паведамляюць самі грамадзяне?

— Па пытаннях перавышэння хуткасці мала тэлефануюць. А ў цэлым супрацоўнічаюць з ДАІ і міліцыяй усё больш грамадзян. Пры дапамозе людзей, вадзіцеляў таксі, нават раскрылі наезд на пешахода, які загінуў. Дапамаглі раскрыць выкраданне аўтатранспарту. Вадзіцель таксі ў гэтым выпадку нават паехаў у пагоню за зламыснікам.

Дарэчы, магу канстатаваць, што ў апошнія гады фактычна толькі адзінкавыя выпадкі фіксуюцца, калі заганяюць аўто ў суседнюю Расію і наадварот. Гэта сведчыць пра добрае ўзаемадзеянне ДАІ і міліцыі дзвюх краін.

Шмат інфармацыі ад людзей паступае па пытаннях няправільнай паркоўкі аўто... У апошні час больш званкоў у ДАІ робяць тыя, хто ўбачыў, як выкідваюць смецце з машын, мыюць машыны ў зялёных зонах. Наш горад стаў у апошні час вельмі чыстым. І гэта адзначаюць і госці «Славянскага базару ў Віцебску». Параўноўваюць з цывілізаванай Еўропай.

— Вы ўзгадалі «базар». Ці будзе сёлета перакрыты цэнтр фестывальнага горада?

— Не. Мы ўжо два гады рух аўтатранспарту не перакрываем падчас правядзення фестывалю. Гэта зручна і гараджанам, і гасцям. Мы адпрацавалі спецыяльную «схему». Канцэрты завяршаюцца, людзі без праблем могуць паехаць на грамадскім транспарце. Гэта і нам зручна. Раней людзі хадзілі пасля канцэртаў па праезнай частцы, стваралі адпаведна праблемы. У так званыя рэжымныя «зоны» ў цэнтр фестывальнага горада не пускаюць людзей нават у лёгкім алкагольным стане, таму ад усіх пешаходаў не даводзіцца чакаць непрыемных сюрпрызаў.

— Асабіста старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец нам, журналістам, расказваў пра тое, што будзе зроблена па навядзенні парадку на дарогах. Наколькі я ведаю, ужо шмат зроблена ў гэтым кірунку. Можна некалькі прыкладаў?

— На дарозе «Р-20» Віцебск —Полацк у раёне вёскі Мікіціха Шумілінскага раёна раней было шмат дарожна-транспартных здарэнняў з цяжкімі вынікамі. Зараз на гэтай дарозе ўжо ёсць пяць асветленых участкаў дарогі. Калі нейкі вадзіцель ужо стомлены, ён заязджае на такія ўчасткі, дарэчы, па-за межамі населенага пункта, аўтаматычна становіцца больш уважлівым. Адпаведна рызыка аварый памяншаецца.

Што тычыцца абласнога цэнтра, сапраўды, у апошні час значна палепшылася дарожная сетка. Дарожны рух арганізаваны па прынцыпе «зялёнай хвалі», які вельмі зручны вадзіцелям і пешаходам. Палепшыўся стан тратуараў, таму пешаходы вельмі рэдка выходзяць на дарогу, каб, напрыклад, абысці нейкі вялікі брудны адрэзак, яму...

Так кіраўнік вобласці нас падтрымлівае. Дадаткова, у прыватнасці, у горадзе паставілі дзесяць святлафораў. За апошнія пару дзён дабавілася некалькі пешаходных пераходаў там, дзе раней іх не было, напрыклад, на плошчы «1000-годдзя горада Віцебска». Усе адпаведныя звароты грамадзян наконт стварэння пешаходных пераходаў улічваюцца, робяцца захады.

— Што б хацелі напрыканцы сказаць усім удзельнікам дарожнага руху?

— Як кожны супрацоўнік ДАІ хачу, каб пешаходы і вадзіцелі былі ўзаемна ветлівымі, разумелі адно аднаго. Не трэба хаміць на дарогах, лаяцца... Мы хочам яшчэ больш зменшыць рызыку на дарогах, каб кожны дзень у розны час сутак на дарогах быў парадак.

Жаночы погляд

Ганна КУХТО, старшы інспектар аддзела кадраў УДАІ УУС Мінаблвыканкама:

«ПАВОЛІ ЕДЗЕШ — ДАЛЁКА СТАНЕШ»

Гэтага дэвізу штодзень на дарозе прытрымліваецца наша сённяшняя госця — Ганна КУХТО. Вось ужо шэсць гадоў яна працуе ў аддзеле кадраў УДАІ УУС Мінаблвыканкама.

— Ганна, форму насіць марылі з дзяцінства?

— Не, калі была малая, марыла стаць настаўніцай. Нават гуляла, не як усе дзяўчаткі ў лялькі, а ў школу: правярала сшыткі, ставіла адзнакі. І паступаць хацела ў лінгвістычны, але ў апошні момант бацькі адгаварылі. У выніку скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце. У Дзяржаўтаінспекцыю ж прыйшла ўладкоўвацца разам са стрыечным братам. З таго часу так разам і працуем. Можна сказаць пашлі па слядах бацькі, ён у мяне ўзначальваў АДАІ Глыбоцкага райвыканкама.

Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

— Не пашкадавалі, што паслухалі бацькоў і не сталі настаўніцай?

— Ніколькі. Мне вельмі падабаецца працаваць з людзьмі, а тут недахопу ў стасунках я не адчуваю. Вось ужо шэсць гадоў прымаю на службу маладых людзей. Прыходзяць розныя, часам занадта амбіцыйныя, але з кожным у мяне атрымліваецца знаходзіць агульную мову. Калектыў у нас выдатны, нічога не скажу. Ды і ў кабінеце, дзе я сяджу з жанчынай-калегай, у нас вельмі добрая атмасфера. Мы заўсёды адна адну падтрымліваем. Я гэтаму вельмі рада.

— Звычайна дзеці, якія выраслі ў міліцэйскай сям'і, скардзяцца на недахоп увагі?

— Я тату таксама вельмі рэдка бачыла. Але не магу сказаць, што ён не прымаў удзел у маім выхаванні. Калі дазваляў час, займаўся са мной матэматыкай і фізікай, бо гэтыя прадметы ў школе мне даваліся вельмі цяжка. Маці і цяпер, калі мы збіраемся сям'ёй, любіць узгадваць першамайскі парад. Тата быў, як заўсёды, на службе, таму мы з маці ішлі ўдзвюх. Я па-даросламу ўздыхнула і сказала: «Мама, мы з табой дзве ўдавы» *(усміхаецца)*. Я вельмі ганарылася (і цяпер ганаруся) сваім татам. Уся залівалася фарбай ад гонару, калі ён прыходзіў выступаць да нас у школу. Штораз з нецярпеннем чакала, калі яго пакажуць па тэлевізары. Мне пашчасціла, я вырасла ў пяшчоце і любові. Адносіны ў сям'і ў нас вельмі добрыя. Дай Бог кожнаму такія. Мая дачка, Алёне зараз 8 гадоў, таксама ганарыцца, што яе маці працуе ў ДАІ. Усім расказвае: «Мая мама — міліцыянер. Яна мяне ў крыўду не дасць».

— А ваша Алёна не пакутуе ад недахопу ўвагі?

— Асабіста ў мяне работа, у асноўным, кабінетная, нармаваная. Праўда, час ад часу, здараецца, трэба працаваць у выхадныя дні, выязджаць па трывозе. Калі я прыйшла ў ДАІ, маёй Алёне яшчэ не было двух гадоў, таму даводзілася браць яе пастаянна з сабой.

— Ганна, а як даўно вы селі за руль?

— Правы атрымала 10 гадоў таму. Кіраваць жа грузавіком тата навучыў, калі я яшчэ была ў восьмым класе. Калі б у мяне зараз забралі машыну, я не ведаю, як бы я ўсё паспявала (шторанішу важу дачку ў школу, якая знаходзілася далёка ад дому). І да бабулі з дзядулем можам паехаць у любы момант. За рулём адчуваю сябе дастаткова ўпэўнена. Магчыма таму, што няўхільна кіруюся правілам «паволі едзеш — далёка станеш».

— А як ставіцеся да жанчын за рулём?

— Асабіста для мяне не мае значэння, хто за рулём, мужчына ці жанчына. Галоўнае, каб чалавек быў культурны. Бо на дарозе, як і ў жыцці, сустракаюцца, як ветлівыя людзі, так і хамы, якія не толькі не прапусцяць, але і падрэжуць цябе.

— Як вы лічыце, калі б у ДАІ стварылі выключна жаночы аддзел, ці справіліся б яны?

— Думаю, што справіліся б. Жанчыны цяпер, нават больш вынослівыя, чым асобныя мужчыны. Гэта іх стэрэатыпна працягваюць называць слабай паловай чалавецтва *(усміхаецца)*.

— Што б хацелі змяніць у сістэме ДАІ, на дарозе?

— Перш чым мяняць усю сістэму, трэба змяніць нешта ў сабе. Я не раз бачыла, як асобныя кіроўцы, ледзь толькі праедуць супрацоўнікаў ДАІ, адразу пачынаюць набіраць хуткасць. Ці ж гэта правільна? Трэба выконваць хуткасны рэжым, вытрымліваць дыстанцыю. Усялякія сітуацыі здараюцца на дарозе, за галаву хапаюся, калі іх абмяркоўваюць штодзень на пяцівілінцы. І яшчэ абавязкова трэба прышпільвацца, а не спадзявацца на ўдачу. Не так даўно маю знаёмую «задушыла» машынай. Яна ехала на пярэднім сядзенні побач з кіроўцам, машына перавярнулася, і жанчына вылецела на праезную частку. Аўтамабіль упаў на яе. Калі б яна была прышпіленая, то, хутчэй за ўсё, выжыла б разам з кіроўцам.

— Падзеліцеся з намі сваёй марай?

— Так сталася, што выхоўваю дачку адна, таму мару пра дружную сям'ю. Без сумненняў, гэта вельмі важна для кожнай жанчыны. Праца працай, але сям'я для кожнай з нас павінна быць на першым месцы.

— Чым любіце займацца ў вольны час?

— Алёна займаецца фігурным катаннем, таму і мяне навучыла катацца на каньках. Зараз узялі ў бібліятэцы кніжку і вучымся разам вязаць кручком. Акрамя таго, я вельмі люблю гатаваць.

— У вас, напэўна, ёсць каронная страва?

— Люблю пячы торт «Мурашнік». У Алёны ёсць любімая салата, мы яе так і называем «Любімая», дачка часта просіць яе прыгатаваць. З інгрэдыентаў для яе патрэбны грыбы, памідоры, морква карэйская, курынае мяса, маянэз і грэцкія арэхі. Я стараюся дзіцяці надзяляць больш увагі. Бо пераканана: што пасею, тое і пажну.

— Ці часта даводзіцца развітвацца з супрацоўнікамі датэрмінова?

— За апошнія два гады за праступкі мы нікога не звальнялі. І гэта не можа не радаваць. Я хацела б пажадаць калегам, каб яны звальняліся толькі з нагоды павышэння альбо па дасягненні вызначанага ўзросту. І яшчэ цярпення ім на дарогах, бо іх служба насамрэч складаная, даводзіцца працаваць і ў спякоту, і ў холад.

— Давайце напрыканцы размовы пажадаем што-небудзь кіроўцам і пешаходам?

— Кожны раз, калі вас спыняе інспектар дарожна-патрульнай службы, спрабуйце паставіць сябе на яго месца. І яшчэ: выконвайце правілы дарожнага руху — і тады ў вас наўрад ці ўзнікнуць праблемы на дарозе.

ВОПЫТ І МАЛАДОСЦЬ

Сённяшняе дзяжурства экіпажа супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі Навагрудскага РАУС — гэта якраз выпадак, калі гавораць пра спалучэнне вопыту і маладосці.

Лейтэнант міліцыі Уладзімір Брынкевіч (на здымку злева) служыць у ДАІ толькі два гады. Праўда, невялікі стаж у дарожна-патрульнай службе ні ў якім разе не ўплывае на эфектыўнасць дзяжурства. І ў многім таму, што маладому супрацоўніку міліцыі ёсць у каго павучыцца. Асабліва калі нясеш службу на пару з такім вопытным афіцэрам, капітанам міліцыі, як Сяргей Жыгала. Паводле яго слоў, за 20 гадоў «працоўнай» біяграфіі ў Дзяржаўтаінспекцыі ён ужо ведае не толькі ўсе сцежкі-дарожкі, па якіх могуць рухацца вадзіцелі «пад чаркай» ці зладзеі на ўкрадзенай машыне, але і ўсе хітрасці людзей за баранкай.

Народная прымаўка пра добрага інспектара ДАІ, мяркуючы па размове з вартавымі навагрудскіх дарог, гэта не выдумка. Калі супрацоўнік ДАІ ацэньвае ваша правапарушэнне як нязначнае і вадзіцель пры гэтым не спрабуе вадзіць за нос, віноўнік можа атрымаць і папярэджанне. Калі ж чалавек садзіцца за руль транспартнага сродку пасля ўжывання алкаголю ці стварае аварыйныя сітуацыі на дарозе — пашчады не чакай.

Сваім службовым прынцыпам супрацоўнікі ДАІ Навагрудскага РАУС стараюцца не змяняць. Сёння ў іх дзяжурства на трасе Навагрудак—Карэлічы і далей з выездам на «алімпійку».

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

ВІРТУОЗЫ ЖАЗЛА

Самае складанае скрыжаванне ў цэнтры Гомеля — праспект Леніна—вуліца Інтэрнацыянальная. Менавіта тут пачыналі спаборніцтва ўдзельнікі XIII рэспубліканскага агляду-конкурсу прафмайстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы.

Усяго 12 камандаў прадставілі не толькі вобласці нашай краіны і горад Мінск, але і госці з Расіі, Украіны, Літвы і Малдовы. Першы конкурс міжволі браў пад увагу не толькі калег-арбітраў, але і ўсіх, хто ў гэты момант перасякаў вуліцы. Святлафор, між тым, быў адключаны наўмысна. Кожны з удзельнікаў конкурсу віртуозна, практычна, як дырыжор аркестрам, з дапамогай паласатага жазла кіраваў патокамі машын і людзей. Напрыканцы працоўнага дня хапала і тых і тых. Тым не менш, здаецца, ніхто, у тым ліку замежныя ўдзельнікі, не разгубіўся.

І гэта быў толькі пачатак. Бо потым дзяржаўтаінспектары спаборнічалі ў хуткасным манеўраванні на легкавым аўтамабілі і матацыкле, у веданні правілаў дарожнага руху. Прайшлі конкурсы на лепшае валоданне баявымі прыёмамі барацьбы, па спецыяльнай, медыцынскай і фізічнай падрыхтоўцы, уменні страляць з аўтамабіля, калі ён рухаецца. Паглядзець на спаборніцтвы падначаленых у Гомель прыехаў і **начальнік упраўлення ДАІ МУС Беларусі Юрый ЛІТВІН**:

— Гэта перш-наперш абмен досведам і думкамі ў галіне бяспекі дарожнага руху — тое, да чаго мы заўсёды павінны імкнуцца. Мы паказваем свае навыкі, уменні, магчымасці, спаборнічаем — усё як у спорце. У многім мы перадаём свой досвед, бо нам сапраўды ёсць чым пахваліцца. Беларусь моцная ў галіне арганізацыі дарожнага руху. У нас дарогі больш-менш бяспечныя. Я не скажу, што на 100 %, але яны ўжо адказваюць неабходным патрабаванням. А ў суседзяў мы многае бяром у плане ўдасканальвання заканадаўства. Мы паступальна ідзём да таго, што пешаход, веласіпедыст павінен быць на дарозе вызначаны — ці то камізэлька спецыяльная, ці то святлоадбівальныя элементы на адзенні. Выкарыстоўванне іх у цёмны час сутак дазваляе захаваць за год амаль 200 чалавечых жыццяў. Такая мера прафілактыкі дарожных здарэнняў атрымала дастаткова шырокае распаўсюджванне ў Беларусі не толькі дзякуючы кантролю з боку супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, але і намаганням многіх ведамстваў, арганізацый, працоўных калектываў. Наш практыкай ужо зацікавіліся і думаюць пераняць яе ў суседніх краінах тыя службы, што забяспечваюць бяспеку дарожнага руху. У краіне штогод адбываецца знікненне колькасці дарожна-транспартных здарэнняў на 15—20 %, і гэта дзякуючы святлоадбівальным элементам.

Па выніках XIII рэспубліканскага агляду-конкурсу прафмайстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы пераможцай стала спецыяльнае падраздзяленне дарожна-патрульнай службы «Страла» УДАІ МУС Беларусі. З невялікім адрывам ад лідараў фінішавала каманда дзяржаўтаінспектараў Гомельскай вобласці. Трэцяе месца падзялілі каманды супрацоўнікаў ДПС з Мінска і Мінскай вобласці. У асабістым першынстве абсалютным пераможцам стаў інспектар ДПС батальёна дарожна-патрульнай службы ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Сяргей Бандарэнка. Прызавыя месцы таксама дасталіся старшым інспектарам «Стралы» Яўгену Патаповічу і Анатолю Кукарцаву.

Пераможцам 13-га Рэспубліканскага агляду-конкурсу прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі стала каманда спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла». Другое месца заняла каманда Гомельскай вобласці, трэцяе месца падзялілі каманды горада Мінска і Мінскай вобласці. Віншуем!

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

Матэрыялы спецвыпуска падрыхтавалі У. ЗДАНОВІЧ, Н. ДРЫЛА, І. ЛАПАТО, І. АСТАШКЕВІЧ, П. БЕРАСНЕЎ, А. ПУКШАНСКІ.

«Я... ІМКНУСЯ СТАЦЬ АБСАЛЮТНЫМ ЧЭМПІЁНАМ СВЕТУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ведаеце, у першых раўндах мне цяжка было кантраляваць сваё моцнае жаданне. Пазней я стаў разумець, што двубой зацягнецца, што супернік спрактыкаваны. Я не скажу, што моцна стаміўся, папросту змяніў тактыку на менш агрэсіўную, — аналізуе Аляксандр Усцінаў сваю перамогу для журналіста «Звязды». — Усё склалася нармальна, паводле плана, не самы складаны двубой у маім жыцці.

Падкрэслім, што самай «гарачай» падзеяй стаў не двубой Усцінаў—Відаль, а прэс-канферэнцыя перад турнірам. Мінскі баксёр зрабіў журналістам сенсацыйную заяву: *«Пасля Відаца, напэўна, пашлю тэлеграму Клічко»*. Натуральна, што Аляксандр надзвычай прамы і шчыры чалавек. Але кінуць выклік сусветнай легендзе Віталю Клічко, які ў дадатак з'яўляецца тваім прамоўтарам (раскруткай Аляксандра Усцінава займаецца кампанія K2 Promotions, якая належыць украінцу) — гэта, на першы погляд, адчайны крок. Пытаемся ў Аляксандра, ці правільна яго зразумелі журналісты?

— Сапраўды, на прэс-канферэнцыі карэспандэнт задаў пытанне пра мае далейшыя планы, — узгадвае сітуацыю Аляксандр Усцінаў. *— Я сказаў, што намераны сустрэцца са сваім суседам па стале* (справа ад Аляксандра на прэс-канферэнцыі сядзеў Віталь Клічко, — **«Звязда»**). *Якія тут жарты. Пасля двубоя Віталь* (Клічко, — **«Звязда»**) падышоў да мяне і павіншаваў: «Саша, хутка ты будзеш чэмпіёнам свету». Я прама адказаў: «Хачу быць абсалютным чэмпіёнам, аб'яднаць усе паясы». Мяркую, што Віталь усё разумее. Гэтае жаданне — абсалютна нармальнае. Мы займаемся адной справай і імкнёмся да найвялікшых дасягненняў. Як кажуць — калі камандаваць, дык войскам...

Каб аб'яднаць усе паясы сусветнага бокса, трэба пабіць Віталя Клічко (чэмпіён WBC), яго малодшага брата Уладзіміра Клічко (чэмпіён IBF і WBO) і брытанца Дэвіда Хэя (чэмпіён WBA). Падобнае цягам дзясятка гадоў не ўдалося нікому.

На развітанне пытаемся ў Аляксандра, што адбываецца ў яго неспартовым жыцці?

— Калі вы пра асабістае жыццё, то на гэта ў мяне пакуль няма часу, я засяроджаны на сваіх планах і не хачу распыляцца. Усяму свой час. Цешуся, што без хвастоў здаў сесію (Аляксандр навучаецца ў Мінскім інстытуце кіравання, — **«Звязда»**). *Праблем з навучаннем у мяне няма, наадварот, люблю здаваць сесіі. Гэта — змена асяроддзя, новыя веды, развіццё, знаёмствы. Засталося давучыцца ўсяго адзін курс.*

Два гады не бачыў бацькоў, таму ў бліжэйшы час планую іх наведаць...

«НЭПЭРЭМОЖНЫ УКРАІНЭЦЬ»

Людзі, якія разумеюць у боксе, даўно скемілі — Усцінава можа чакаць гучная будучыня. 21 двубой, 21 перамога, 16 накаўтаў. Замежныя СМІ далі мінскаму баксёру неадназначную мянушку — «Вялікі». Тым часам суседняя з Беларуссю краіны безапеляцыйна называюць Аляксандра «сваім».

Напрыклад, вось як рэкламавалі двубой Усцінава і Відаца па вядомым украінскім тэлеканале «Інтэр»:

«Олэксандр Устынов. Ныколы нэ програвав. Непэрэможны ЎКРАІНЭЦЬ проты італійского вэтэрана. Бій за пояс чэмпэона Европы. Паоло Відоц проты Олэксандра Устынова».

Самы папулярны байцоўскі сайт братняга народа allboxing.ru назваў Аляксандра *«РАСІЙСКІМ суперцяжкавагавіком, які паспяхова абараніў тытул»*.

Усцінаў і сапраўды нарадзіўся на Алтаі, служыў у расійскай арміі. Але боксам з нуля пачаў займацца ў беларускага трэнера Уладзіміра Задзірана (Аляксандру было ўжо 25 гадоў), пераехаў жыць у Мінск. Выступае баксёр пад беларускім сцягам.

Прэс-служба кампаніі K2 Promotions называе Аляксандра то беларусам, то расіянінам, то мінскім баксёрам.

Яўген ВАЛОШЫН.

Аляксандр УСЦІНАЎ (справа) шчыра прызнаўся легендарнаму Віталю КЛІЧКО, што хоча з ім сустрэцца ў баі.

Міхаіл ВЕРГЯЕНКА:

«СЛАБАЕ ЗВЯНО АНГЛІЧАН — ВАРАТАРЫ»

ВЫХАДНЫЯ парадавалі нас першымі матчамі плэй-оф на чэмпіянаце свету. Нічога нечаканага не адбылося ў матчы Уругвай — Паўднёвая Карэя, з лікам 2:1 перамаглі лацінаамерыканцы. Суарэс, Фарлан і К° сустрэнуцца ў чвэрцьфінале з Ганай. Гэтая афрыканская каманда пераадолела на шляху да 1/4 валявых амерыканцаў з такім жа лікам — 2:1.

Англічане адпраўляюцца дадому пасля матчу з немцамі. «Бундэсмашына» вынесла пачынальнікаў футбола, разграміўшы іх з лікам 4:1, з удзячнасцю прыняўшы дапамогу суддзі (англічанам не залічылі гол Лэмпарда). Гэта самае буйное паражэнне англічан за ўсю гісторыю іх выступленняў на чэмпіянатах свету і Еўропы. Яшчэ ў адным матчы аргенцінцы перамаглі мексіканцаў — 3:1. Матч таксама не абышоўся без памылкі суддзі, а ў перапынку на газоне нават адбылася невялікая бойка — зразумела, не без удзелу Марадоны.

Пракаментаваць апошнія матчы чэмпіянату свету мы прапанавалі чэмпіёну СССР у складзе мінскага «Дынама», намесніку старшыні федэрацыі футбола Міхаілу ВЕРГЯЕНКУ.

— Міхаіл Нікіфаравіч, самым цікавым для нас у плэй-оф пакуль стаў матч Германія — Англія. Зразумела, што ўсю Англію трасе ад шаленства ад незалічанага гола Лэмпарда. У той жа час, што перашкаджала зборнай «трох ільвоў» адыгрывацца пасля перапынку? Мы заслужана страцілі зборную Англіі?

— У фінальнай частцы чэмпіянату Англія не прадэманстравала тую гульню, якую чакалі балельшчыкі. Магла паўплываць гэтая судзейская памылка на вынік ці не, зараз пра гэта доўга можна разважаць. Справа ў тым, што пасля перапынку з лікам 2:1, Англіі, напэўна, трэба было перастроіцца. Праўда, тых хуткасцяў, якія ў матчы прапанавала зборная Германіі, англічане не вытрымалі. Падапечныя Лёва разбілі суперніка ў пух і прах. Маё меркаванне: абсалютна слабае звяно англічан — варатары. Гэта стала зразумела яшчэ ў першым матчы супраць амерыканцаў, калі здарыўся гэты недарэчны гол.

Магчыма, не зусім карэктна так казаць пра калег па амплуа, тым не менш, падчас першага гола аборонца яўна стараўся заблакіраваць нападаючага, збіць яму хуткасць, каб на выхадзе згуляў варатар. А ён не згуляў на выхадзе: неяк нясмела пачаў выходзіць, і гэтага імгнення хапіла, каб забіць. Другі гол: была прадольная перадача, выйшлі на вугал варатарскай, і варатар паміж ног, стоячы ў варотах, прапусціў мяч. Трэці гол — яскравы прыклад гульні варатара. Калі наносіўся ўдар, было бачна, асабліва на паўторы, што варатар баіцца мяча, закрываецца рукамі, каб мяч не трапіў яму ў твар. У такой пазіцыі гэта грубейшая памылка. У мяне склалася ўражанне, што дэмаралізаваная была каманда ад гульні варатараю. Цяжка сабрацца, калі не бачыш перспектывы і ведаеш, што нават калі заб'еш, варатар усё роўна прапусціць. Адсюль і няўпэўненыя дзеянні ўсёй абароны.

— Зборная Англіі складзена лідарамі сваіх клубаў, гэта каманда, дзе ёсць Руні, Лэмпард, Джэрард, Тэры. Тым не менш, на мундыялі не знайшлося ніводнага гульца, здольнага павесці за сабой каманду...

— У адборачным цыкле каманда выглядала выдатна. А вось падвесці яе да фіналу ў Капэла не атрымалася. Руні выглядаў зусім не так, як у матчах за клуб. А вывесці гульцоў на пік — гэта таксама трэнерскае майстэрства. Складана меркаваць, што адбываецца ўнутры каманды, і чаму той ці іншы гулец на лаўцы запасных, але расчараванне ад зборнай Англіі відавочнае.

— Іншы ваш калега, нямецкі варатар Нойнер, пасля гульні прызнаўся, што бачыў, як мяч перасёк лінію варот, але не толькі не сказаў пра гэта арбітру, але і хутчэй працягнуў гульню, каб суддзя нічога не западозрыў...

— Я не ведаю ніводнага варатара ў свеце, які б падышоў і сказаў: ведаеце, мне толькі што забілі гол... Калі ацэньваць дзеянні Нойнера, то ў яго вялікія перспектывы, а пакуль ён гуляе з вялікімі памылкамі. Праўда, у пераломных момантах ён выручаў: шыкоўна зрэагаваў у адным з небяспечных момантаў, калі кончыкамі пальцаў адвёў мяч. Увогуле, на сёлетнім турніры многія варатары дапускаюць грубыя памылкі. Магчыма, справа ў мячы са змешчаным цэнтрам цяжкасці. Але з іншага боку, малавата варатары выручаюць. Нават складана сказаць, хто прэтэндуе на ролю лепшага ў гэтым амплуа на турніры. Зараз шмат да варатара патрабаванняў як да палявога гульца, але асноўныя функцыі ўсё ж такі — гэта гульня на выхадах, гульня на варотах, ўвод мяча і кіраўніцтва гульнёй. Калі выходзіць з гэтых крытэрыяў, ва ўсіх безліч памылак.

— Яшчэ адна яўная судзейская памылка — гол з афсайду зборнай Аргенціны. Што з суддзямі здарылася ў Афрыцы?

— Зразумела, вялікі псіхалагічны ціск на суддзяў на турнірах такога ўзроўню, і гэтыя памылкі — яго вынік. З іншага боку, гэта ж прафесіяналы, і такія памылкі проста незразумелыя. Мяч перасякае лінію варот на паўметра — як бакавы суддзя можа гэтага не бачыць? Як галоўны арбітр нічога не западозрыў? Не зусім зразумелая і рэакцыя англічан — нехта пабег крыху пагаварыць і ўсё. Трэба было больш актыўна «прэсаваць» суддзю.

— Першы гол Аргенціны з афсайду паўплываў на настрой зборнай Мексікі?

— Зборная Аргенціны выглядае даволі магутна. Паводзіны трэнерскага штабу, гульцоў, гэта агульная радасць пры ўзяцці варот гаворыць пра тое, што ўнутрана каманда зараз мабілізаваная да мяжы. Вядома, паўплываў гол на мексіканцаў, рэакцыя бывае ў гульцоў самая розная на такую памылку суддзі — ад дыскамфорту да панікі. Але відавочна, што аргенцінцы на парадак мацнейшыя за мексіканцаў.

— Пасля гэтага матчу зборная Аргенціны прымусіла казаць аб сабе як аб прагматычнай камандзе...

— Дык у Аргенціны адна лінія атакі чаго вартая! Там проста атамныя гульцы!

— Але напачатку турніру абарона прымушала моцна хвалявацца...

— Мяркую, яны прытрымліваюцца таго ж прынцыпу, што калісьці прапаведавала Бразілія: вы заб'еце, колькі зможаце, а мы — колькі захочам. Шмат галявых сітуацый яны ствараюць, праўда, не ўсе рэалізуюць. У камандзе вялікі выбар гульцоў. Сёння ў запасе Верон сядзіць, і гэта красамоўнае сведчанне глыбіні складу.

— Марадона не дазваляе сумнявацца ў сваёй трэнерскай прафпрыдатнасці, што таксама вельмі нечакана...

— Марадона, мяркую, у сваёй прафпрыдатнасці не сумняваецца, так яго паказваюць СМІ і калегі. Але канчатковую ўсяму адзнаку дасць вынік зборнай Аргенціны. Мяркую, што Аргенціна — адна з камандаў, якія будуць у тройцы лідараў. Перад турнірам я ўключаў яе у тройку. Праўда, дадаваў яшчэ адну з афрыканскіх камандаў.

— Ёй стала Гана, якая паўтарыла поспех Камеруна і Сенегала і выйшла ў 1/4...

— Сапраўды, многія чакалі сюрпрызу ад Афрыкі. Гана, на маю думку, можа абыграць у чвэрцьфінале Уругвай.

— З ліпеня нас чакае паўтор чвэрцьфіналу чатырохгадовай даўнасці: Аргенціна — Германія. Тады ў серыі пенальці больш пашчасціла немцам. Хто цяпер фаварыт?

— Вельмі важна, як у матчы спрацуюць варатары. І суддзі. Перавагу я б усё ж аддаў Аргенціне.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Прэм'ер-міністры Беларусі і Літвы адчынілі будаўнічы гіпермаркет

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі і прэм'ер-міністр Літвы Андрюс Кубілюс паўдзельнічалі ў адкрыцці будаўнічага гіпермаркета «Ома» ў Мінску, пабудаваным за кошт сродкаў беларускіх і літоўскіх інвестараў.

— Дзесяць месяцаў таму, калі мы сустракаліся са спадаром прэм'ер-міністрам Літвы ў Вільнюсе, мы прынялі рашэнне, што будзем актыўна спрыяць інвестыцыям Літвы ў Беларусь і наадварот, — сказаў Сяргей Сідорскі. — У гэтым гіпермаркеце больш за 260 беларускіх прадпрыемстваў сёння прадставілі сваю прадукцыю. Гэта гаворыць пра тое, што ўзровень будаўнічай галіны, будаўнічых прадпрыемстваў Беларусі канкурэнтны з іншымі вытворцамі. Мы экспартуем будаўнічую прадукцыю больш чым у 30 краін свету, наша прадукцыя сертыфікаваная ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі, і мы пастаўляем будматэрыялы не толькі ў краіны СНД, але і Еўрапейскага Саюза.

У сваю чаргу Андрюс Кубілюс падкрэсліў, што гэта не апошнія інвестыцыі літоўскіх бізнэсмэнаў у Беларусь і яны гатовыя стварацьтут новыя працоўныя месцы:

— Я ведаю, што нядаўна нашы літоўскія бізнэсмены мелі добрую сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам і засталіся вельмі задаволеныя ўражаннямі ад яе. Нашы вялікія кампаніі прыходзяць са сваімі інвестыцыямі, са сваімі тэхналогіямі, са сваім веданнем еўрапейскіх рынкаў, таму я думаю, што ад такога супрацоўніцтва выйграюць усе — і літоўскія бізнэсмены, і беларускі бізнэс, і простыя грамадзяне, — перакананы прэм'ер-міністр Літвы.

Ён жа выказаў упэўненасць, што планы па далейшым супрацоўніцтве не абмяжуюцца толькі інвестыцыямі ў гандаль, а працягнуцца ў такіх галінах, як транзіт і энергетыка, у тым ліку і атамная.

Сяргей Сідорскі таксама выказаў зацікаўленасць беларускага боку ў больш шырокім супрацоўніцтве:

— Мы, як незалежная дзяржава, доўгі час шукаем альтэрнатыўныя шляхі пастаўкі энергарэсурсаў у нашу краіну. Вы ведаеце, што ў апошні час мы вырашылі пытанне і завозім нафту з Венесуэлы, мы актыўна працуем з Іранам і маем усе шанцы сёлета пачаць там распрацоўку радовішча і дастаўляць нафту ў Беларусь. І яшчэ адным з напрамкаў энергетычнай стратэгіі Беларусі з'яўляецца будаўніцтва тэрмінала па разрэджванню газу. У нас ёсць 2-3 такія альтэрнатыўныя варыянты, але праект менавіта з літоўскімі калегамі нам цікавы таму, што ва ўрада Літвы ёсць такі ж праект, і мы можам аб'яднаць фінансавыя рэсурсы, каб у порце Клайпеды паставіць такі завод, — сказаў Сяргей Сідорскі і адзначыў, што больш падрабязна пра гэты праект яны пагавораць з прэм'ер-міністрам Літвы, але, на яго думку, праект павінен быць эфектыўным.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Здарэнні

ДЗЯЎЧЫНКА Ў ПАЛОНЕ РАШОТКІ

У Віцебску пяцігадовую дзяўчынку вызвалялі з палону металічнай рашоткі шахты ліўневай каналізацыі.

Малая выпадкова трапіла ў палон металу ўвечар, калі горад святкаваў Дзень нараджэння. Адзін з мінакоў патэлефанаваў выратавальнікам. Апошнія пры дапамозе спецыяльнага інструменту вызвалілі ножку дзяўчынкі. Пасля агляду медыка высветлілася, што шпіталізацыя ёй не патрэбна. Надзвычайнае здарэнне адбылося на праспекце Будаўнікоў.

Фота прэс-службы аблгаснага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КУЛЬБІТ З НАЕЗДАМ НА ДРЭВА

Днём на трасе Лельчыцы—Жыткавічы, каля вёскі Сімоніцкі Млынок Лельчыцкага раёна кіроўца аўтамабіля «Сітраен Ксара» не справіўся з кіраваннем.

Вынікам яго нечаканых рухаў на дарозе стаў з'езд у кювет і наезд на дрэва. Прычым задняй часткай машына зачапілася за ствол. У аўто акрамя кіроўцы знаходзіліся 18-гадовая дзяўчына і яе маці, якія змаглі самастойна выбрацца з пашкоджанай машыны. 45-гадовы вадзіцель аказаўся зацяснуты ў салоне. З палону «цыркача» пры дапамозе гідраўлічнага інструмента вымалі супрацоўнікі МНС. Яны ж здымалі з дрэва аўтамабіль. Мужчына атрымаў сур'ёзныя траўмы і зараз знаходзіцца на лячэнні ў Лельчыцкай раённай бальніцы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РУХ НА ПЕРАСЯЧЭННІ МКАД І ЛАГОЙСКАГА ТРАКТУ БЫЎ ПАРАЛІЗАВАНЫ ГРУЗАВІКОМ, ЯКІ ПЕРАКУЛІЎСЯ

Фота БЕЛТА.

На развязцы МКАД і Лагойскага тракту адбылася аварыя. Кіроўца аўтамабіля МАЗ, які перавозіў гравій, не справіўся з кіраваннем, у выніку аўтамабіль перакуліўся і на некалькі гадзін паралізаваў рух аўтатранспарту. У выніку аварыі кіроўцу з пераломам рукі даставілі ў бальніцу.

Нахабныя, злыя, у масках

Да 54-гадовага жыхара вёскі Знаменка Брэсцкага раёна ноччу ўварваліся рабаўнікі ў масках. Спачатку яны выбілі дзверы, потым збілі гаспадара і яго сужыцельку. Перавярнулі ўсё ў хаце ў пошуку грошай. Назаўтра міліцыяй былі затрыманы 21- і 22-гадовыя жыхары гэтай жа вёскі, якія ўжо маюць судзімасці.

А ў магазін вёскі Шчарчова Пружанскага раёна рабаўнік зайшоў сярод белага дня. Пагражаючы нажом прадаўцу, 30-гадовы зламыснік забраў бутэльку гарэлкі, закуску і цыгарэты. Але неўзабаве быў затрыманы нарадзмі міліцыі.

Яна СВЕТАВА.

Першая дапамога

15 спосабаў супакоіць страўнік

Праблемы са страваваннем — такая ж тыповая прыкмета лета, як спёка. І першае, што ў такіх выпадках прыходзіць у галаву, — «пэўна, з'еў што-небудзь не тое». Неабавязкова! Прычын кішэчных непрыемнасцяў мноства, пастарайцеся вызначыць сваю.

1. Пераелі агародніны і садавіны — магчыма, не вельмі спелых? Клятчатка, што ўтрымліваецца ў іх, стымулюе маторыку кішэчніка і паскарае яго работу, але пры гэтым ежа можа не паспяваць ператраўлівацца.

Парада. Заварыце гарбату з мятай, лісцем суніцы або ажыны альбо прыгатуйце настой кветак сухацвету (з разліку 2 ст. лыжкі на шклянку гатаванай вады — настойвайце на вадзяной лазні 30 хвілін, працадзіце і піце па 1/4 шклянкі 3 разы на дзень).

2. Вы вегетарыянец? Недахоп жывёльнага бялку часта правакуе кішэчнае расстройства.

Парада. Адмовіўшыся ад мяса, не забывайце пра альтэрнатыўныя крыніцы бялковай ежы — рыбу, яйкі, сыр, тварог і іншыя малочныя прадукты.

3. Злучылі ў страўніку несумяшчальныя рэчы? Не варта заядаць малочную кашу агурком, запіваць рыбу малаком — гэта раздражняе кішэчнік.

Парада. Паміж прыёмамі несумяшчальных прадуктаў пачакайце 4—6 гадзін.

4. Пілі малако? У многіх з узростам змяншаецца актыўнасць кішэчнага ферменту — лактазы, якая адказвае за засваенне малочнага цукру. Высветліце, на якія малочныя прадукты арганізм рэагуе дыярэяй, і выключыце іх з меню. Як правіла, забарона не распаўсюджваецца на кісламалочныя прадукты — ёгурт, кефір, сыр.

Парада. Уздзейнічайце на пункты, якія нармалізуюць страваванне. Яны размешчаны злева і справа ад пупка на адлегласці двух вялікіх пальцаў, калі прыкласці іх вертыкальна. Размінайце гэтыя пункты адначасова кончыкамі ўказальнага і сярэдняга пальцаў, інтэнсіўна націскаючы і робячы хуткія вярчальныя рухі, 2-3 хвіліны.

5. Ужывалі ежу, якая раздражняе кішэчнік? Вострыя прадукты (марынаваная агародніна, саленні), спецыі, радыска, хрэн, перац, піва, спіртныя напоі, моцная гарбата і кава, таматны і апельсінавы сокі, аспірын і некаторыя іншыя лекі правакуюць расстройства жывата.

Парада. Устрымайцеся ад ежы на працягу 6—12 гадзін, піце шчолачную мінеральную ваду, папярэдне выпусціўшы з яе газ.

6. Не любіце кефір і ёгурт? Недахоп малочнакіслых бактэрый у кішэчніку разладжвае страваванне.

Парада. Штодзень ешце што-небудзь з кісламалочных прадуктаў на свой выбар. Толькі ўлічыце: свежы кефір аказвае паслабляльнае дзеянне, а калі ён пастаяў у халадзільніку больш за суткі — мае ўжо замацавальныя ўласцівасці.

7. Перанерваваліся або спалохаліся? Стрэс узмацняе перыстальтыку кішэчніка і тармозіць утварэнне стрававальных ферментаў. З-за гэтага пры спалоху і моцным хваляванні здараецца ўзрыўная дыярэя.

Парада. Налягайце на кефір і ёгурт — крыніцы лакта- і біфідабактэрый, якія гінуць пры стрэсе.

● Змяшайце пароўну кветкі рамонку, лісце мяты і корань валяр'яну. Заліце 1 ст. лыжку збору шклянкай кіпеню, настойвайце ў тэрмасе 30 хвілін. Прымайце па паўшклянкі 3 разы на дзень. Гэты збор асабліва карысны пры дыярэі з павышаным газаўтварэннем.

● Удыхайце водары гваздзікі, герані, імбіру, мускату, сандалу, шалфею. Яны заспакойваюць нервы і пазбаўляюць ад кішэчных непрыемнасцяў.

8. Жывот расстроіўся ў турпаездцы? Такое здараецца з-за незнаёмых страў і нязвыклага салявога складу вады.

Парада. Пастарайцеся не мяняць харчовых звычак (экзатычная ежа кішэчніку ў цяжар) і купляць тую ж мінеральную ваду, якую звычайна п'яце дома.

● Прыгатуйце настой з лупіны граната або зялёнага грэцкага арэха: 3 ст. лыжкі здробненай лупіны або 2 арэхі заліце 1,5 шклянкі гатаванай вады, вытрымайце 2 гадзіны пад накрыўкай у цёплым месцы і працадзіце. Выпіце настой за 3—4 прыёмы на працягу дня.

9. Аб'еліся? Празмернае расцяжэнне сценак страўніка ўключае рэфлекс, які прымушае кішэчнік паскорана пазбаўляцца ад змесціва. Многія з лёгкасцю кантралююць свой апетыт, але ёсць і тыя, у каго гэта не вельмі атрымліваецца.

Парада. Выпіце гарбату з мелісай, святаннікам і лыжачкай мёду, якая праганяе адчуванне голаду, — і адразу кладзіцеся адпачываць.

● Думкі ўвесь час круцяцца вакол ежы? Адасобіцца ад іх дапаможа 10-секундная расцяжка. Станьце тварам да сцяны, зрабіце ўдых і падыміце рукі ўверх. Марудна апусціце іх так, каб яны ўперліся ў вертыкальную паверхню. Не адрываючы далоняў, адыдзіце назад, наколькі магчыма. Зрабіце выдых, развядзіце пальцы, прыпадыміце таз і выгніце спіну. Захоўвайце гэта становішча 10 секундаў, усё больш напружваючы мышцы і павялічваючы амплітуду расцяжкі. Падыдзіце да апоры і апусціце рукі, цалкам расслабіўшыся. Паўтарыце некалькі разоў.

10. Займаліся на трэнажорах або бегавой дарожцы? Страта солі і вады з потам, актыўныя рухі — усё гэта паскарае праходжанне ежы па кішэчніку і нярэдка прыводзіць да дыярэі.

Парада. Перад наведваннем трэнажорнай залы не ўжывайце прадуктаў, багатых на клятчатку. Не ешце прыкладна 1,5-2 гадзіны да трэніроўкі. Піце мінеральную ваду. Абмяжоўвайце практыкаванні на кардыятрэнажоры, скачкі і бег — страсенне органаў брушной поласці ўзмацняе кішэчную перыстальтыку.

11. У вас крытычныя дні? Змяненне гарманальнага фону, якое спадарожнічае месячным, дзейнічае на кішэчнік як слабіцельнае. І можа ўзнікнуць дыярэя.

Парада. Налягайце на рысавую кашу і чарнічны кісель, а таксама фітакактэйль з чарніц ці чаромхі. Яго робяць так: 1—2 ч. лыжкі ягад заліце шклянкай кіпеню і награвайце 15 хвілін на вадзяной лазні, пакіньце ў цёплым месцы на 45 хвілін, працадзіце. Адвар гатуюць такім жа чынам, толькі награвайць 30 хвілін, а ахалоджваюць 10. Прымайце па паўшклянкі 2—3 разы на дзень.

● Запячыце ў духоўцы 3 буйныя яблыкі, аддзяліце лыжкай мякаць, пасыпце карыцай і ешце 3 разы на дзень на дзесерт. Пекцін, які ўтрымліваецца ў фруктовым пюрэ, дзейнічае як загушчальнік, а карыца супакойвае і змяншае ўтварэнне газаў.

12. Прынялі лекі ад пякоткі? Паводле трапнага выказвання аднаго амерыканскага гастраэнтэролага, «учарашняя пякотка часта змяняецца сённяшнім расстройствам жывата», асабліва калі вы ратуецеся ад яе таблеткамі, у склад якіх уваходзіць вокіс магнію — ён і выклікае дыярэю. Другая крайнасць — сродкі ад пякоткі на аснове алюмінію, якія прыводзяць да запору.

Парада. Папрасіце доктара выпісаць вам прэпарат ад пякоткі, які не ўтрымлівае магнію.

13. Атруціліся недабраякаснымі прадуктамі? Устрымайцеся ад ужывання ежы не менш як 24—36 гадзін, нават калі апетыт гучна заяўляе пра свае правы. Цяпер для страўніка спакой — лепшае лякарства. Калі тэрмін лячэбнага галадання закончыцца, пачынайце есці, але толькі вельмі маленькімі порцыямі, з перапынкамі кожныя 3—4 гадзіны. У першыя суткі абмяжуйцеся кефірам з падсушаным белым хлебам, вадкай рысавай або аўсянай кашай, звараная на вадзе. На другі дзень пераходзьце на малочныя кашы, яйкі ўсмятку, амлет.

Парада. Да поўнага вылячэння не захапляйцеся сырой агароднінай, садавіной і сокамі. Затое ваду піць можна ўдосталь! Мінімальная доза — шклянка цёплай гарбаты без цукру або гатаванай вады кожную гадзіну. І не залпам, а маленькімі глыткамі.

Прыслухайцеся да сябе — ці не хочацца вам чагосьці асаблівага?

● Пацягнула на салёнае? Разам з вадкасцю арганізм страчвае натрый і хлор. Растварыце чайную лыжку солі ў шклянцы гатаванай вады і піце.

● Марыце пра суп з агародніны? Яго есці пакуль нельга, але вось бульбяны або маркоўны адвар хутка адновяць запасы калію.

● Захацелася кампоту? Зварыце яго з курагі, разынак і бананаў, багатых на калій. Толькі цукар не дадавайце і самі фрукты ні ў якім разе не ешце.

14. У вас харчовая алергія? Некаторыя прадукты страчваюць алергеннасць падчас варкі, смажання, а таксама ў кампотах, соках, джэмах. Акрамя таго, свежыя агуркі, клубніцы і некаторая іншая агародніна, садавіна і ягады спачатку не праяўляюць алергенных уласцівасцяў, але варта ім паляжаць усяго 2—3 гадзіны — і дыярэя забяспечана!

Парада. Каб зразумець, на якую ежу вы рэагуеце, вядзіце харчовы дзённік, зрабіце аналізы — правакацыйныя пробы. Пасля іх можна будзе скласці дыету без алергенаў.

15. Прыхапіла жывот без бачных прычын? Часам дыярэя паказвае на зашлакаванасць арганізма. Гэта своеасаблівы спосаб ачысткі стрававальнай сістэмы ад шкодных «адходаў вытворчасці».

Парада. Дапамажыце прыродзе — выпіце за дзень 1,5-2 л зялёнай гарбаты, свежаадціснутых сокаў, кефіру або мінералкі і ўстрымайцеся ад ежы.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ТЭРМІНОВА ЗВЯРНІЦЕСЯ ДА ДОКТАРА, КАЛІ:

● нарастаюць прыкметы абязводжвання: вочы запалі, у роце перасохла, сліна стала вязкай і клейкай;

● дыярэя доўжыцца больш як 3-4 дні, даходзіць да 10 разоў у суткі і часцей;

● пажаўцелі бялкі вачэй і/ці скура;

● значна пагоршылася агульнае самаадчуванне (ламота ў целе, павышаная тэмпература, слабасць і галавакружэнне, паніжаны артэрыяльны ціск).

ДВУМА РАДКАМІ

Чарговым удзельнікам 1/4 фіналу стала зборная Нідэрландаў. З лікам 2:1 яна перамагла каманду Славакіі, крыўдзіцеляў намінальна пакуль яшчэ чэмпіёнаў свету, італьянцаў. Амаль без варыянтаў, што супернікамі галандцаў па чвэрцьфінале стануць бразільцы, якіх наўрад ці спыніць каманда Чылі.

БАТЭ падзяліла ачкі з «Партызанам»

А «Дынама» ўвогуле саступіла

Не трэба беларускім футбалістам глядзець чэмпіянат свету. Уразіўшыся афрыканскімі баталіямі і ўявіўшы сябе ці то італьянцамі, ці то французамі, а магчыма, і англічанамі, лідары нашага першынства пачалі губляць ачкі на роўным месцы. БАТЭ ўнічыю (1:1) згуляла з «Партызанам», які займае апошні радок у турнірнай табліцы. А сталічнае «Дынама» і ўвогуле саступіла Віцебску з лікам 1:3. І заняло трэці турнірны радок. На другі выйшаў «Мінск», які адолеў «Белшыну» з такім жа лікам — 3:1.

Вось вынікі астатніх сустрэч: «Днепр» (Магілёў) — «Шахцёр» (Салігорск) — 0:2, «Нафтан» (Наваполацк) — «Дынама» (Брэст) — 3:1, «Нёман» (Гродна) — «Тарпеда» (Жодзіна) — 0:0.

Турнірнае становішча: БАТЭ — 36 (мячы — 26-4), «Мінск» — 33 (31-14), «Дынама» (Мінск) — 33 (26-12), «Шахцёр» — 31 (24-11), «Белшына» — 28 (18-18), «Дынама» (Брэст) — 23 (24-19), «Днепр» — 22 (16-26), «Віцебск» — 18 (17-22), «Нафтан» — 17 (14-16), «Нёман» — 12 (10-22), «Тарпеда» — 10 (16-32), «Партызан» — 10 (7-33).

Алена КРАВЕЦ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность граждан и права аренды земельного участка в г. Браславе и Браславском районе

Организатор: РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

ЛОТ №	Вид аукциона	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер	Условия и ограничения, срок аренды Инженерно-геологические условия*	Расходы за документацию, руб.	Начальная цена, руб.
1	в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Пашевичи Межанского с/с Браславского р-на Витебской обл., пл. 0,1729 га, кадастровый № 220885611101000020	- водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос 0,1729 га (озеро Дрисвяты)	1 271 346	2 000 000
2		д. Масковичи (участок № 1) Слободковского с/с Браславского р-на Витебской обл., пл. 0,1454 га, кадастровый № 220888116601000022 (повторно)	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос 0,1454 га (озеро Недрово)	486 598	15 000 000
3		д. Верковщина (участок № 5) Слободковского с/с Браславского р-на Витебской обл., пл. 0,2486 га, кадастровый № 220888103601000028 (повторно)	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос 0,2486 га (река Друйка); - охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В 0,0187 га	492 680	5 000 000
4		д. Верковщина (участок № 6) Слободковского с/с Браславского р-на Витебской обл., пл. 0,2490 га, кадастровый № 220888103601000029 (повторно)	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос 0,2490 га (река Друйка); - охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В 0,0173 га	492 680	5 000 000
5	на право заключения договора аренды зем. уч-ка	Для строительства торгового объекта по ул. Октября в г. Браславе Витебской обл., пл. 0,0075 га, кадастровый № 220850100001002397	- срок аренды 5 лет	1 534 643	317 523

* инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания и сооружения на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры территории: возможность подключения к инженерным сетям.

1. Аукцион состоится **30 июля 2010 года в 11.00 по адресу: Витебская область, г. Браслав, ул. Советская, 119.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положениями, утвержденными Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие не менее двух участников. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Последний день приема заявлений и документов **26.07.2010 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников **30.07.2010 года с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

3. К участию допускаются по Лотам 1–4 – физ. лица (граждане Республики Беларусь), по Лоту 5 – физ. и юр. лица, подавшие документы в соответствии с п.4 настоящего извещения. Задаток за участие в аукционе составляет 10 % от начальной цены лота. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www

Май на ўвазе!

НУМАРАЛОГІЯ ГРОШАЙ!

«Па даходах і выдатках» — слушна заўважаюць адны. «Па выдатках і даходы» — смела сцвярджаюць іншыя. З пункту гледжання магіі жыцця і першыя, і другія маюць рацыю, праўда, кожны па-свойму. Грошы прыцягваюць да сабе або спараджаюць новыя грошы, і прымаўка «Грошы да грошай» вельмі праўдападобная. Аднак круглыя сумы зусім не сведчаць пра бязбеднае існаванне іх уладальніка, таксама як сціплы бюджэт зусім не паказвае на беднату.

Ёсць мастацтва зарабляць грошы, ёсць мастацтва іх марнаваць. Звычайна валоданне адным майстэрствам выключае поспехі ў іншай вобласці, а чалавек, які ўмела сумяшчае і тое, і другое, насамрэч банкір свайго жыцця.

Лічбы 1 і 0

У магіі лічбаў нуль, адзінка і двойка раўнасільныя і раўназначныя. Гэта цэлае, адзінае, усёабдымнае. Таму **гаворка пра адзінку раўнасільная гаворцы пра нуль, гэта значыць ні пра што**.

Лічба 2

Лічба «два» ў фінансавым сэнсе з'яўляецца знакам беднаты і эканоміі. Гэта лакмусавая паперка недахопу чагосьці. Лічба «два» — гэта яшчэ і пачуццё абавязку, неабходнасць дзяліць і дзяліцца, аддаваць і ахвяраваць.

Калі размова заходзіць пра грошы, трэба баяцца лічбы «два», як чорт ладану. **Пазычыць 20 (200 або 2000) — значыць, не мець гарантыі на вяртанне доўгу. Больш за тое, вашы кроўныя сыдуць у пазычальніка, нібы вада ў пясок: нічога не будзе набыта, але ўсё патрачана.** Калі вам выплацяць адну з названых сум, памятайце — гэта не грошы, а таямнскі конь. Пасля кароткачасовага поспеху марнымі апынуцца вашы чаканні. Абмяркоўваючы велічыню ўзнагароджання або зарплаты, пазбягайце вышэйпрыведзеных лічбаў. Хай абумоўленая сума будзе хоць на рубель больш або менш.

Ведайце, набытая за «падвойную» суму рэч, можа апынуцца непатрэбнай або расчаруе вас, калі вы наладзіце абнове хатнюю інспекцыю. Не варта трымаць грошы адначасова ў двух кашальках, кішэнях або слоіках: плакалі вашы грошыкі. Справа ў тым, што двойка — сінонім зману, махлярства і крадзяжу.

Лічба 3

Лічба «тры» дынамічная і адкрытая. Яна азначае ўзнікненне новай якасці, патэнцыю, пашырэнне малога да большага. Тройка нязменна сімвалізуе прыватную ініцыятыву, дзеянне, учынак, узнікненне новай сітуацыі. Тройка заўсёды паказвае на патэнцыйныя фінансавыя магчымасці і дадатковы заробак.

Тройка больш сведчыць пра рух капіталу і выдаткі, чым пра назапашванні, таму **вельмі цяжка адкласці на чорны дзень 30 (300 або 3000) якіх-небудзь у.е., хутка залезеце ў скарбонку і пачняце яе спусташаць. Затое такія сумы зручна пазычаць.** І не адзін раз, а тройчы. Бо па англійскай прыкмеце «у аднаго і таго ж знаёмага грошы пазычаюць да трох разоў». Яго Вялікасць Выпадак таксама вызначецца тройкай. Адгэтуль — «прасіў пра адно, а атрымаў утрая больш». Таму, калі вырашылі купіць латарэйны білет, бярыце адразу тры штукі. Так вы павялічваеце свае шанцы разоў у дзесяць.

За «траістую» суму рэкамендуецца здзяйсняць важныя ўчынкі, з тройкі можна пачынаць новую справу. Аднак надта спакушацца не варта. Лічба «тры» нярэдка намякае на рызыкоўнае камерцыйнае прадпрыемства. А таксама сведчыць аб легкадумным стаўленні да грошай або неадпаведнасці прыкладзеных намаганняў атрыманай узнагародзе.

Лічба 4

Лічба «чатыры» сімвалізуе стабільнае матэрыяльнае становішча, сярэдні дастатак, зарплату, пенсію, назапашванне на чорны дзень. Гэта прадказальнасць у фінансах, надзейнасць, а таму гарантыя на будучыню, заслужана зароблены ўласнай працай. Ад таго, **што вы адкладзяце 40 (400 або 4000) адзінак, грошы не знікнуць, расходаваць вы іх пачніце тады, калі вырашылі, і на тыя мэты, якія вызначылі загадзя.**

Чатыры — гэта сямейны бюджэт і працэнты з банкаўскіх укладаў, штодзённыя пакупкі і штомесячныя камунальныя выплаты, унёскі за набытае ў растэрміноўку. Яшчэ гэта знак разумнай эканоміі і магчымасць планавання бюджэту.

Чацвёра кампаньёнаў могуць весці надзейны бізнэс, калі даверяюць адзін аднаму. Але манну нябесную чакаць няварта. Усё давядзецца зарабляць уласным «гарбом». Чацвёрка — гэта стандартная сітуацыя, якая патрабуе стандартных рашэнняў. Ініцыятыва ў сферы чацвёркі караецца. Зарплаты ў аб'ёме 400 або 4000 плацяць спраўна, але павышэнне чакаць прыходзіцца доўга. Невялікія паступленні грошай з чатырох месцаў — ідэальны выпадак для тых, хто любіць жыць у дастатку і не любіць рызыкаваць. Лік «чатыры» можа азначаць рамкі, правілы, адсутнасць матэрыяльнага росту, нават застой у эканоміцы.

Лічба 5

Калі тройка проста створаная для фінансавых пачынанняў і заробкаў, чацвёрка — для захоўвання і назапашвання грашовых знакаў, то лічба «пяць» сігналізуе, што надышоў час з лёгкасцю грошыкі траціць або па-гаспадарску распарадзіцца заробленым. Гэта значыць, пяцёрка адначасова схіляе да выдаткаў і набыткаў, абяцае множанне капіталу ў будучыні, заклікае чалавека да доўгатэрміновага планавання. Як вядома, развіццё вытворчасці ў былым СССР ішло пяцігодкамі, і гэта не наша выдумка, а сусветная практыка, якая склалася ў эканоміцы.

Захоўваць у скарбонцы сумы 50, 500, 5000 ненатуральна: усё роўна хутка пачняце заначку распускаць. Затое пускаць гэтыя сумы на вецер (забаўкі, задавальненні) лёгка і прыемна. Шчыра кажучы, пяцёрка — сінонім марнатраўства. Таму такія сумы трэба браць у вандраванні, у адпачынак, у камандзіроўку, у рэстаран. «Пятакі пятакоў» прыемна марнаваць на падарункі каханым, на нешта рамантычнае і сардэчнае. З «пяцёркамі» можна пайсці на рызыку і выйграць, зрабіць унёсак і ўзяць добры куш. Запомніце, пяцёрка прыносіць шчасце ў грошах. І апошняе, усё існіце ў сваёй адпаведнасці і залежыць ад сітуацыі. Мы самі робім са сваіх пяці манет неразменную тысячу або закапаны ў зямлю скарб.

Лічба 6

Разумным сэнсам і наогул падлікамі грашовых знакаў кіруе лік «шэсць». Як толькі ў нашым фінансавым жыцці з'явілася шасцёрка, час зацягваць папружку тужэй.

Шэсць — гэта руцінныя перыядычныя і штодзённыя сумы. Напрыклад, на харчаванне, на рамонт абутку і адзежы, усе выплаты ў растэрміноўку і па камісійных.

Шэсць — гэта служба, праца ад званка да званка, штомесячная зарплата. Шасцёра працуюць і зарабляюць, а банкі не рабуюць. Вось і вам, калі ў калектыве або сям'і вас шасцёра, давядзецца працаваць і атрымліваць тое, што належыць, але не прыбытак і не манну нябесную. Шэсць — гэта самастойнасць у вызначаных сітуацыяй рамках, у фінансавай галіне — гэта пэўныя абмежаванні, з якімі, зрэшты, можна мірыцца. Чалавек робіць тое, што скажуць. Гэта сіла звычкі і адсутнасць прыватнай ініцыятывы і нават педантызм і фармалізм у выкананні абавязкаў. Чалавек шасцёркі не гаспадар становішча, але і не слуга сітуацыі, ён сам сваімі здольнасцямі, уласным розумам усяго дамагаецца.

Лічба 7

Сем — для грошай дрэнная, нават небяспечная лічба. Усё матэрыяльнае любіць стабільнасць, але не неспадзеўкі. А сямёрка стварае сітуацыі ў дачыненні жыцця, маёмасці і грошай, якія чалавеку не зразумелыя і не падуладныя.

Стабільнае, надзейнае жыццё на базе сямёркі не пабудуеш. Якое можа быць пры сямёрцы багацце? Адны клопаты і падманы.

Сем — гэта страты і набыцці па прычыне сутыкнення наіўных з нячыстымі на руку. Кампанія з сямі чалавек не падыходзіць для множання капіталу і мірнай працы. Іх дзейнасць неразлучная са злачынствамі, зманам, рызыкай, стратамі маёмасці і няшчасцямі для навакольных. Для сямёркі грошы — нікчэмны метал. **Сумы ў 70, 700, 7000 не захоўвайце, не давайце і не бярыце ў доўг, не кладзіце ў банк, не адпісвайце, не давярайце нікому і ніколі. Яны знікнуць або прынясуць няшчасці.** Адно толькі выключэнне тут ёсць — калі грашыма смецяць у гульнёвых установах. Аднак памятайце, «777» прыносіць прыбытак толькі ўладальнікам казіно, а не яго наведвальнікам. Сем — гэта галеча, беднасць на мяжы безвыходнасці.

Пераходзячы на глебу магіі, можна сказаць: у сямёрцы закладзена супрацьдзеянне матэрыяльнаму свету. Здабыткі яе не матэрыяльныя, а духоўныя, а страты — сігнал для ўнутраных зменаў і духоўнага развіцця. Лічба «сем» — гэта ілюзія надзейнасці матэрыяльнага становішча і таму нашых дарэмных меркантыльных намераў і намаганняў. Гэта эфемернасць уладання чымсьці ў параўнанні з выпадковасцямі лёсу і воляй року. Сямёрка — гэта перавага духоўнага над матэрыяльным, веры над рэччу, ідэяй над рэальнасцю. Не бойцеся сямёркі, але паважайце яе.

Лічба 8

Восем — гэта вечны рух грошай і маёмасці, ваганні вакол нейкай усталяванай грамадствам і рынкам велічыні. Васьмёрка кажа пра грашовыя паступленні з розных крыніц і таксама выдаткі па сэнсе. Грошы як вада, кажуць у гэтых выпадках. Будзеш паспяваць за колам фартуны —здабудзеш багацце, спознішся — застанешся на бабах.

Таму восем — гэта паказчыкі фінансавай актыўнасці, тэндэнцыя росту і падзення, гульня на панежэнне і павышэнне. Гэта продаж і купля, імпарт і экспарт, прыбытак і страта, завяршчанні і спадчына, чужыя грошы і абавязкі. Гэта тое, што залежыць ад палітыкі коштаў, макраэканамічных паказчыкаў. Гэта інвестыцыі, валютныя аперацыі, адсоткі, курс валют і акцый. Для васьмёркі грошы — гэта тавар, а тавар — гэта грошы.

Восем можа апошняга пазбавіць або грашыма закідае, калі не вельмі і хацелася. **Калі надумаеце купіць акцыі — вазьміце восем штук, а яшчэ лепш восем розных акцый.** Яшчэ ведайце: восем чалавек — гэта ўжо не кірмаш, а рынак. І галоўнае, што датычыцца грошай: «не палічыўшы, не гавары «восем», гэта значыць, не спяшайся.

Восем — гэты лічба і раскошы, і ўмеранасці, і пастаянных фінансавых зменаў. Калі матэрыяльным бокам вашага жыцця пачынае кіраваць васьмёрка, тут толькі два шляхі. Або стаць у пытаннях фінансаў прафесіяналам. Або лічыць да васьмі, як ужо гаварылася. І не баяцца знайсці, і не баяцца страціць, таму што жыццё — гульня, і гульня калектыўная. У ёй ёсць стаўкі і правілы. Пераможаныя і пераможцы. Мы ўсе ў абавязку адзін у аднаго, а пакуль гульня працягваецца, з голаду ніхто не памрэ.

Лічба 9

Дзевяць да грошай і дабрабыту мае дачыненне невялікае. Хутчэй, яна сведчыць пра адсутнасць грошай або страту цікавасці да фінансавых праблем. Гэта своеасаблівы вынік, дасягненні, сітуацыя, дзе карысць ад багацця ўжо невідавочная. Дзявятка надзяляе чалавека мудрасцю, дае разуменне таго, што не ў грошах шчасце.

Наўрад ці можна параіць аперавать сумамі ў 9, 90, 900 і 9000. Ініцыятывы і жадання зарабіць у партнёраў, якія згадваюць такія сумы, па праўдзе кажучы, няма ніякай. Таму трымайцеся ад такіх бізнэсменаў далей. Аднак прыведзеныя вышэй сумы можна дарыць, пускаць на куплю твораў мастацтва і ўкладваць у культурныя праекты. Яшчэ «дзявяткі» добра ахвяраваць на дабрачыннасць.

Лічба 10

Гаварыць пра лічбу «дзесяць» значыць казаць ні пра што. У магічным сэнсе дзясяткі не існуе, гэта катэгорыя матэматычная. І парад магічных даць адносна дзясяткі нельга. Што сто, што тысяча — усё адно. **Дзесяць — гэта тая ж адзінка, але часта — нашмат горшая за яе.**

Падпіска-2010

Тэлевізар ад «Звязды» — на вяселле дачкі

Менавіта такі прыемны сюрпрыз, але ўжо не таямнічы, зробяць сваёй дачцэ Таццяне нашы падпісчыкі Марыя Іванаўна і Барыс Іванавіч Багелі з Наваполацка.

— Відавочна, што гэта лёс, — сказала журналісту «Звязды» Марыя Багель. — Колькі гадоў у сям'і падпісваліся на газету, але ж неяк не шанцавала на падарункі. А тут вырашылі, што трэба яшчэ раз пасласць картку, на ўдачу. А раптам пашанцуе?!

І ўдача на гэты раз не адвярнулася ад навапалачан. Нават адразу не паверылі, прызнаўся гаспадар, але ж калі прыйшло афіцыйнае паведамленне, што «вы выйгралі», зразумелі — гэта праўда.

Падарунак для сваёй дачкі ў выглядзе тэлевізара «Віцязь» ужо «падрыхтавалі» Барыс Іванавіч і Марыя Іванаўна БАГЕЛІ з Наваполацка.

Вырашаць лёс каляровага тэлевізара «Віцязь» доўга не давялося. На жнівень гэтага года, сказалі ў адзін голас шчасліўчыкі, плануецца важная падзея ў жыцці дачкі Таццяны, якая жыве ў Мінску. І падарунак не трэба шукаць, пажартавалі яны.

Павіншаваць з удачай сваіх землякоў выйшла і начальнік Наваполацкага вузла паштовай сувязі Алена Клімовіч і начальнік гарадскога АПС № 6 Людміла Курневіч. У дадатак рэдакцыя газеты прэзентавала паштамту, дзе адбылося ўрачыстае ўручэнне тэлевізара, фірменны гадзіннік, каб ён заўсёды дакладна паказваў добры час.

Фірмовы гадзіннік ад «Звязды» атрымала начальнік АПС-6 г. Наваполацка Людміла Паўлаўна КУРНЕВІЧ.

«Звязда» ж далучаецца да самых лепшых пажаданняў бацькоў і спадзяецца, што колькасць падпісчыкаў у беларускай сталіцы пасля вяселля вырасце як мінімум на аднаго чалавека.

Такі ж цудоўны прыз атрымала з рук звяздоўцаў і жыхарка вёскі Жажэлка Смалявіцкага раёна, што на Міншчыне,Таццяна Баркоўская, адкуль і пачынаўся наш апошні ў гэтым квартале выезд «у людзі». Таццяна Міхайлаўна бы па сакрэце паведаміла, што ўжо даволі доўгі час яна жыла без тэлевізара. І ўжо збіралася купляць «блакітны экран». Але ж у яе планы «ўмяшаліся» вынікі звяздоўскай латарэі. У тым, што прыз будзе дастаўлены па месцы пражывання падпісчыцы, яна ведала. Тым не менш у душы думала: калі ж гэта адбудзецца?

Раздзяліць радасць сваёй землячкі ўзяліся начальнік мясцовага раённага вузла паштовай сувязі Алена Свянціцкая і начальнік аддзела ідэалагічнай работы Смалявіцкага райвыканкама Павел Графутко.

На Смалявіцкім РВПС звяздоўскую падпісчыцу Таццяну БАРКОЎСКУЮ (у цэнтры) з каштоўным прызам віншуюць начальнік вузла паштовай сувязі Алена СВЯНЦІЦКАЯ і кіраўнік адзела ідэалогіі Смалявіцкага райвыканкама Павел ГРАФУТКО.

Такой жа прадстаўнічай «у падтрымку» атрымалася кампанія на Барысаўскім паштовым вузле сувязі № 8. Нашу падпісчыцу «са стажам» Аляксандру Іванаўну Няхайчык, якая выйграла DVD-прайгравальнік, прыйшлі павіншаваць кіраўнік ідэалагічнага аддзела Барысаўскага райвыканкама Людміла Гарнак і намеснік начальніка Барысаўскага РВПС Людміла Кавалёнак. А прыз на правах гаспадыні ўручыла начальнік мясцовага аддзялення Людміла Сыцік.

Апошні візіт умясціў у сябе яшчэ шмат сустрэч на Міншчыне і Віцебшчыне. Мы з задавальненнем павіншавалі нашых прызёраў з Глыбочыны — Святлану Пашковіч з вёскі Кішы, якая выйграла электрачайнік, і карэнную жыхарку горада Лілію Субач — ёй дастаўся DVD-прайгравальнік.

Усюды ж па вялікім маршруце мы пранеслі добры настрой і аптымізм у тое, што трэба верыць у лепшае і ўмець знаходзіць выйсце з любых сітуацый. А памочнікам у гэтай справе якраз і можа стаць найстарэйшае беларускамоўнае выданне пад назвай «Звязда».

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Мінск—Смалявічы—Жодзіна—Барысаў—Докшыцы—Глыбокае—Шаркаўшчына—Мёры—Наваполацк—Полацк—Шуміліна—Гарадок—Віцебск—Мінск.

У складзе цёплай кампаніі атрымала свой прыз жыхарка Барысава Аляксандра Іванаўна НЯХАЙЧЫК. Падтрымаць зямлячку вырашылі начальнік аддзела ідэалогіі Барысаўскага райвыканкама Людміла ГАРНАК, начальнік АПС-8 Людміла СЫЦІК (злева направа) і намеснік Барысаўскага РВПС Людміла КАВАЛЁНАК (справа).

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ
на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

№ лота	Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства: Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер/ срок аренды/арендодатель	Целевое назначение земельного участка	Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений	Условия предоставления земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1.	Брестская область, Малоритский район, 0,3 км северо-восточнее д. Луково на озере Луковское/ кадастровый номер 125200000001000445/ площадь 0,9600 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Малоритский райисполком, тел. 8(01651) 2 30 17	Для строительства базы отдыха на 18 мест на озере Луковском	Территория участка на 0,29 га покрыта лесом, 0,40 га – пески, 0,27 га – древесно-кустарниковая растительность. Участок расположен в водоохранной зоне и прибрежной полосе оз. Луковского и имеет ограничения в использовании земель: в водоохранной зоне на площади 0,61 га, прибрежной полосе на 0,35 га, санитарно-защитной полосе водоотвода на площади 0,10 га соответственно. Подъезд к участку с автодороги Луково–Заболотье (участок находится в придорожной полосе автодороги Н-745 Луково (от а/д М-12)–Новое Заболотье (4 категория)	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. Победителю аукциона строительство необходимо осуществлять на условиях: - строительство базы выполнить на расстоянии не менее 50,0 м от бровки земляного полотна автодороги до линии застройки; съезд к застройке выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 (02250) «Автомобильные дороги» раздел 6 с устройством покрытия согласно п.6.1.14.(как для главной дороги 4 тех. категории); при необходимости снабжения базы отдыха электричеством и связью строительство воздушной линии электроснабжения выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 «Автомобильные дороги» п.6.4., при переходе автодороги учесть дополнительную высоту насыпи 0,5 м и прокладку кабеля связи вдоль дорог производить за пределами полосы отвода на расстоянии не менее 14,0 м от оси а/д 4 категории; в населенных пунктах не менее 1,0 м от наружной бровки кювета, подошвы насыпи дороги или, в случае, когда отсутствует земляное полотно, тротуары – не менее 1,5 м от бортового камня улицы, дороги (укрепленные полосы обочины, кромки проезжай части) (согласно таб.9.1 СНБ 3.03.02-97 «Улицы и дороги городов, поселков и сельских населенных пунктов»), переходы через а/д выполнять закрытым способом с устройством защитного футляра на глубину не менее 1,4 м от верха покрытия проезжей части до верхней образующей футляра; проект в обязательном порядке согласовать с ДРСУ № 179; - места производства работ оградить дорожными знаками и схему их расстановки согласовать с ГАИ Малоритского РОВД; - за три дня до начала работ письменно известить ДРСУ № 179 (г. Малорита, ул. Советская, д. 134, тел./ф. 2 02 71, 2 36 02) о дате начала и окончания работ; после окончания работ в течение 1-го дня привести в порядок придорожную полосу и сдать по акту ДРСУ № 179	19 120 220	1 912 020
2.	Брестская область, Пружанский район, на 7 км справа автомобильной дороги Р-101 Пружаны–Береза/ кадастровый номер 125600000001000452/ площадь 0,1298/ срок аренды 20 лет/ арендодатель – Пружанский райисполком тел. 8(01632) 7 10 93	Для строительства площадки отдыха	Участок покрыт лесом. Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,026 га	право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией древесины, получаемой от вырубки, ГЛУ «Пружанский лесхоз» в установленном порядке; внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Пружанским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку проектной документации на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	2 053 290	205 320
3	Брестская область, Столинский район, 110, 650 км автодороги Р-88 Житковичи–Давид-Городок–граница Украины/ кадастровый номер 125800000001000072/ площадь 0,0375 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Столинский райисполком тел. 8(01655) 2 26 09	Под строительство объекта придорожного сервиса (пункт питания)	Участок свободен от строений и сооружений. На земельном участке имеются ограничения в использовании земель в охранной зоне линии электропередачи напряжением 110 кВт и водоохранной зоне реки Сырец на площади 0,0375 га	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; возмещение убытков в сумме 23210 рублей, причиненных ОАО «Горынский агрокомбинат» изъятием земельного участка; заключение победителем аукциона со Столинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снятие плодородного слоя почвы и использование его для улучшения малопродуктивных земель ОАО «Горынский агрокомбинат».	116 640	11 660
4	Брестская область, Ивановский район, Мотольский с/с, 5.2 км северо-западнее дер. Мотоль (восточный берег водохранилища «Жидинье»)/ Кадастровый номер 123084505601001120/ площадь 0,6240 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Ивановский райисполком тел. 8(01652) 2 13 69	Под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест	Участок пустует, посадка леса не производилась, граница земельного участка проходит по суходолу. Подъезд к участку будет осуществляться по существующей дорожной сети СПК «Агро-Мотоль». Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне водохранилища «Жидинье» на площади 0,6240 га	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; заключение победителем аукциона с Ивановским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Ивановского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	20 062 450	2 006 240
5	Брестская область, Ивацевичский район, 479 (лево) на автодороге Р-43 граница РФ–Кричев–Бобруйск–Ивацевичи/ кадастровый номер 123400000001000747/ площадь 1,4979 га / срок аренды 99 лет/ арендодатель – Ивацевичский районный исполнительный комитет, тел. 8(01645) 2 13 69	Под строительство объекта придорожного сервиса (автомобильной заправочной станции, станции технического обслуживания, пункта питания, пункта постоя и охраняемой стоянки)	Участок покрыт лесом. РУП «Белтелеком» на площади 0,0804 га заняты транспортными коммуникациями (подземная кабельная линия связи). Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи и радиофикации на площади 0,0804 га	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; возмещение убытков в сумме 7984,03 тыс. руб., причиненных ГЛУ «Барановичский лесхоз» изъятием земельного участка; права вырубки деревьев и реализации древесины ГЛУ «Барановичский лесхоз» в установленном порядке; возмещение победителем аукциона в установленном порядке потерь лесохозяйственного производства в сумме 30412,8 тыс. руб., вызванных изъятием земельного участка площадью 0,6656 га (покрытие лесом) для использования его в целях, не связанных с ведением лесного хозяйства (строительство автозаправочной станции и охраняемой стоянки), перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет предприятия, код платежа 05202; заключение победителем аукциона с Ивацевичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снятие плодородного слоя почвы и использование его для благоустройства объекта.	3 642 050	364 200

Повторный аукцион состоится 23 июля 2010 года в 11.05 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в повторном аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели. Для участия в аукционе необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество», к заявлению на участие в повторном аукционе прилагаются документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 19 июля 2010 г. включительно;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; *представителем индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенная доверенность; *представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; *представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Порядок осмотра земельных участков осуществляется на местности по согласованию с арендодателем.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона для размещения объекта строительства: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка для размещения объекта строительства и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения повторного аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Заявления на участие в повторном аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням с 29 июня 2010 г. по 19 июля 2010 г. включительно.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже объектов республиканской собственности – капитального строения и права заключения договора аренды земельного участка, изолированного помещения

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение инв. № 421/С-1682, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский р-н, дер. Заболоть, ул. Ленина, д. 50, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 421381705652000060 площадью 0,0386 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 13 554 584 руб., сумма задатка – 1 355 000 руб.
Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества	Изолированное помещение инв. № 441/D-1136, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Трабы, ул. Советская, д. 35а-1
	Начальная цена предмета аукциона – 13 423 558 руб., сумма задатка – 1 342 000 руб.
Продавец недвижимого имущества: Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: (8 0152) 74 43 96, 74 43 92	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **12 июля 2010 года в 10.30** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 8 июля 2010 года до 16.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. **По лоту № 1:** Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

4. **По лоту № 2:** Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2 рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

5. **Подробная информация** – в извещении о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете «Звязда» **15 мая 2010 г. № 93 (26701).**

ТОРГ — СПРАВА ВЫСАКАРОДНАЯ

Беларуская ўніверсальная таварная біржа выводзіць гандаль на якасна новы ўзровень

Старшыня праўлення Аркадзь САЛІКАЎ.

Вядучы маклер аддзела таргоў металапрадукцыяй Сяргей КАРОЛЬ.

Паспрабуйце ўявіць самы буйны аптовы рынак, які не мае геаграфічных межаў і дзе ніхто — пры ўсім жаданні — не можа вас «кінуць», вашы выдаткі змяншаюцца, а выручка расце. І што самае прыемнае — апынуцца там можна, не пакідаючы ўтульнага крэсла і не выпускаючы з рук кубачак гарачай кавы. Фантазіі? Не, ўсё гэта абсалютна рэальна ўжо на працягу пяці гадоў! За гэты час (таргі на біржы пачаліся другога чэрвеня 2005 года) Беларуская ўніверсальная таварная біржа — адзіная ў гэтай нішы — трывала стала на ногі. Сёння яна зводзіць прадаўцоў і пакупнікоў метала-, леса-, сельгаспрадукцыі, а таксама прамысловых і спажывецкіх тавараў на адной пляцоўцы, фарміруючы канкурэнтную цану ў рэжыме рэальнага часу.

Такому рынку аддалі перавагу ўжо больш за сем тысяч суб'ектаў (у тым ліку паўтары тысячы нерэзідэнтаў з 47 дзяржаў — з блізкіх зямель Еўрасаюза і СНД, Амерыканскага кантынента і нават такіх далёкіх азіяцкіх краін, як Кітай ды Японія). Навічкоў адусюль з кожным годам становіцца адсоткаў на 30 больш. І іх няцяжка зразумець. Чаму?

ПЛЮСОЎ — ПОЎНА

+ вялікі асартымент і рэальная канкурэнцыя

На біржавыя таргі выстаўляецца больш як 200 найменняў тавараў высокай якасці ў адпаведнасці з дзяржаўнымі стандартамі. Вялікая колькасць прадаўцоў і пакупнікоў стварае атмасферу рэальнай канкурэнцыі, што дазваляе фарміраваць рэальныя цэны на тавары ў залежнасці ад сапраўднага попыту і прапановы.

+ нізкія зборы

За свае паслугі біржа бярэ толькі адзін плацеж — біржавы збор: 0,1 — 0,4 % ад сумы здзелкі (дакладны памер залежыць ад таварнай секцыі).

— У параўнанні з расцэнкамі на сусветных біржах гэта вельмі сціпла, — каментуе **старшыня праўлення Беларускай універсальнай таварнай біржы Аркадзь САЛІКАЎ.** — Калі паглядзець на вопыт іншых біржаў, з якімі мы трывала супрацоўнічаем, — скажам, на постсавецкай прасторы (казахстанскія, расійскія, украінскія) — то апроч біржавых збораў яны бяруць грошы таксама за акрэдытацыю і кансультаванне, навучанне і праграмнае забеспячэнне, выдачу каціровак і аналітычнай інфармацыі. Для нашых удзельнікаў усё гэта бясплатна.

+ мінімізацыя выдаткаў і дадатковая выручка

У крызіс як ніколі задумваешся пра эканомію... Напрыклад, Сяргей, уладальнік дробнай фірмы па рэалізацыі сродкаў гігіены, траціць каля мільёна рублёў у месяц на адны толькі тэлефонныя перамовы. Калі б ён гандляваў на біржы, гэтыя грошы (роўна як і час) можна было б зэканоміць: кантактаваць з усімі клiентамі адначасова і плаціць толькі за інтэрнэт-падключэнне. А ў месцы, дзе максімальна сыходзяцца попыт і прапанова, заўжды фарміруецца і рэальны канкурэнтны кошт. Значыць, у кожнага ёсць магчымасць прадаць ці набыць тавар з максімальнай выгадай.

Пры такім гандлі істотна спрашчаецца работа збытавых і забеспячэнскіх службаў, знікае неабходнасць у правядзенні тэндараў. Усё гэта адчувальныя палёгкі ў бізнэсе. Дадатковая выручка і сродкі, зэканомленыя беларускімі ўдзельнікамі біржы за мінулы год, ацэньваюцца больш як у 150 млрд рублёў (а сёлета за першыя пяць месяцаў яны ўжо перасягнулі 73 млрд). Разлік просты: вызначаецца выгадная для ўдзельнікаў розніца паміж стартавымі цэнамі і цэнамі заключэння здзелак за вылікам сум біржавога збору. Ды і само размяшчэнне заявак на біржы — гэта па сутнасці дадатковая бясплатная інтэрнэт-рэклама прадукцыі.

Аднак Сяргей чамусьці на біржу не спяшаецца.

— Знайсці пакупніка не праблема, я даўно на рынку. Попыт і прапанова ўжо даўно зведзеныя. Праблема ў тым, як «стрэсці» з кліента грошы за свой жа тавар, — дзеліцца з намі бізнэсовец. — А біржа тут наўрад ці дапаможа...

Спяшаемся запярэчыць.

+ бяспека здзелак

Біржа якраз дае дадатковыя гарантыі:

— Акрэдытацыя на біржы дае права на ўдзел у таргах, скажу больш, гэта сведчанне таго, што фірма ўжо праверэная нашай службай бяспекі, — запэўнівае А. Салікаў. — І нават калі адбудзецца нейкая непрадбачаная сітуацыя, мы сваімі рычагамі паўздзейнічаем на яе выпраўленне. У нас для гэтага ёсць аддзел кантролю за выкананнем біржавых здзелак. Ну а калі і так не атрымліваецца лакалізаваць спрэчку, за справу бярэцца наша Арбітражная камісія. Яе рашэнні маюць такую ж юрыдычную моц, як і прынятыя гаспадарчым судом, а часу на ўладкаванне ўсіх пытанняў патрабуецца значна менш. Дастаткова толькі ўключыць у біржавы дагавор адпаведную арбітражную агаворку.

Такіх захадаў ад біржы вымагае само жыццё: у Беларусі тавары часта прадаюцца з адтэрміноўкай плацяжу, што ў прынцыпе не характэрна для біржавога гандлю і стварае дадатковыя рызыкі.

— Наша служба бяспекі стаіць на стражы інтарэсаў айчынных прадпрыемстваў і адсочвае, каб іх супрацоўнікі не набывалі тавар на нявыгадных умовах, — адзначае старшыня праўлення біржы. — Калі выбар адбыўся не на карысць самай выгаднай прапановы, мы звяртаемся па тлумачэнні: прычыны ж могуць быць розныя — напрыклад, у таннейшых прапаноў большыя тэрміны пастаўкі, а прадпрыемству, скажам, трубы патрэбныя заўтра. Калі ж абгрунтаванняў мы не атрымліваем, паведамляем кіраўніцтву і ў выпадку чаго можам нават ануляваць такую здзелку.

+ перманентнае ўдасканаленне

Тут безупынна працуюць над паляпшэннем тэхнічных магчымасцяў, якасці біржавога абслугоўвання. Аднак і даведаўшыся пра гарантыі бяспекі здзелак, міжэрную верагоднасць тэхнічных збояў, дробны бізнэсовец Сяргей не пашыбаваў акрэдытоўвацца ў сістэме:

— Мой тавар — увогуле не біржавы, што мне там рабіць?! — дзівіцца ён.

У зале таргоў.

Праз некалькі хвілін зала запоўніцца і пачнуцца новыя таргі. Зараз тут усё падрыхтавана да працы.

Але ж хто сказаў, што тут нельга гандляваць іншым таварам, які не з'яўляецца біржавым у класічным разуменні? Такія магчымасці дае сістэма электронных **таргоў прамысловымі і спажывецкімі таварамі!** Заяўка, якую размяшчае прадавец, аналагічная лоту ў біржавой сесіі. Яна змяшчае характарыстыкі тавару, яго фотавыяву. Бойкі гандаль ідзе тут круглыя суткі (у адрозненне ад біржавых таргоў, што праходзяць у вызначаны час) — без выхадных і перапынкаў — у рэжыме он-лайн. Біржавы збор — усяго 0,1 % ад сумы здзелкі, і толькі з прадаўца. Найбольшыя поспехі тут — у мясакамбінатаў Гродзеншчыны. Кошт, здараецца, вырастае на 78 % ад першапачаткова заяўленага пакупніком. Увогуле ж на новым пакуль электронным рынку (яму ўсяго год) засвяцілася ўжо амаль 500 арганізацый, заключана больш за 400 здзелак на суму звыш 5 млрд рублёў.

— Па сутнасці гэта база для агульнай сістэмы электроннага гандлю ў краіне, — аналізуе кіраўнік біржы. — Яна ў перспектыве павінна стаць універсальнай тавараправаднай сістэмай дзяржавы, якая ў любы пункт зямнога шара можа даставіць камерцыйную прапанову, бо ідзе далей за наяўныя сістэмы кшталту b2b, дзе можна толькі азнаёміцца з гандлёвымі прапановамі. Тут жа ёсць магчымасць а айчынныя вытворцы — пра такую зручную форму рэалізацыі.

Апаненты могуць пацікавіцца — а як жа набываць тавар, не памацаўшы? І будуць мець рацыю...

— Такі гандаль зацікавіць перш за ўсё тых, хто ведае беларускі рынак — вытворцаў і якасць іх тавару. Здзелка гэтак жа, як і падчас біржавой сесіі, фіксуецца ў нашай сістэме, мы яе бяром у суправаджэнне, павышаем бяспеку. Няхай няшпарка, але ўсё ж набірае абароты гэты гандаль.

Пакрысе ўкараняюцца і новыя біржавыя інструменты. Такія, як тэрміновы таварны рынак.

— Там, у адрозненне ад спотавага рынку, абарочваюцца не ўласна тавары, а кантракты з пастаўкай у будучыні — іх яшчэ называюць ф'ючэрсы, — тлумачыць Аркадзь Салікаў. — Сусветныя біржы цяпер працуюць пераважна на тэрміновым рынку. А для нашай эканомікі гэта ў навіну. Мы ўсведамляем, што ўкараніць яго будзе няпроста. Нас чакае сур'ёзная работа.

Аднак нагода для аптымізму ёсць. Патэнцыйна да беларускага сегменту ўжо праяўляюць цікавасць найбуйнейшыя біржы свету — нямецкая Eurex і шведская NASDAQ OMX. Ідуць перамовы аб супрацоўніцтве ў гэтым кірунку з Беларускай валютна-фондавай біржай.

+ няўхільнае пашырэнне

Беларуская ўніверсальная таварная біржа пастаянна нарошчвае як пералік гандлюемых тавараў (напрыклад, такая навінка ў таварных пазіцыях, як папера, вельмі хутка набыла папулярнасць і карыстаецца велізарным попытам, у прыватнасці, з боку Міністэрства інфармацыі), кліенцкую базу, так і тавараправодную сетку. Філіялы біржы працуюць ва ўсіх абласных цэнтрах, што павінна ўзбадзёрыць куплю-продаж у рэгіёнах. Нядаўна адкрылася прадстаўніцтва ў Маскве (арыентаванае найперш на гандаль прамысловымі і спажывецкімі таварамі). Да канца года наш таварны рынак «прапішацца» таксама ў Вільнюсе і Кіеве. Тамтэйшыя бізнэсоўцы — адны з самых актыўных замежных удзельнікаў Беларускай універсальнай таварнай біржы. А яшчэ яна стане базай для стварэння Еўразійскай біржы сельгаспрадукцыі. Што асабліва актуальна на фоне стварэння Мытнага саюза. Першыя таргі на Еўразійскай біржы могуць адбыцца ўжо налета.

+ суправаджэнне «пад ключ»

— Наш падыход — максімальны комплекс паслуг для ўдзельнікаў, — адзначае кіраўнік біржы. — Каб пакупнік і прадавец, здзейсніўшы ў нас здзелку, маглі звярнуцца па сутнасці ў біржавое «адно акно» і ўсе свае праблемы вырашыць, мы развіваем лагістычныя, экспедытарскія, транспартныя, інфармацыйныя ды іншыя паслугі. Неабходная экспертыза тавару — калі ласка, захоўванне — таксама. Карацей, усё ў комплексе.

+ празрыстасць эканамічных адносінаў, канкурэнцыя ў жывым выглядзе. Карысць відавочная і для бізнэсоўцаў, і для дзяржавы ў цэлым.

ЦІ ЁСЦЬ МІНУСЫ?

Апошні згаданы плюс у вачах сякіх-такіх дзялкоў абарочваецца мінусам. Тыя, каму ёсць што хаваць, не хочуць «абяляць» свае здзелкі.

— Праціўнікаў гэтай тэхналогіі нібыта няма, проста некаторыя прадпрымальнікі не хочуць, каб бачылі, каму яны прадаюць і па якой цане, — канстатуе старшыня праўлення Беларускай універсальнай таварнай біржы. — Аднак думаю, што гэта толькі пытанне часу — павінна ўсё неяк прыцерціся ў свядомасці. Ну і нам варта праводзіць актыўную работу, каб прасоўваць гэту ідэю, працаваць пастаянна над удасканаленнем, устараненнем шурпатасцяў, шукаць новыя падыходы. Мы гэтым займаемся ўшчыльную.

А што кажуць тыя, хто ўжо даўно і паспяхова таргуецца на біржы?

НАРАКАННЯЎ НЯМА

Атмасфера таргоў заўжды ўяўлялася мне такой, як у... рэкламе дэзадаранта. Памятаеце? Шум, гам, таўханіна і лямант брокераў, з якіх сышло сем патоў. Таму так нечакана ў рэальнасці пабачыць прасторную залу, дзе «шум» ствараюць хіба што камп'ютары, а брокеры спакойна папіваюць вадзічку, нязмушана распараджаючыся мільярдамі адным націсканнем кнопкі. Бітва за самую выгадную прапанову даўно сышла ў віртуальную рэальнасць, стала больш вытанчанай і тэхналагічнай. Барацьба за пакупніка ці прадаўца (у залежнасці ад таго, што пераважае — прапанова ці попыт) ідзе на нябачным фронце, у сэнсе, бачным толькі на экране камп'ютара: скупыя радкі на дысплеі эмоцый не перадаюць, усе яны застаюцца ўсярэдзіне. Гонка сустрэчных заявак, якую назіраюць на тысячах маніторaў, стварае насамрэч нежартаўлівую канкурэнцыю і напружанасць. Удзельнікі працуюць на зніжэнне цаны, змяненне ўмоў пастаўкі ці атрыманне адтэрміноўкі. Інструментаў хапае, усё залежыць ад таго, наколькі актыўна і мудра імі карыстацца. І галоўнае ў такой рабоце зусім не азарт, як можа здацца на першы погляд...

— Каб знайсці самую цікавую і прывабную пазіцыю, патрэбныя толькі час і цярпенне, — дзеліцца з намі **Уладзімір Кулакоў, прадстаўнік прадпрыемства «Алькомп»**, якое працуе тут у дзвюх іпастасях — як наведвальнік таргоў і біржавы брокер, выстаўляе на продаж металапракат, аказвае паслугі прадпрыемствам па куплі і продажы.

— Вельмі вялікі плюс біржы — у тым, што за адны таргі можна набыць фактычна ўвесь неабходны тавар на месяцы наперад, — ахвотна дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі «знутры» У. Кулакоў. — Возьмем той жа металапракат: бачыце, ёсць усё — ад арматуры да шасцігранніка — практычна ў любых аб'ёмах, — паказвае мне безліч пазіцый на экране брокер. — Самая балючая праблема — неплацяжы прадпрыемстваў-спажыўцоў. На шчасце, такія выпадкі нячастыя. Я са сваімі кліентамі вырашаю вельмі жорстка: першапачаткова папярэджваю: калі будуць неплацяжы — пераводжу іх на 100-працэнтную перадаплату. Часцей за ўсё атрымліваецца дамовіцца мірным шляхам. Мінусы былі раней: даводзілася сутыкацца з некарэктнымі заяўкамі, напрыклад, калі прадпрыемствы выстаўлялі на продаж металапракат, якога няма на складзе. Аднак біржавая служба бяспекі працуе зладжана, так што цяпер нараканняў няма!

На біржы, як нідзе, усведамляеш, што час — сапраўды грошы. Пакуль мы гутарылі з Уладзімірам, столькі мільёнаў набегла: за няпоўных 20 хвілін заключана некалькі сотняў здзелак! А за паўтары-дзве гадзіны, што доўжыцца сесія (залежыць ад інтэнсіўнасці таргоў, колькасці прадаўцоў і пакупнікоў), абарочваецца — вы толькі ўявіце — да 10—12 мільярдаў рублёў.

Дарэчы, кожны дзень на біржы праходзіць пяць-сем гандлёвых сесій па ўсіх таварных секцыях. У сярэднім за тыдзень заключаецца да чатырох тысяч здзелак на суму да 150 мільярдаў рублёў. А з пачатку 2010 года заключана ўжо каля 80 тысяч здзелак на суму больш за 1500 мільярдаў рублёў.

Вынікі дзейнасці біржы за мінулыя пяць гадоў уражваюць яшчэ больш. За гэты час праведзена 3510 гандлёвых сесій, заключана 501 355 біржавых здзелак на агульную суму 11 515,88 мільярда рублёў (звесткі па стане на 25 чэрвеня г.г.).

ВІДАВОЧНАЯ ВЫГАДА

Біржа — гэта не толькі жывое ўвасабленне канкурэнцыі (галоўнага рухавіка гандлю), але і сапраўдны індыкатар цэнаў, гэткі арыенцір для ўдзельнікаў рынку. Ёсць, праўда, адно «але»:

— Для таго, каб біржа выступала ў ролі каціравальнага інстытута, праз яе павінны праходзіць рэальныя аб'ёмы тавару, — падкрэслівае А. Салікаў. — А ў нас цяпер па некаторых пазіцыях праходзіць толькі 10—20 %. Некаторыя лічаць за лепшае прыцаніцца на біржы, а пасля самім неяк шукаць пакупнікоў. Нас такая пазіцыя здзіўляе. Чаму, скажам, сельгасвытворцы не аддаюць перавагу біржавой схеме рэалізацыі? Тут кошт можа расці вельмі і вельмі істотна. Вось свежы прыклад, калі за гандлёвую сесію тэхнічны казеін «вырас» амаль на долар! Гэта якраз той выпадак, калі біржавы механізм дэманструе сваю максімальную эфектыўнасць. Ну і як, скажыце, па-за біржай такога можна дасягнуць? Толькі біржа дае магчымасць атрымаць гэтую рэальную цану.

Старшыня праўлення біржы мяркуе, што на сітуацыю ў Беларусі маглі б паўплываць адпаведныя карэкціроўкі заканадаўства. А што думаюць на гэты конт заканадаўцы?

— Біржавы гандаль — прагрэсіўны, цывілізаваны спосаб рэалізацыі, — перакананы **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Сяргей СЯМАШКА.** — Кожны прадпрымальнік сёння хацеў бы прадаваць найбольш выгадна. І калі такую магчымасць дае таварная біржа, трэба гэтым карыстацца!

Народны абраннік памятае, як падчас работы над законапраектам «Аб таварных біржах» «суб'екты гаспадарання дастаткова негатыўна ставіліся да таго, каб іх змушалі ісці на біржу». З цягам часу «спрэчкі сціхлі, і сёння вяртацца да перагляду гэтых момантаў немэтазгодна», — мяркуе дэпутат.

Насамрэч, нашто трэба «заганяць» на біржу, калі дарогу туды паказваюць логіка, цвярозы розум і выгада? Абы толькі своечасова гэта зразумець...

Днямі кіраўніцтва біржы павіншавала і ўручыла памятны сувенір Наталлі БЕЛАЙ — яна дасягнула своеасаблівага рэкорду: стала брокерам сямітысячнага кліента.

Зоя ВАРАНЦОВА,
Алена ДАЎЖАНОК,
Яўген ПЯСЕЦКІ.

УНП 190542056.

10 ГАДОЎ КІРАВАННЯ ПУЦІНА. ШТО АДБЫВАЕЦЦА СЁННЯ Ў РАСІІ?

НЕЯК незаўважана прайшло дзесяць гадоў, як наша суседка-Расія ўступіла ў прынцыпова новую фазу свайго развіцця: на змену ліберальнаму, хоць і не заўсёды вывераному курсу, які праводзіўся пад кіраўніцтвам прэзідэнта Ельцына, прыйшло нешта новае. Хоць, насамрэч, як адзначаюць многія аналітыкі — і расійскія, і замежныя — новым гэта назваць ніяк нельга. Гэта, хутчэй, яшчэ незабытае старое, якое, здавалася б, назаўсёды было адрынута расійскім грамадствам. Але ж яно вярнулася. Пра тое, што адбываецца ў сённяшняй Расіі, расказваюць у толькі што выдадзенай кнізе «Пуцін. Вынікі. 10 гадоў» яе аўтары Барыс Нямцоў і Уладзімір Мілаў. Днямі аўтары прэзентавалі экспертны даклад, прысвечаны вынікам 10-годдзя кіравання У. Пуціна. Даклад па сваёй сутнасці — выкрыццё міфаў пуцінскай прапаганды, якую льюць расіянам у вушы з экранаў дзяржаўнага ТБ.

Такім чынам, за дзесяць гадоў кіравання Пуціна:

1. Карупцыя дасягнула катастрафічных памераў. Расія па ўзроўні хабарніцтва знаходзіцца сярод самых адсталых афрыканскіх краін і займае 146-е месца ў рэйтынгу Transparency International.

2. Расія губляе каля паўмільёна грамадзян у год з-за вельмі нізкай працягласці жыцця, звышсмяротнасці ад алкагалізму і нізкага ўзроўню аховы здароўя.

3. За дзесяць гадоў сыравінная залежнасць краіны толькі пагоршылася. Калі эксперт сыравіны ў 2000 годзе складаў усяго 44 працэнты ў агульным аб'ёме экспарту краіны, то ў 2010 годзе — ужо 65 працэнтаў.

4. Дэградуе дарожная сетка. З-за высокай карумпаванасці ў дарожным будаўніцтве штогадовы ўвод дарог за дзесяць гадоў скарачаецца ўдвая.

5. За дзесяць гадоў колькасць тэрактаў выраслa больш чым у 6 разоў. Выбухі ў маскоўскім метро 29 сакавіка 2010 года паказалі, што расійскія спецслужбы відавочна не здольныя прадухіліць тэрор не толькі ў краіне, але нават паблізу галоўнага офіса ФСБ на Лубянцы. Арыентацыя на карумпаваныя кланы Каўказа прывяла да фактычнай страты кантролю над паўночнакаўказскімі рэспублікамі, пры гэтым федэральная ўлада працягвае іх датаваць на ўзроўні $5—6 млрд у год.

6. Выдаткі бюджэту на спецслужбы перавышаюць выдаткі на ахову здароўя і адукацыю, разам узятых, у 3 разы. Сумарная колькасць супрацоўнікаў спецслужбаў пераваліла за 2 млн, удвая перавысіўшы колькасць асабовага складу арміі. Такога не было нават у савецкі час.

7. За гады кіравання Пуціна сацыяльнае расслаенне ў краіне выраслa на 15 працэнтаў. У крызісны 2009 год колькасць доларавых мільярдэраў падвоілася, пры гэтым 18,5 млн чалавек жывуць за рысай беднаты, беспрацоўе дасягнула ўзроўню ў 9 працэнтаў, а зарплаты бюджэтнікаў замарожаныя.

8. На фоне дэфіцытнага бюджэту і паўсюднай галечы ажыццяўляюцца шматмільярдныя аферы: зімовая Алімпіяда ў субтропіках; газаправоды «Паўночны паток» і «Паўднёвы паток», а таксама «Алтай»; правядзенне саміту АТЭС на востраве Рускі.

9. Спустошаны Пенсійны фонд. Яго дэфіцыт — больш за трыльён рублёў. У сувязі са старэннем насельніцтва і скарачэннем колькасці працуючых на 1 млн чалавек у год перспектывы сумныя — улады гатовыя павялічыць падаткі, павялічыць пенсійны ўзрост.

А сімвалам світанку і заходу «нацыянальнага лідара» стануць бясконцыя няўдалыя пускі ракеты «Булава», якая на старце выглядае грацыёзна і велічна, а пры ўзлёце рассыпаецца на кавалкі.

Адразу пасля прэзентацыі даклада «Пуцін. Вынікі. 10 гадоў» адбылася рэакцыя пуцінскай вертыкалі.

Спачатку ў выніку DDOS-нападу быў абрынуты сайт, на якім быў змешчаны даклад. Затым у Санкт-Пецярбургу затрымалі 100-тысячны тыраж даклада.

Але гэтым справа не скончылася.

Літаральна ўчора супрацоўнікі спецслужбаў затрымалі яшчэ 100 тысяч асобнікаў даклада ў друкарні.

Замест таго, каб спрачацца, палемізаваць з высновамі даклада, аспрэчваць яго палажэнні, даказваць сваю эфектыўнасць, вырашылі «дзейнічаць па-пуцінску».

Парушаючы канстытуцыйнае права грамадзян на інфармацыю, вырашылі, як у старыя добрыя часы, апазіцыйную літаратуру ліквідаваць.

Прычына — у дакладзе дадзены з лічбамі і фактамі праўдзівыя вынікі кіравання Пуціна.

Расіянам кажуць, што пабудавалі эфектыўную дзяржаву, а насамрэч за дзесяць гадоў кіравання ўзровень карупцыі дасягнуў жахлівых памераў (на ўзроўні самых адсталых афрыканскіх краін). Ім даказваюць, што нараджальнасць расце, а смяротнасць падае — насамрэч, пры Пуціне Расія губляе больш як паўмільёна чалавек у год. Ім кажуць, што ён перамог алігархаў і беднату — у сапраўднасці мільярдэраў у краіне больш за 60, а бедных — 20 мільёнаў. Ім даводзяць, як Пуцін уціхамірыў Каўказ і перамог тэрор — насамрэч, за дзесяць гадоў яго кіравання колькасць тэрактаў выраслa ў шэсць разоў, а каўказскія рэгіёны, атрымліваючы шматмільярдныя датацыі, апынуліся па-за расійскім прававым полем.

Гэта праўда, якую, па меркаванні Пуціна, расіяне ведаць не павінны.

Адгэтуль — дзеянні сілавікоў.

Пазіцыя ўлады адначасова і недарэчная.

Арышты і канфіскацыі толькі прыцягваюць грамадскую ўвагу да даклада і яго зместу. Аўтарам задаюць пытанне, а навошта яны, улады, гэта робяць, калі ёсць даклад у інтэрнэце. Адказ у тым, што інтэрнэтам актыўна карыстаюцца ў Маскве, Пецярбургу і іншых буйных гарадах, але ў большасці расійскіх рэгіёнаў гэта па-ранейшаму экзотыка і людзі, акрамя афіцыёзных тэлеканалаў і газет, іншых крыніц інфармацыі не маюць. Так што распаўсюджванне друкаванага даклада ў рэгіёнах — рэальная пагроза рэжыму.

Дзіўная рэакцыя людзей на арышты тыражоў.

У Піцеры стаў распаўсюджвацца даклад у самвыдаўскім выкананні — друкуюць з сайта. На вокладцы напісана «Выраблена ў рэжыме самвыду і распаўсюджваецца бясплатна». Відаць, што прыклад Піцера — толькі пачатак. Яго аўтары ніяк не думалі, што іх даклад паўторыць лёс «Кантынента» і «Хронікі бягучых падзей».

Падрыхтаваў Антон ЗАПОЛЬСКІ.

КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ НЕРАЗБЯРЫХА

У Кіргізіі зноў рэферэндум. Складваецца ўражанне, што правядзенне ўсенародных рэферэндумаў — нацыянальнае хобі кіргізаў — так іх шмат адбылося на працягу вельмі кароткага адрэзку гісторыі.

У 2006 годзе Асноўны Закон Кіргізіі змяняўся двойчы — у лістападзе, пад ціскам масавых мітынгаў апазіцыі ў сталіцы. Але 30 снежня канстытуцыя пад уздзеяннем прэзідэнцкіх сілаў ізноў была зменена ў бок значнага ўзмацнення паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. Аднак потым Канстытуцыйны Суд Кіргізіі прызнаў нелегітымным працэс прыняцця парламентам лістападаўскай і снежаньскай канстытуцый. У выніку краіна вярнулася да Асноўнага закона ад 2003 года. Ведаеце, некалькі канстытуцый на працягу некалькіх гадоў — гэта занадта. Бо кожны раз народу прапаноўвалася нешта новае і нязвыклае. Так, на адносна нядаўнім усенародным рэферэндуме па новым праекце Канстытуцыі, які прайшоў па прапанове яшчэ тады паўнамоцнага прэзідэнта Курманбека Бакіева (за ходам галасавання сачылі 130 міжнародных назіральнікаў у складзе 17 дэлегацый) прапаноўвалася абранне парламента выключна па партыйных спісах. Колькасць дэпутацкіх месцаў меркавалася павялічыць да 90 замест 75. Бакіеў таксама прапанаваў прэм'ер-міністра прызначаць па рашэнні партыі, якая набярэ больш за палову мандатаў. Калі такой не будзе, то прэзідэнт, значылася ў праекце Канстытуцыі, можа абраць любую з прадстаўленых у парламенце партый і даручыць ёй фарміраванне ўрада.

Цяпер вось яшчэ адзін чарговы праект Асноўнага Закона Кіргізіі быў прапанаваны электарату. Сумнеўна, што большасць выбаршчыкаў змаглі ўнікнуць у яго новаўвядзенні. Асабліва ў раёнах, якія прыходзяць у сябе пасля пагромаў, пажараў і масавых забойстваў мірнага насельніцтва. Становішча ў самых пацярпелых ад беспарадкаў гарадах Ошы і Джалал-Абадзе была набліжана да надзвычайнай — там парадак у час правядзення рэферэндуму забяспечвалі каля 7,5 тысячы супрацоўнікаў міліцыі. Каб прыцягнуць на выбарчыя ўчасткі як мага больш людзей перад рэферэндумам, новыя ўлады пайшлі на істотныя паслабленні. Дазволілі, напрыклад, галасаваць не толькі не па месцы прапіскі, а наогул без дакументаў. Праўда, праціўнікі новай улады Кіргізіі (іх прыхільнікі Розы Атунбаевай называюць «дэструктыўнымі элементамі») сцвярджаюць, што мела месца так званае карусельнае галасаванне. Гэта, калі на аўтобусах з участка на ўчастак вазілі людзей, у якіх «згарэлі» дакументы і тыя былі вымушаны выконваць свой грамадзянскі абавязак без прад'яўлення пашпарта.

Аптымістычныя рэляцыі з Бішкека са спасылкай на Цэнтральную выбарчую камісію па правядзенні выбараў і рэферэндумаў (ЦВК), сведчаць аб падтрымцы насельніцтвам намаганняў часовага ўрада Розы Атунбаевай, які ініцыяваў правядзенне ў мінулую нядзелю рэферэндум па Канстытуцыі. «За», як паведаміла яшчэ да абеду ў панядзелак ЦВК, прагаласавалі 90,86 % выбаршчыкаў (каля 1,67 млн чалавек), супраць — 7,82 % (145 тысяч чалавек). Яўка склала 70 працэнтаў.

Не выключаю, што потым лічбы падрастуць. Тым, хто 7-8 красавіка здолеў арганізаваць у Кіргізіі маштабныя беспарадкі, хутка і зладжана пераварыць іх ва ўзброены бунт быццам даведзеных да апошняй рысы насельнікаў, якія адразу згуртаваліся ў атрады баевікоў, і з іх дапамогай захапіць уладу, думаецца, не вялікі клопат наладзіць «правільны» падлік галасоў. У стабільных краінах з векавымі дэмакратычнымі традыцыямі і законапаслухмяным насельніцтвам нярэдка здараюцца сюрпрызы ў час і галасавання і ў час падліку галасоў. А ў Кіргізіі, дзе аўтамат Калашнікава — лепшы сябра чалавека, нешта слаба верыцца, што ўсё прайшло як і належыць пры галасаванні.

Чакаецца, што афіцыйныя вынікі канстытуцыйнага рэферэндуму будуць абвешчаныя да канца гэтага тыдня. Можна быць упэўненым, што лічбы абавязкова будуць на карысць часавага ўрада Розы Атунбаевай, за прадстаўленне ёй паўнамоцтваў прэзідэнта пераходнага перыяду на пэўны тэрмін. Ды і не ў лічбах справа. Галоўнае, каб наступіў мір і эканамічная стабільнасць у яшчэ пакуль ахопленай жахам пасля ўзброеных канфліктаў краіне. Каб новы праект Канстытуцыі па пераходзе ад прэзідэнцкай да парламенцкай формы кіравання, моцнае абмежаванне паўнамоцтваў прэзідэнта — да статусу англійскай каралевы (і чамусьці пры гэтым прэзідэнцкі тэрмін павялічаны з пяці да шасці гадоў) і не зрушыў зразумелае скасаванне канстытуцыйнага суда супакоіліся, накармілі і далі дах над галавой пацярпелым ад беспарадкаў людзям. Каб «калашы» нарэшце пайшлі на пераплаўку, а Асноўны Закон набыў непахіснасць і імунітэт да частага рэдагавання. Хоць гэта толькі спадзяванні, у якіх мінімальныя шанцы. Гэты эксперымент з рэформай Канстытуцыі не ўспрымаюць нават тыя кіраўнікі дзяржаў, якія спачатку ў кіргізскім бунце ўбачылі станоўчыя моманты. На саміце Вялікай дваццаткі ў Таронта прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў шчыра сказаў, што не ўяўляе, як у Кіргізіі будзе рэалізоўвацца ідэя парламенцкай рэспублікі. Ня яго думку, у цяперашнім стане Кіргізія можа распасціся, паведаміла ВВС.

Сапраўды, пытанне аб мэтазгоднасці правядзення рэферэндуму і наступнай радыкальнай змены канфігурацыі палітычнай улады краіны даволі спрэчнае. Упэўнены, на яго дакладна не адкажуць і прыхільнікі народнага галасавання. Зразумець аўтараў новай Канстытуцыі можна: ім трэба было нейкім чынам легалізаваць звяржэнне закона абранага прэзідэнта, атрымаць прызнанне ў свеце. І тут самае лепшае выйсце — пераход да новай формы ўлады ў Кіргізіі парламенцкага кіравання дзяржавай, вядома, пры падтрымцы большасці народа.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Этнаскарбонка

Чым больш ізаляваны этнас, тым больш ён далікатны

Па крыві чалавека можна чытаць яго мінулае і рабіць прагнозы на будучыню. Доктар біялагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Аляксей МІКУЛІЧ на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў вывучаў генетычныя і морфафізіялагічныя прыкметы (колер вачэй і валасоў, смакавая адчувальнасць да фенілціякарбаміду, абваласенне сярэдніх фалангаў пальцаў на руках, форма вушных ракавін і іншыя) беларускіх вяскоўцаў і жыхароў памежных тэрыторый. Генетычныя і антрапалагічныя маркёры Аляксей Ігнатавіч параўноўваў з археалагічнымі даследаваннямі, звесткамі, сабранымі моваведамі і фалькларыстамі. Усё выдатна накладалася адно на другое: там, дзе розняцца дыялекты, традыцыі, фальклор, назіраецца і пэўная падобнасць насельнікаў пэўных мясцовасцяў па крыві. У вёсках абмен генамі адбываўся пераважна паміж мясцовымі карэннымі жыхарамі, у той час як гарады былі больш адкрытыя прытоку генаў звонку. Аляксей Ігнатавіч узгадвае нават са свайго маленства, як розніліся яго аднавяскоўцы і не такія далёкія суседзі з Палесся: «Часам у палешукоў здараліся няўдобіцы, яны пехатой ішлі ў нашу мясцовасць, каб нешта мяняць на прадукты. Яны былі апранутыя зусім па-іншаму, гаварылі на сваім дыялекце і мы іх успрымалі, як «нетутэйшых». Пра тое, што беларусы ў асноўным трымаліся сваёй мясцовасці могуць сведчыць архівы, ці... могілкі (вяскоўцы шанавалі продкаў і памяталі сваіх дзядоў аж да пятага калена)». І сёння, дзякуючы вёскам, адкуль у асноўным у сярэдзіне мінулага стагоддзя папаўняліся гарады, назіраецца высокая стабільнасць беларускага генафонду. На падставе банка звестак, сабраных антрапагенетыкам, вырысоўваецца свая самабытная гісторыя беларускага этнасу, у аснове якога прысутнічаюць даславянскія балцкія папуляцыі і дагістарычныя палеапапуляцыі на поўначы.

У крыві зашыфравана гісторыя

— У расійскай прэсе ставіцца пад сумненне канцэпцыя агульнага паходжання ўсходніх славян, маўляў, антрапалагічныя і генетычныя даследаванні паказваюць, што гэтыя народы непадобныя паміж сабой. І што насельнікі сучаснай Расійскай федэрацыі бліжэй да туркаў і фіна-ўграў. Ці пагодзіцеся вы з гэтай думкай?

— У рускіх сапраўды бурліць турэцкая і фінская кроў, што звязана з гісторыяй гэтай краіны. Даследаванні, якія праводзіў я, сведчаць, што ў крыві насельнікаў Беларусі мангалоідная кампанента амаль не сустракаецца, што гаворыць пра тое, што наш край не зведаў татара-мангольскага панавання. Больш за тое, як у маіх, так і ў даследаваннях расійскіх генетыкаў прасочваецца, што агульная тэндэнцыя зменлівасці ў межах беларускай тэрыторыі мае накірунак з поўдня на поўнач, а для расійскай — з захаду на ўсход. Сабраны мной матэрыял антрапагенетычных маркёраў па Беларусі і памежных тэрыторыях быў перададзены ў Лабараторыю генетыкі чалавека Інстытута агульнай генетыкі імя М.І. Вавілава. На карце, створанай на аснове генетычных даследаванняў, прасочваецца, што «этнічнае воблака» беларусаў даволі кампактнае, расійскае — вельмі размытае, прычым у цэнтры расійскіх папуляцый назіраецца большая падобнасць з фіна-ўгорскімі этнасамі, чым са славянскімі. Так, беларусы і рускія падобныя па культуры, мове (што дарэчы, можна змяніць за некалькі пакаленняў), але мы рознімся па генатыпе (а яго змяніць немагчыма). Таксама я ўдзельнічаў у даследаваннях, якія праводзілі палякі, па вывучэнні славянскага генафонду. Аказалася, што па інфармацыі, зашыфраванай у генах, беларусы значна бліжэй да сваіх заходніх суседзяў — палякаў Мазовіі. І гэта адпавядае гісторыі: рассяленне народаў ішло з захаду на ўсход, але далейшая «еўрапеізацыя» была спынена татара-мангольскім нашэсцем на тэрыторыю старажытнай Русі. Акрамя таго ДНК-маркёры здольныя перадаваць інфармацыю не толькі пра тое, у якім накірунку ішлі міграцыі, але і пра тое, як асядаў народ на пэўнай тэрыторыі. Сабраныя звесткі сведчаць пра генетычную непарыўнасць пакаленняў — так яшчэ можна «прачытаць» інфармацыю пра Вялікае Княства Літоўскае: сучасныя насельнікі тэрыторый, якія раней уваходзілі ў яго межы, падобныя па крыві.

— А наколькі беларусы блізкія да праэтнаса?

— Калі я ў Маскоўскім універсітэце абараняў свае кандыдацкую і доктарскую работы, вельмі ўразіў расійскіх вучоных. Мной на Палессі знойдзены вельмі рэдкія рэзусфактары. Пэўная ізаляванасць нашай тэрыторыі — жорсткія прыродныя ўмовы, недахоп зямлі для вядзення гаспадаркі ў балоцістай мясцовасці — спрыяла таму, што сюды не было іміграцыі, і, у сваю чаргу, садзейнічала таму, што тут этнас захоўваўся ў найбольш чыстым выглядзе. Тое ж самае можна сказаць і пра тэрыторыю ўкраінскага Палесся.

Чаму мы часта хварэем?

— Сучасныя бабулі заўважаюць, што іх дзеці не хварэлі так часта, як іх унукі. Ці можа гэта быць звязана з тым, што цяпер межы сталі больш адкрытымі (беларусы падарожнічаюць па ўсім свеце, плюс сюды прыязджае больш замежнікаў) і ў выніку да нас трапляюць новыя вірусы, якія раней тут не «гаспадарылі»?

— Чым больш ізаляваны этнас, тым больш ён далікатны. Прыстасаванасць да пэўнага асяроддзя фарміруецца, калі племя, этнас жыве на адной і той жа тэрыторыі, з адпаведнымі ўмовамі і, у тым ліку, хваробамі. На працягу многіх пакаленняў ён загартоўваецца, вычышчаюцца асобы, няздольныя выжываць у такім асяроддзі. Чаму ў Азіі больш людзей з генам B (III група крыві), а ў Еўропе з генам A (II група крыві)? У гэтых месцах у мінулым існавалі ачагі эпідэмій воспы і чумы. У выніку адбору больш выжывала людзей з адпаведнымі групамі крыві. У абарыгенаў Аўстраліі, Палінезіі і індзейцаў Амерыкі, якія ў мінулым не перанеслі такія хваробы (але перахварэлі на нешта іншае), канцэнтрацыя групы O (I) дасягае амаль 100 працэнтаў. Апошняя эпідэмія воспы на Індастанскім кантыненце закранула ў асноўным людзей A (II) групы крыві, сярод памерлых ледзь не ўсе з гэтай групай. Нешта падобнае назіраецца і ў наш час, калі вірус грыпу часцей і больш жорстка закранае людзей з генам A. Так, звесткі генетыкі можна выкарыстоўваць пры прафілактыцы пэўных хвароб, людзей з групы рызыкі прышчапляюць у першую чаргу, пры недахопе пэўных лекаў выдзяляюць іх людзям, якія больш успрымальныя да пэўнай хваробы.

— Перасяленне чыстых генетычна вяскоўцаў (бо яны бралі шлюбы ў асноўным з жыхарамі іх жа мясцовасці і на працягу многіх пакаленняў трымаліся адной і той жа зямлі) у гарады з больш генетычна разнастайным насельніцтвам магло адбіцца павелічэннем колькасці захворванняў?

— У выніку «змяшэння крыві» розных папуляцый, наадварот, фарміруецца генафонд, збалансаваны па набору і частотах генаў, якія забяспечваюць дастатковую выжывальнасць і большую супраціўляльнасць розным хваробам. Іншая справа, што само гарадское асяроддзе, экалогія здольныя ўплываць на генафонд. Натуральны адбор не перастаў дзейнічаць, хутчэй наадварот, зараз, у сувязі з пагаршэннем экалогіі, ён узмацніўся. Дзякуючы развіццю медыцыны зніжана дзіцячая смяротнасць, але этнас ад гэтага не становіцца мацнейшым, працягласць жыцця не стала большай, наадварот, яна памяншаецца (у Беларусі сярэдняя працягласць жыцця мужчын сёння складае 60 гадоў) і вырастае колькасць захворванняў. Напрыклад, толькі на працягу жыцця пакаленя, якое жыве зараз (25—30 гадоў) у сувязі з назапашваннем адыходаў вытворчасці, радыеактыўным, хімічным забрудваннем і частата захворванняў падвоілася. З'явіліся новыя паталогіі. Нават лагапеды адзначаюць, што павелічэнне моўных праблем у дзяцей звязана з экалогіяй. А ў гарадах уздзеянне на арганізм чалавека мацнейшае, чым на вёсцы. І справа не толькі ў забрудженым паветры. Напрыклад, у гарадах сярэднесутачная і сярэднемесячная тэмпература на некалькі градусаў вышэйшая, чым у вёсках, летам яны ператвараюцца ў «астравы спякоты», задымленасць, павышаная стамляльнасць людзей аслабляе імунітэт, і людзі часцей прастуджваюцца. Накапленне хімічных рэчываў у паветры, вадзе і прадуктах харчавання спрыяе росту алергічных захворванняў, зніжэнне фізічнай актыўнасці адбіваецца на сардэчна-сасудзістай сістэме. Гараджане ў параўнанні з вяскоўцамі ў 2 разы больш пакутуюць ад захворванняў органаў кровазвароту і дыхання.

— Але што, на вашу думку, зараз можна зрабіць для захавання беларускага генафонду? Ну не прапагандаваць жа вяртанне ўсіх на вёску...

— А шкада. Сапраўды, самым лепшым варыянтам для захавання беларускага этнасу, здаровага пакалення было б адраджэнне вёскі. Але час, калі для яе захавання нешта можна было зрабіць, страчаны. Добра, што мне яшчэ ўдалося паспець сабраць гэтыя звесткі з лакальных папуляцый. А каб экалагічны ўціск на здароўе нацыі быў меншы, мне падаецца, найперш трэба зрабіць доступ да экалагічнай інфармацыі больш адкрытым.

Пад адкрытым доступам Аляксей Мікуліч разумее не раздзіманне праблем. Неабходна фарміраваць правільную культуру паводзінаў, каб не здаралася такіх «недарэчнасцяў», якія навуковец бачыў падчас сваіх камандзіровак пасля аварыі на ЧАЭС. Напрыклад, калі на забруджанай тэрыторыі трактарыст араў поле, а разам з ім у кабіне было яго маленькае дзіця! Альбо як у раёне, дзе мясцовае кіраўніцтва пасля таго, як даведалася пра тое, што на іх тэрыторыі адно з балот найбольш забруджанае, «каб менш фаніла», торф адтуль расцягвала і рассыпала па вакольцах. Ці ён заўважыў рост захворванняў дзяцей у адным са, здавалася б, багатых раёнаў, што было звязана з... добрымі ўраджаямі: угнаенні выкарыстоўваліся без адпаведнага навуковага падыходу, без меры, што адбілася ў сваю чаргу на забруджванні пітной вады, глебы. Неабходна выконваць патрабаванні Орхускай канвенцыі, якая прынятая ў 1998 годзе і падпісана Беларуссю. Пэўныя механізмы ўжо распрацаваныя ў іншых краінах. За мяжой у крамах можна набываць больш дарагую, але экалагічна чыстую прадукцыю. Чаму б нам не пераймаць такія формы, калі людзі няхай за грошы, але змогуць выбіраць тое, што для іх і іх нашчадкаў лепш: бяспечныя прадукты, больш чыстыя раёны для пражывання, зоны для адпачынку?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Фестывалі

«Бусла» забралі «Ваўкі»

У Брэсце завяршыў работу сёмы рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў. Бюджэт сёлетняга кінафоруму быў больш сціплым, чым у папярэднія гады, таму на адкрыццё не запрашалі расійскіх знакамітасцяў, як раней. Але ў рэшце рэшт не ў тварах сутнасць, хоць яны, несумненна, упрыгожылі б традыцыйную цырымонію. Фестываль беларускі, не раз гучала падчас фэсту, — то няхай глядач прывыкае ведаць свае імёны і твары.

Яшчэ да пачатку фэсту нямала чулася з розных бакоў скептычных меркаванняў як наконт агляду, так і беларускага кіно ў цэлым. Ды хочацца паставіць своеасаблівым аўтографам не толькі да сёмага «Бусла», але ўсяго айчыннага кінапрацэсу словы беларускага кінакрытыка Людмілы Саянковай, што былі сказаныя падчас закрыцця: «Наша кіно існуе... Мы дачакаемся тых часоў, калі вырвемся на сусветную кінапрастору і заявім пра сябе». Хацелася б, вядома, каб тыя запаветныя часы насталі ну хоць бы не праз доўгія дзесяцігоддзі. Некаторыя падставы спадзявацца на гэта прадэманстраваў сёлетні фестываль. Маладзейшае пакаленне рэжысёраў, якое было ў асноўным прадстаўлена, дэманструе прафесійную работу.

Журы аднадушна адзначала якасную беларускую анімацыю. Беларускую анімацыю, відаць, можна назваць яшчэ і нацыянальнай і глыбока патрыятычнай. Адны толькі назвы за сябе гавораць: «Аповесць мінулых гадоў», «Несцерка», «Беларускія прымаўкі», «Выцінанка-выразанка», «Музычная скарбонка». Цэлы шэраг з паказаных на фестывалі мультыплікацыйных праектаў на рознага ўзроўню міжнародных фестывалях быў адзначаны ўзнагародамі. А Міхаіл Тумеля, аўтар «Выцінанак...» і іншых фільмаў, калі атрымліваў заслужаныя дыпломы, вельмі дасціпна згумарыў, вымавіўшы ў мікрафон: «Бальшой вам чалавечаскі дзякуй». А як яшчэ пакпіць з арганізатараў, якія так многа гаварылі ра беларускае кіно, а падчас асноўных цырымоній акрамя надпісу на дыпломах слова беларускага не вымавілі?

У анімацыйнай праграме парадаваў гледача і мультыплікацыйны фільм «Птаха» Аляксандра Ленкіна — светлая гісторыя пра любоў і спагаду да птушкі. Сярод дакументальных стужак выдзяляецца шчымлівая гісторыя жыцця жанчыны з палескай вёскі Ульяны Мельнік. Зняты па сцэнарыі пінскага журналіста Вячаслава Ільянкова рэжысёрам Юрыем Гарулёвым фільм «Фатограф Ульяна» расказвае пра незвычайныя паваротны жыцця звычайнай паляшучкі. Жанчына засталася ўдавою з двума малымі дзецьмі, муж загінуў на фронце. Каб выжыць, спачатку яна прадае карову і купляе швейную машынку, а потым набывае фотаапарат і становіцца фатографам на ўсю акругу. Вяскоўка-працаўніца з надзвычай творчай натурай жыве ў самай глыбінцы. Фільм пра яе, поўны лірызму і высокай публіцыстыкі, трымае гледача ад пачатку да канца. І гэта служыць доказам, што фільм добры.

У рамках кінафестывалю, хоць і па-за праграмай, прадэманстравалі фільм «Брэсцкая крэпасць». Ён адначасова паказаны і на кінафестывалі ў Маскве. Першыя водгукі на стужку маскоўскіх журналістаў я назвала б стрымана-станоўчымі.

Яшчэ адзін фільм, дзе прысутнічае тэма вайны, стаў галоўнай падзеяй брэсцкага фестывалю. «Ваўкі» Аляксандр Колбышаў паставіў па аповесці Аляксандра Чакменева. Твор быў напісаны яшчэ ў 60-я гады, але не толькі не ставіўся, нават не друкаваўся. Першы раз аповесць выйшла ўжо ў XXI стагоддзі. І вось беларускі рэжысёр узяўся зрабіць кіно. Сюжэт у многім тыповы для свайго часу. Галоўны герой Кірыл Палятаеў асуджаны пасля вайны за тое, што трапіў у палон. Яго вязуць з іншымі зняволенымі. І на адным з прыпынкаў вязень пазнае станцыю, што недалёка ад яго роднай вёскі. Ён уцякае, каб пабачыць жонку і дачку, уцякае ад кашмару зняволення. І трапляе ў новы кашмар. Бо адны яго землякі імкнуцца яму дапамагчы, іншыя хочуць выдаць, а пільны следчы НКУС учыняе цэлае паляванне. І вось уцякач, якому ўдалося вырвацца ад пагоні людзей, трапляе ў акружэнне зграі ваўкоў... Як сказаў старшыня журы фестывалю Пэтэр Сім, у фільме многа псіхалагізму. Сапраўды, тэма вайны, рэпрэсій тут выглядае не галоўнай. Галоўнае — перажыванні чалавека, яго адчуванне ў экстрэмальнай сітуацыі, а таксама паводзіны навакольных. Журы адзначала таксама ўдалую ігру акцёраў.

Фільму «Ваўкі» прысуджана Гран-пры фестывалю — «крыштальны бусел».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
- оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и др.)
- организация и проведение аукционов

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

- здание административно-хозяйственное, инв. № 200/С-42497, пл. 589,0 кв.м, по адресу: Витебск, ул. 4-я Заслонова, 4А, начальная цена продажи с учетом НДС 139 980 545 руб., задаток 13 998 055 руб., для обслуживания здания выделен зем. участок пл. 0,0668 га. Официальное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 35 от 25.02.2010.

Аукцион состоится **22 июля 2010 в 12.00** по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 21.07.2010 (включительно) по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников 22.07.2010 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02.**

Утерянный бланк лицензии Министерства транспорта и коммуникаций Республики Беларусь № 02190/0478126 на имя Боркуна А.В. считать недействительным. Претензии принимаются в течение двух месяцев.
Телефон: 8 029 681 46 61.

Утерянные представительством Белгосстраха по Центральному району бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2 РН серии БЛ с № 0748196 по № 0748198 считать недействительными.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»
- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА 14 июля 2010 года

№ лота	Наименование объекта	Адрес объектов продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Универсальное энергетическое средство УЭС 2-250, г/н ЕА 5829	Калинковичский район, д. Казанск	110 689 344	5 534 000
2	Прицеп 2ПП4 без номера		1 028 556	51 400
3	Автомобиль ГАЗ-53 бензовоз, г/н АВ 2948-3		4 217 616	210 800
4	Автомобиль ЗИЛ ММЗ-554, г/н АВ 1564-3		9 325 224	466 000
5	Сеялка овощная СО-4,2		4 093 632	204 600
6	Охладитель ЦН-125		99 684	4 900
7	Протравливатель		2 274 768	113 700
8	Охладительная установка СА-1600		119 160	5 900
9	Плуг ПЛН 3-35		1 078 416	53 900
10	Культиватор		1 467 468	73 300
11	Сосуд Дюара		525 240	26 200
12	Разбрасыватель ПРТ-7		4 593 312	229 600
13	Петкус		2 314 908	115 700
14	Весы молочные		334 332	16 700
15	Ксерокс		63 216	3 000
16	Двигатель асинхронный марки 3Ф № 1		164 124	8 000
17	Двигатель асинхронный 3Ф № 2		164 124	8 000
18	Цистерна		3 820 068	191 000
19	Вагон-бытовка		1 005 480	50 200
20	Емкость металлическая 20м³		2 304 000	115 200
21	Емкость металлическая 75 м³		15 734 400	786 700
22	Электродвигатель 90кВт		2 904 000	145 200

Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве ФХ «Савицкий В.В.»

Срок подачи заявления	**До 17.00 13 июля 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**14 июля 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 10 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота плюс публикация информационного сообщения
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

1. Порядок проведения аукционных торгов устанавливает Законодательство Республики Беларусь.
2. В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:
   * Заявление; соглашение о правах и обязанностях сторон по установленной форме;
   * копия платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении;
   * юридические лица должны предоставить – заверенные копии учредительных документов, индивидуальные предприниматели – заверенную копию свидетельства индивидуального предприн

КОЛЬКІ ВАЖЫЦЬ МІЛЬЁН ДОЛАРАЎ?

НАПЭЎНА, многія задумваліся, чаму ў нас у краіне няма разменных манет, чаму адна і пяцідзесяцітысячныя купюры падобныя паміж сабой, і чаму банкноты рублёў і еўра рознага наміналу адрозніваюцца па памеры, а долары — абсалютна аднолькавыя.

Сёння на ўсе гэтыя пытанні вы можаце атрымаць адказ з вуснаў экспертаў:

Дзмітрый ПАЛЯКОЎ, начальнік Упраўлення касавых аперацый і інкасацыі ЗАТ «Банк ВТБ (Беларусь)»;

Віктар БОРКУС, галоўны эканаміст Упраўлення арганізацыі грашовага абарачэння і касавай работы ААТ «Белаграпрамбанк».

Чаму ў нашай краіне няма металічных манет?

Дзмітрый Палякоў:

Па-першае, любыя грошы заўсёды штосьці каштуюць, а выраб манет — дастаткова стратная справа. Акрамя таго, ёсць пытанні па перамяшчэнні манет, іх падліку, захоўванні. Але ў большай ступені, напэўна, з'яўляецца тое, што ў нас самы дробны намінал — гэта дзесяць рублёў.

Як правіла, манеты робяцца разменнымі, гэта — менш за рубель, як, дапусцім, у Расіі. Некаторыя самыя маленькія намінальныя папяровых грошай, 10-рублёвыя банкноты, яны цяпер замяняюць на манеты, паколькі абарачэнне гэтых манет дастаткова доўгае.

І зноў-такі — самае асноўнае — пытанне выдаткаў на вытворчасць. Паколькі ў нас няма свайго манетнага двара, манеты даводзіцца замаўляць дзесьці ў іншых дзяржавах. Выдаткі на гэта дастаткова высокія.

Віктар Боркус:

Катэгарычна адказаць на гэта пытанне немагчыма, бо такое меркаванне неадназначнае. У снежні 1996 года Нацыянальны банк упершыню выпусціў беларускія жалезныя грошы. Гэтыя грошы былі памятныя і насілі калекцыйны характар. Цяпер Нацыянальны банк выпускае вялікую колькасць памятных юбілейных манет з каштоўных металаў — золата, срэбра, плаціны — і медна-нікелевых. Таму можна сказаць, што ў Беларусі ёсць металічныя грошы адпаведнага наміналу.

Калі ж гаварыць пра абаротную манету, то яе на гэтым этапе эканамічнага развіцця ў Беларусі няма па шэрагу важкіх прычын — з-за існуючага ўзроўню цэнаў і інфляцыі.

Паводле нашага меркавання і інфармацыі, якая ў нас ёсць, Нацыянальны банк гатовы да выпуску жалезных манет, і калі будзе адпаведны ўказ, ён на працягу кароткага прамежку часу можа наладзіць іх выпуск.

На сённяшнім этапе эканамічнага развіцця ўсіх краін у цэлым манеты носяць, хутчэй, характар суверэннасці і не нясуць вялікай нагрузкі на грашовае абарачэнне.

Якія купюры найбольш выносліўвя ў плане зносаўстойлівасці — нашы рублі, долары, еўра? І за кошт чаго?

Дзмітрый Палякоў:

Калі параўноўваць замежныя валюты — долары, еўра — і беларускія рублі, то гэта будуць долары ЗША. У іх такая спецыфіка, яны на 70 % складаюцца з бавоўны. За кошт спецыяльных дабавак кожная дзяржава стараецца зрабіць свае грошы найбольш зносаўстойлівымі. Некаторыя нават спрабуюць рабіць іх пластыкавымі, або часткова пластыкавымі, хоць навобмацак яны застаюцца практычна такімі ж. Беларускія грошы таксама дастаткова зносаўстойлівыя.

Перспектыўным у гэтых адносінах бачацца электронныя грошы на пластыкавых картках. Гэта найбліжэйшая будучая перспектыва — і наша, і ўсяго свету.

Віктар Боркус:

Дваццаць шэсць краін у свеце ўжо выпускаюць палімерныя грошы, зносаўстойлівасць якіх у разы вышэйшая ў параўнанні з папяровымі грашыма. У аснове для палімерных грошай выкарыстоўваецца палімерная аснова і дадатковыя хімічныя дабаўкі. Першай краінай, якая ўвяла палімерныя грошы, была Аўстралія. Іх увядзенне было абумоўлена асяродкам абарачэння, паколькі зносаўстойлівасць прама звязана з тым, дзе валюта абарачаецца. Вільготны клімат плюс высокія тэмпературы прыводзяць да большага зносу грашовай наяўнасці. Таму шэраг краін і выражыў уводзіць палімерныя грошы.

Калі ж параўноўваць долары, рублі і еўра, то еўра, як адна з апошніх уведзеных валют, больш тэхналагічная і дасканалая за кошт новых распрацовак.

Чаму розныя купюры маюць розны памер (беларускія рублі)? А таксама чаму некаторыя падобныя паміж сабой (1000 і 50 000)? А долары, напрыклад, наадварот — аднаго памеру?

Віктар Боркус:

Розны памер і колер банкнот абумоўлены зручнасцю іх выкарыстання, для наступнай зручнасці іх пераліку. Розныя памеры — гэта сусветны стандарт пры вытворчасці банкнот. Больш за 180 краін свету выпускаюць свае грошы, і больш за сто з іх адрозніваюць грошы па памеры і колеравай гаме. І толькі долары ЗША прытрымліваюцца пэўных памераў і аднаго колеру. Гэта звязана з кансерватызмам у вытворчасці папяровых грошай у ЗША, бо гэтыя грошы маюць шматгадовы перыяд абарачэння, і пачынаючы з 1929 года, калі быў прыняты адзіны памер долараў ЗША, памеры банкнот не мяняліся.

Але мяркуючы па апошняй 100-доларавай банкноце, выпушчанай Федэральнай рэзервовай сістэмай ЗША 1 красавіка, зроблены вялікі крок наперад для людзей са слабым зрокам. З'явіліся пэўныя меткі, банкноту будзе прасцей распазнаць у кашальку. Банкноты выйдуць у масавы выпуск у лютым 2011 года. Пытанне падабенства 1-тысячнай і 50-тысячнай купюры, на нашу думку, гэта недапрацоўка дызайнераў і аўтараў праекта апошняй.

Колькі важыць мільён долараў — у долярах, еўра і беларускіх рублях?

Дзмітрый Палякоў:

Адзін пачак колькасцю тысячу стадоларавых купюр важыць адзін кілаграм. Адпаведна, дзесяць такіх пачкаў важаць 10 кілаграмаў, 45 грамаў спісваем на ўпакоўку.

Калі браць купюры па 100 еўра, то важыць яны будуць прыкладна столькі ж. Вядома, калі ўзважваць 1 мільён беларускімі рублямі, то гэта будзе больш.

Віктар Боркус:

Вага банкноты залежыць ад матэрыялу, з якога яна выраблена, ад папяровай падложкі. Сярэдняя шчыльнасць паперы, якая выкарыстоўваецца для вытворчасці банкнот, ад 60 да 100 грамаў на сантыметр. Таму адзін мільён па максімальным намінале, напрыклад, 500 еўра, будзе важыць каля двух кілаграмаў. Адзін мільён 100-доларавымі купюрамі — 10 кілаграмаў, беларускімі рублямі — каля 36 кілаграмаў.

Ці можна размяшчаць рэкламу на грошах? Пісаць што-небудзь, маляваць?

Дзмітрый Палякоў:

Ні ў якім разе нельга. Такія грошы ў любой дзяржаве адразу ж вымаюцца з абарачэння. Грошы павінны ўвасабляць сімвал дзяржавы. Ніякія лішнія надпісы і рэклама не дапускаюцца. Як толькі хтосьці спрабуе гэта зрабіць, у некаторых дзяржавах гэта нават лічыцца наўмысным псаваннем грошай і караецца.

www.infobank.by

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРЫ ВЫБАРЫ МАБІЛЬНІКА ГАЛОЎНАЕ — КОШТ, А НЕ ЯГО БЯСПЕКА

70 працэнтаў расіян упэўненыя, што электрамагнітнае выпраменьванне ад мабільных тэлефонаў небяспечнае для здароўя. Такія звесткі былі атрыманыя ў ходзе сацыялагічнага даследавання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі.

Высветлілася таксама, што каля чвэрці расіян не разбіраюцца ў тым, што такое электрамагнітнае выпраменьванне: 18 працэнтаў чулі пра яго, але не разумеюць яго сутнасці, а 8 працэнтаў нават не сустракаліся з гэтым словаспалучэннем. Яшчэ 13 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што электрамагнітнае выпраменьванне ніяк не ўплывае на іх здароўе, а 4 працэнты нават упэўненыя ў яго станоўчым уздзеянні.

Удзельнікаў даследавання папрасілі назваць фактары, якія яны лічаць найбольш небяспечнымі пры карыстанні мабільнікам. Самымі значнымі пагрозамі расіяне лічаць блізкасць тэлефонаў да жыццёва важных органаў (72 працэнты), выкарыстанне мадэляў тэлефонаў з вялікай магутнасцю выпраменьвання (71 працэнт) і выкарыстанне тэлефонаў дзецьмі (70 працэнтаў).

Разам з тым, у рэйтынгу самых важных характарыстык пры выбары сотавага тэлефона фактар бяспекі для здароўя расіяне паставілі толькі на шостае месца. На першым месцы ў расіян стаіць кошт тэлефона, на другім — такі параметр, як надзейнасць мабільніка, на трэцім — яго тэхнічныя характарыстыкі. Згадваліся таксама функцыянальнасць і марка тэлефона. Амаль дзве трэці апытаных (59 працэнтаў) не ведаюць, які стандарт сотавай сувязі падтрымлівае іх аператар. 9 працэнтаў апытаных паведамілі, што аператар не павінен даваць гарантыі бяспекі тэхналогій, абсталявання і паслуг. Аднак 79 працэнтаў расіян лічаць, што аператары сотавай сувязі павінны рабіць захады па забеспячэнні бяспекі сваіх паслуг для абанентаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Басейн на.. даху

Забаўляльны комплекс «SkyPark» («Нябесны парк») адкрыўся на даху гатэльнага комплексу «Marina Bay Sands» у Сінгапуры. Комплекс знаходзіцца на вышыні 340 метраў, у ім знаходзяцца тры басейны, некалькі паркаў і казіно.

БЕЛТА.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 26 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.41	21.45	17.04
Віцебск —	4.22	21.43	17.21
Магілёў —	4.31	21.35	17.04
Гомель —	4.37	21.22	16.45
Гродна —	4.57	21.59	17.02
Брэст —	5.07	21.50	16.43

Імяніны

Пр. *Майсея, Міхаіла, Пятра, Ціхана.*

К. *СВ. АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА, Саламеі, Францішка.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +29..+31°C	КІЕЎ +32..+34°C	РЫГА +27..+29°C
ВІЛЬНЮС +28..+30°C	МАСКВА +25..+27°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +25..+27°C

Дзве даты

29 чэрвеня

1798 год — нарадзіўся (г. Дуброўна, сёння Віцебскай вобл.) Аляксандр Іванавіч Казарскі, вядомы ваенны дзеяч, герой руска-турэцкай вайны. Служыў у Дунайскай ваеннай флатыліі і на Чарнаморскім флоце. Вызначыўся ў 1828 годзе пры ўзяцці крэпасцяў Анапа і Варна. Як камандзір брыга «Меркурый» паспяхова кіраваў няроўным боем супраць некалькіх турэцкіх лінкораў, прымусіўшы іх адысціць. За мужнасць узнагароджаны ордэнам святога Георгія 4-й ступені, брыг атрымаў Георгіеўскі сцяг. Подзвігу экіпажа «Меркурый» прысвечаны карціны І. Айвазоўскага «Брыг Меркурый» пасля перамогі над двума турэцкімі суднамі сустракаецца з рускай эскадрай» і «Брыг «Меркурый», атакаваны турэцкімі караблямі». Памёр у 1833 годзе. У Севастопалі яму пастаўлены помнік з надпісам «Казарскаму. Нашчадкам у прыклад».

1900 год — нарадзіўся Антуан дэ Сент Экзюперы, славуты французскі пісьменнік, паэт, эсэіст, авіятар. Аўтар «Маленькага прынца», раманаў «Планета людзей», «Пяўдзёвы паштовы», «Начны палёт» і іншых твораў. Загінуў 31 ліпеня 1944 года падчас разведвальнага палёту над Міжземным морам.

Цытата дня:

«Для таго, каб вывучыцца гаварыць праўду людзям, трэба навучыцца гаварыць яе самому сабе».

Леў ТАЛСТОЙ.

Хочаце — верце...

ХАРАКТАР — ПА ЛЮБІМАЙ ЕЖЫ

Па смакавых прыхільнасцях можна вызначыць характар чалавека

СЁННЯ гэтак жа лічаць і многія псіхолагі. Нават асобная галіна навукі ўтварылася — псіхакулінарыя. Псіхакулінары арыентуюцца на праверануюю тэорыю — ты ёсць тое, што ты ясі. А паколькі ў кожнага ў ежы існуюць прыхільнасці, то адно і тое ж спалучэнне элементаў уплывае на характар і тэмперамент. У сваю чаргу, людзі падсвядома аддаюць перавагу ежы, якая адпавядае іх асабістым якасцям. І па тым, што чалавек есць, можна вызначыць яго характар. Ці мае ўсё гэта нейкае практычнае значэнне? Вядома, мае! Цяпер даме, для таго каб даведацца ўсё пра свайго абранніка, дастаткова проста запрасіць яго ў кавярню і паглядзець, якія стравы ён сабе замовіць. Такой гурманна-псіхалагічнай сувязі можна не верыць, але праверыць усё ж варта.

Аматар шашлыкоў — сапраўдны мача. «Мясны» мужчына любіць усе віды смажанага мяса: шашлыкі, рабрынкі-грыль, стэйк, шніцаль. Акрамя курыцы — пра яе ніжэй. А таксама вострыя заправы. Паводле меркавання псіхолагаў, гэта муж-здабытчык і муж-пераможца. Ён шчодры, велікадушны і бязмерна запальчывы. Любіць усё прыгожае, а гэта ў яго разуменні — не толькі адсутнасць вечных бігудзей, але і ўсмешка на твары жонкі. Таму пазбягайце незадаволена-песімістычнага тону пры стасунках з ім. Пад гарачую руку, як бы ні хацелася, лепш нічога не высвятляць. Паляўнічыя вельмі запальчывыя, але адходлівыя. Аж да таго, што пасля ўспышкі гневу з іх можна віць вяроўкі.

Мамчыны сынкі ***любяць курыцу*** і не ўяўляюць свайго жыцця без хатняга ачага. Таму, каб пазбегнуць скандалаў, жанчына не павінна супраціўляцца куплі дачнага ўчастка або жаданню завесці чатырохногага сябра. Для хатняга мужчыны — усё гэта вельмі важныя атрыбуты жыцця. А калі чалавек жыве ў «сваім» асяроддзі, падстаў пасварыцца з жонкай значна менш. І, вядома ж, не варта ўспрымаць у штыкі парады свекрыві, паколькі аматары курынага мяса вельмі прывязаныя да сваіх бацькоў. У ідэале варта абавязкова заваяваць прыхільнасць яго мамы.

Піца- і гамбургераед — натура сварлівая і незалежная. А таксама багемная, гэта значыць не церпіць занудства і парадку. Не варта «пілаваць» такога мужа за вечна раскінутыя рэчы. Яго наогул нельга прымушаць. Гэтыя мужы, як правіла, не надаюць значэння вашым каштоўным указанням, а таксама любым умоўнасцям. У тым ліку бытавым. Жонцы такога мужа неабходна часцей чытаць кнігі, вывучаць англійскую і быць сацыяльна-актыўным чалавекам. «Толькі гаспадарлівасць» жанчыны творчага мужчыну не задавальняе, ды і да хатняй гаспадыні ён хутка астыне.

Аматары ***кіслага, марынаванага, перасоленага*** схільныя да тыраніі. Іван Грозны вельмі любіў саленні, кіслае малако, Пётр І абажаў кіслыя прадукты, на стале ў Сталіна заўсёды былі лімоны і кіславатае маладое віно.

Сушы выдаюць канцэнтраванага акуратыста. Паводле меркавання псіхолагаў, мужы, якія любяць любую хоць крыху экзатычную або вытанчаную ежу, вельмі любяць парадак. Таму часта робяць добрую кар'еру. Жонкі ў такіх мужоў павінны быць выключнымі гаспадынямі і часцей — сапраўднымі жанчынамі. Гэта значыць быць у адной асобе і палюбоўніцай, і маці, і сяброўкай, і сястрой. І галоўнае — кожную з гэтых роляў выконваць на 100 %.

Рыбная душа адрозніваецца спакоем і пастаянствам. Вытрыманасць прыносіць павагу калегаў і сяброў. На такіх людзей можна спакойна абаперціся ў сямейным жыцці. Адзіны мінус такога мужчыны ў тым, што жанчыне цяжка дамагчыся ад яго адкрытасці. Гэты муж будзе жыць пад дэвізам «Усё ў сабе!».

Супы падабаюцца даволі замкнёным і панурым мужчынам. Таму разумная жонка павінна такога мужа апекаваць і стала падтрымліваць. Асабліва перад чужымі і сваякамі. Па законах псіхалогіі, прыхільнасць да адной і той жа стравы можа гаварыць пра нейкія ўнутраныя канфлікты чалавека. А супы ў перакладзе на псіхалагічную мову азначаюць пачуццё абароненасці, бо з'яўляюцца атрыбутам цёплага ачага.

Аматар марожанага — вялікі альтруіст, як і аматар крэмаў, малочных кактэйляў, узбітых вяршкоў, смятаны і ёгуртаў. Такі муж заўсёды гатовы на самаахвяраванне. Любоў да крэма-падобных дэсертаў выдае чалавека ўразлівага, з вытанчаным характарам. Калі заклікаць да яго добрага сэрца — ён тут жа растане і аддасць апошнюю кашулю. Таму — ніякай сухасці, дзелавітага тону і заклікаў да цвярозага сэнсу. Інакш ён замкнецца ў сабе і расчаруецца ў сваёй жонцы, з усімі наступнымі вынікамі.

Ласун — здраднік і лаверлас. Аматараў салодкага часцей за ўсё проста недалюбілі ў дзяцінстве. У дарослым жыцці гэты недахоп праяўляецца ўсё ў тым жа паталагічным жаданні ўсім спадабацца. І можа давесці да жадання пайсці налева. Прытым чым часцей, тым лепш. Бо тады ж узнікае ілюзія, што цябе любяць усе. Выйсце — быць з мужам самой пяшчотай заўсёды і ва ўсім. І памятаць банальнасць пра тое, што ласкавае слова падабаецца нават котцы.

Аматары мучнога і ўсякіх пампушак дрэнна іншаму не зробяць. Яны схільныя да разваг, малаініцыятыўныя, але часта мяняюць месца працы. У сям'і рахманыя, крытыку хатніх прапускаюць міма вушэй. Слабанервовыя, пакутуюць ад дэпрэсіі і палавых парушэнняў.

Аматары бульбы — флегматыкі, абібокі, але прадуктыўныя ў працы. Рашэнні прымаюць не адразу, але правільныя, і не сумняваюцца ў іх. Яны ўпартыя ў дасягненні мэты, любяць дзяцей, утульнасць і не супраць пафіласофствацьь, пачытаць сур'ёзныя кнігі, праглядзець навуковыя тэлепраграмы. Жонцы такога мужчыны трэба засвоіць адно важнае правіла — ніколі не падманвайце мужа, ён ненавідзіць хлусню і ніколі не хлусіць сам.

Тыя, ***хто не абыходзіцца падчас яды без цыгарэты і чаркі віна*** і пры гэтым шырока расстаўляе на стале локці, — здаволеныя жыццёвымі выгодамі, высакамерныя. Яны — пестуны лёсу і ўсё ўспрымаюць як належнае. У сям'і ў іх частыя канфлікты. Дзеці, як правіла, пазбаўленыя радасці, цеплыні і адчуваюць сябе няўтульна. Такому мужу не спадабаюцца частыя візіты сваякоў і сяброў.

Ёсць катэгорыя едакоў, якія ***забываюць, навошта селі за стол***. Успомніўшы за бясконцай гутаркай пра ежу, здавольваюцца некалькімі кубачкамі кавы і бутэрбродамі. Гэта мастацкія натуры, якія любяць сябе, але больш за ўсё — сваё захапленне. Мудрая жонка такога мужчыны павінна або захапляцца тым жа, або рабіць выгляд, што захапляецца, або хоць бы з цікавасцю выслухваць усе аповеды каханага пра яго хобі.

Усёедная кагорта мужчын мае разнастайныя інтарэсы і захапленні. Яны працаголікі, ім чужыя зайздрасць і нядобразычлівасць. Жывуць доўга, з хваробамі спраўляюцца лёгка, побач з такім мужам заўсёды камфортна і надзейна.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭУСКАГА

КОНКУРС ГРОСМАЙСТРА

Ён з'яўляецца **аўтарскім-11** міжнароднага гросмайстра Уладзіміра Матуса (Масква) і праводзіцца на яго прызы. У якасці задання № 2 маэстра прапануе сваю новую сярэднюю праблему па шашках-100:



Белыя: 13, 14, 16, 19, 23, 30, 33, 34, 44, 46 (10). **Чорныя**: 7, 17, 22, 24, 31, 32, 35, 36, 45 (9). Выйгрыш.

ПАШКУКАЙЦЕ КАМБІНАЦЫЮ

Конкурс рашэнняў «**Пагода ў доме»-7/8** працягваецца камбінацыяй на 64-клетачнай дошцы:



Белыя: a7, b6, e5, e7, f6, g1, g5 (7). **Чорныя**: a3, a5, d2, d8, e3, f2, h2, h4 (8). Перамога белых.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

ПЕРШЫНСТВО БЕЛАРУСІ

Яно адбылося на рускіх шашках. Першае-другое месцы ў ім падзялілі мінчане Аркадзь Плакхін і Андрэй Валюк, якія набралі па 13 ачкоў. Абодва — міжнародныя гросмайстры, неаднаразовыя чэмпіёны свету. Па 11 ачкоў у актыве майстроў Віталя Аніскі (Слонім), Мікалая Кадзеснікава (Бабруйск) і Сяргея Садоўскага (Гродна). У такім парадку іх расставілі дадатковыя паказчыкі. Усе яны засталіся ў вышэйшай лізе і на наступны год. Юны Аляксей Куніца з Мінска запісаў на свой рахунак 10 ачкоў і выканаў норму для прысвоєння яму звання нацыянальнага майстра спорту.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

«Пагода ў доме»-7 (М. Грушэўскі): **№ 1.** l b8 (d2) f4, b8x. l d8? (c7 l l) a1 (d2)=. l l (d2?) g5, b8x і **№ 2.** l f8, h6, b4 (g5) f8 (c3) c7, h6x. l d8?, bc7 (d6 l l)=. l l (f6?) b4, h6 (c3) c1x.

Мемарыяльні: П. Шклудаў — **№ 13.** 19, 33, 2, 20 (37) 47x і **№ 14.** 31, 10, 7, 4, 4:35:6 (33) 30, 44x; В. Масюліс, П. Шклудаў) — **№ 15.** 14, 44, 2 (39A) 30 (44B) 39, 29 (36) 37 (13) 23x. A(40) 11 (45) 50 (14A1) 383 (20) 29 (25) 24 (36) 37x. A1 (13) 383 (19A2) 29 (36) 37x. A2(18) 28 (36) 37x. B(37) 48 (41) 37, 3x; Г. Андрэеў — **№ 16.** 12, 7, 44-39, 29, 11, 43, 1, 36, 42x і **№ 17.** 41, 42, 3, 11, 39 (34) 39, 34, 34x.

Бліц-54/3 (Д. Камчыцкі): 12, 43, 5, 38, 39, 20, 24x. Магчыма 1. 11-7x — указаў майстар Аляксандр Лясоўскі (Жодзіна).

«ХІМІК» КРАЎ ВЕЛАСІПЕДЫ

У Мінску праваахоўнікі затрымалі зладзюжку, які ўчыняў раніцай крадзяжы веласіпедаў, ідучы да месца папраўчых работ.

Паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, раней судзімы яшхар сталіцы адбываў пакаранне ва ўстанове адкрытага тыпу. І калі-нікалі карыстаўся сваім «прывілеяваным» статусам: калі раніцай з дому ішоў на папраўчыя працы, прыхоплівай чужы веласіпед, прычым крыў пераважна дарагія горныя веласіпеды. Як правіла, ахвяры гэтага «серыйшчыка» захоўвалі веласіпеды ў пад'ездах, незачыненых тамбурах і лесвічных пралётах, чым і карыстаўся злодзей. Паводле папярэдніх звестак, на рахунку крымінальніка 12 веласіпедаў. Пасля крадзяжу хадавы тавар зладзюжка збываў на гандлёвым рынку «Ждановічы» — максімум па 100 долараў ЗША.

Ігар ГРЫШЫН.

Як пры дапамозе ліку тры стварыўся свет

Спачатку Бог стварыў толькі аднаго чалавека — Адама, для існавання якога было абрана самае ідэальнае месца ў свеце — Райскі сад. Здавалася б, жыві чалавек у гэтым бязгрэшным месцы, радуйся прыгажосці навакольля, асэнсоўвай акт Боскага тварэння і разважай над неабходнасцю сваёй запатрабаванасці. Аднак Творца хутка зразумеў, што «адзін у полі не воін», і стварыў (або даў) чалавеку пару. З'яўленне Евы прывяло да сітуацыі ўнутранай дэстабілізацыі, псіхалагічнага напружання, да раздваення думак, пачуццяў і памкненняў Адама. Сімвалам выпрабавання стаў яблык спакусы з Дрэва пазнання. Да нашых дзён Род чалавечы так канчаткова і не вызначыўся: дзякаваць Адаму за тое, што не ўстаяў перад чарамі жаночай прыгажосці і пакаштаваў плод спакусы Д'ябла і Боскага выпрабавання, або, наадварот, зганьбіць і праклясці яго, тым самым вынесці жорсткі прысуд самім сабе, як далёкім нашчадкам той першароднай спакусы і неадольнай прагі да самапазнання.

● Пасля гэтага Богу давялося трэці раз брацца за справу і адправіць першых людзей свету на грэшную зямлю, каб менавіта там яны жылі і множыліся. Так яно і адбылося, але з таго часу людзі чакаюць другога прышэсця Ісуса Хрыста, калі адбудзецца Жахлівы суд над усімі тымі, хто некалі жыў на зямлі.

● Уся гэта біблейская гісторыя мае прататыпны характар, таму што кожны чарговы акт тварэння атрымаў глыбокае сімвалічнае асэнсаванне ў гісторыі культуры чалавецтва. Першае (як самы першы акт тварэння, за якім стаіць уласна боскі пачатак) заўсёды лічыцца лёсавызначальным, фарміруючым і прадвызначальным перспектыву існавання. Першае — гэта штуршок, ад якога, як ад печы танец, пачынаецца новая стадыя развіцця, новы кругазварот прыроднага і сацыяльнага існавання.

● Разуменне сімволікі двойкі як у значнай ступені негатыўнага пачатку, хутчэй за ўсё, абапіраецца якраз на змест біблейскай легенды, у якой паўторны, другі, этап першатварэння звязаны з жанчынай. У сувязі з тым, што жанчына з'явілася на свет другой, то і двойка (дакладней — другі) аказалася ўключанай у ланцужок ценяў, якія супрацьстаяць святлу і нясуць яго адваротны адбітак.

● Ураўнаважыць узаемаспалучэнне або супрацьстаянне двух супрацьлеглых пачаткаў павінна была тройка (трэці). Менавіта яна ўключыла ў сябе энергетыку стабілізацыі, раўнавагі, як бы ўзняўшыся над бытавізацыяй жыццёвай практыкі, тым самым увабраўшы ў сябе моц духоўнага пачатку. Якраз таму тройка і стала ўвасабленнем Боскага пачатку, яго ўніверсальнасці, знітаванасці, непарыўнасці, усеабдымнасці, якая зафіксавана ў трох разнародных, але адзіных па сутнасці іпастасях: Бог Бацька, Бог Сын і Бог Святы Дух. Дзіўна, але і ў гэтай свяшчэннай трыядзе менавіта другі — Бог Сын — быў прынесены ў ахвяру за грахі дзяцей Адама.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

— Адгадайце загадку: чацвёра ў адной канторы, толькі адзін з іх працуе.

— Не ведаю.

— Трое службоўцаў і вентылятар.

☺

Сын з'язджае на лета да бабулі. Тэрмінова куплю яму вувузелу — хай цешча пацешыцца!

☺

Дзве сяброўкі:

— Учора, уяўляеш, вельмі ўдала наехала на бардзюрчык — задно памяняла ўсе чатыры колы...

☺

Сёння я цалкам у разліку са сваім здароўем — зганяў па піва на веласіпедзе.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3112 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12